ЛіМ
Літаратура і мастацтва
газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

14 ЧЭРВЕНЯ 2002г. № 23 – 24/4157 – 4158 КОШТ 300 РУБ.

У СЭРЦЫ СВАЁЙ МОВЫ
Думкі, развагі, крэскі Паўла МІСЬКО
5, 12

ПАКЛОН РОДНАЙ ЗЯМЛІ
Аляксей НЕНАДАВЕЦ — пра кнігу Міхася БАШЛАКОВА "Пяро зязюлі падніму"
6-7

НОВЫЯ ВЕРШЫ
Навума ГАЛЬПЯРОВІЧА, Анатоля ЗЭКАВА, Міколы ШАБОВІЧА
8—9

ПРАКЛЁН
Раздзел з рамана "Зброя для забойцы" Міхася ГЕРЧЫКА
9, 12

ЛАТНІК З АДКРЫТЫМ ЗАБРАЛАМ
Наталля ШАРАНГОВІЧ — пра мастака Віктара АЛЬШЭЎСКАГА
11

Ляўкі — лецішча Янкі Купалы

Ляўкі... Славутае лецішча Янкі Купалы на беразе Дняпра. Зямля, якая помніць крокі вялікага паэта, зямля, дзе нарадзіўся знакаміты Ляўкоўскі цыкл з васемнаццаці вершаў. Бадай, не знойдзеш беларуса, які б не ведаў верш "Хлопчык і лётчык". Менавіта тут летаваў Янка Купала з 1935-га па 1941 год. Тут ён знайшоў адхланне пасля трагічных перыпетый у сваім жыцці. Пра ўсё гэта гаварылася на вялікім паэтычным свяце ў Ляўках, прысвечаным 120-годдзю з дня нараджэння вялікага Песняра.

Са словам пра творчасць Янкі Купалы выступілі старшыня Аршанскага райвыканкама Уладзімір Адашкевіч і намеснік Віцебскага аблвыканкама Пётр Южык.

І гасцінныя гаспадары, і пісьменнікі з Мінска і Віцебска Алесь Пісьмянкоў, Франц Сіўко, Віктар Шніп, Леанід Калодзежны, Анатоль Зэкаў, Давід Сімановіч, Анатоль Канапелька, Эдуард Акулін, намеснік дырэктара купалаўскага музея Лідзія Макарэвіч, вучоны сакратар Алена Бурбоўская гаварылі пра Янку Купалу як пра паэта-прарока, апостала нацыі.

З асаблівым узрушэннем слухалі прысутныя ўспаміны жыхаркі Ляўкоў Веры Якаўлеўны Яфрэмавай, якая ў тыя далёкія для нас дні вяла гаспадарку Івана Дамінікавіча.

Прыемна адзначыць, што на свяце паэзіі было багата моладзі. І гэта глыбока сімвалічна, бо менавіта з ёй, беларускай моладдзю, звязваў паэт свае лепшыя надзеі ў вядомым вершаваным цыкле, напісаным тут, у Ляўках.

Н. К.

Фота С. ЛУК'ЯНАВА

Яна помніць Івана Дамінікавіча

У Ляўкоўскім музеі

Блаславенне ад Янкі Купалы

БУДЗЬМА РАЗАМ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 2002 ГОДА!

Шаноўныя чытачы!

Падпіска на "ЛіМ" на другое паўгоддзе будзе цягнуцца да 20 чэрвеня. Пастарайцеся да гэтага часу схадзіць у любое паштовае аддзяленне, каб пасля не шкадаваць, што засталіся без "ЛіМа". Кошт індывідуальнай падпіскі на адзін месяц — 1 950 рублёў, на тры — 5 850 рублёў, на паўгоддзе — 11 700 рублёў.

Індывідуальны індэкс — 63856.

Кошт ведамаснай падпіскі на адзін месяц — 3 500 рублёў, на тры — 10 500 рублёў, на паўгоддзе — 21 000 рублёў.

Ведамасны індэкс — 63857.

КОЛА ДЗЁН

Нарэшце ў нашай краіны з'явіўся гімн. Словы Міхася Клімковіча і Уладзіміра Карызны, музыка Нестара Сакалоўскага.

Амаль тыдзень аматары футбола маюць магчымасць глядзець футбольныя матчы чэмпіяната свету, які праходзіць у Японіі і Паўднёвай Карэі. На жаль, нашы хлопцы ў гэтых гульнях не ўдзельнічаюць...

ГРОШЫ ТЫДНЯ

Сёлета Нацыянальны банк выпусціць у абарот шэсць памятных манет. Сярод іх — юбілейныя манеты, прысвечаныя 120-годдзю з дня нараджэння класікаў нацыянальнай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама 200-годдзю з дня нараджэння вядомага даследчыка Паўднёвай Амерыкі Ігната Дамейкі.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ТЫДНЯ

У Наваполацку прайшла міжнародная навуковая канферэнцыя "Асветніцтва і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу: да 900-годдзя з дня нараджэння Еўфрасінні Полацкай". Арганізатарамі канферэнцыі былі Полацкі дзяржаўны універсітэт, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. Канферэнцыя дала магчымасць адкрыць новыя старонкі гісторыка-культурных каштоўнасцяў старажытнага Полацка, які нядаўна адзначыў 1140-годдзе з дня свайго заснавання.

ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ ТЫДНЯ

За мінулы месяц агульная сума запазычанасці па нашай краіне па зарплаце зменшылася з 68 млрд. 810.2 млн. да 59 млрд. 215.3 млн. рублёў. Даўгі скараціліся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, за выключэннем Мінскай вобласці і горада Мінска. За май неплацяжы работнікам навукі і навуковага абслугоўвання зменшыліся з 139,7 млн. да 80,7 млн., аховы здароўя — з 114.1 млн. да 75,98 млн., адукацыі — з 85,1 млн. да 17,6 млн., культуры — з 44,1 млн. да 20,2 млн. рублёў. Аднак не ўсюды даўгі зменшыліся. Так, за мінулы месяц з'явіліся даўгі па авіятранспарце, а па лясной гаспадарцы нават узраслі з 23,5 да 35,2 млн. рублёў. І ўсё ж кожны спадзяецца, што за сваю добрасумленную працу атрымае заробак своечасова...

АДНАЎЛЕННЕ ТЫДНЯ

З 1 чэрвеня аднавіліся пастаўкі ў нашу краіну расійскай электраэнергіі, якія былі спынены 1 красавіка. Аднаўленне паставак стала вынікам дасягнутых дамоўленасцяў з кіраўніцтвам РАТ "АЭС Расіі". Плануецца, што ў чэрвені з Расіі ў нашу краіну будзе пастаўлена каля 400 млн. кілават-гадзін энергіі. Дальнейшы аб'ём паставак і кошт электраэнергіі будзе ўзгадняцца.

ПАДВЫШКА ТЫДНЯ

Лета — час адпачынку і вандровак. Мала хто сёння вандруе пехатою. А для тых, хто на аўтамабілі — сюрпрыз. Павышаны кошт на рэалізуемыя праз АЗС нафтапрадукты. Цяпер бензін А-76 каштуе 500 руб. за літр. АІ-92 — 620 руб., А-95 — 705 руб., дызельнае паліва — 490 руб. Як гаворыцца, хочаш катацца, плаці...

ПЛАНЫ ТЫДНЯ

Міністэрства ўнутраных спраў плануе звярнуцца ва ўрад краіны з прапановай вызначыць канчатковы тэрмін дзеяння пашпарта СССР узору 1974 года. На сённяшні дзень каля 70 працэнтаў грамадзян Беларусі ўжо маюць новыя нацыянальныя пашпарты. Існуе меркаванне, што тэрмін дзеяння савецкага пашпарта павінен закончыцца 31 снежня 2003 года, як і ў Расійскай Федэрацыі. А як яно будзе — пакажа час...

РАШЭННЕ ТЫДНЯ

У сувязі са складанай дэмаграфічнай сітуацыяй урадам нашай краіны было прынята рашэнне аб скарачэнні ў новым навучальным годзе колькасці сярэдніх навучальных устаноў. Згодна з Пастановай Савета Міністраў "Аб рацыяналізацыі сеткі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі" падлягаюць закрыццю 57 пачатковых, 42 базавыя і 1 сярэдняя школа. Акрамя таго, 29 сярэдніх школ будуць рэарганізаваны ў базавыя, 19 базавых — у пачатковыя і 4 пачатковыя і базавыя школы — у сярэднія навучальныя ўстановы. Колькасць вучняў у 2001-2002 навучальным годзе ў параўнанні з папярэднім годам скарацілася на 57 тысячы. І далей, відаць, такія ж справы...

СТАТЫСТЫКА ТЫДНЯ

На сённяшні дзень у наркалагічных дыспансерах Мінска знаходзіцца больш як 30 тысяч чалавек, якія пакутуюць ад алкагалізму. Смяротнасць ад гэтай хваробы за апошнія дзесяць гадоў павялічылася ў нашай краіне ў восем разоў і цяпер займае адно з першых месцаў пасля сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў. Нявесела...

ПЕРСПЕКТЫВЫ ТЫДНЯ

У Мінску пачало работу прадстаўніцтва Цэнтра турыстычнай інфармацыі літоўскага горада Паланга. Беларускі партнёр цэнтра — кампанія "Вакол свету", адзіны ў нашай краіне член Дзелавога Савета Сусветнай турысцкай арганізацыі. За апошнія тры гады цэнтрам было прынята і апрацавана больш як 20 тысяч зваротаў і заявак на камерцыйнае партнёрства. Да ўсяго з гэтага месяца адкрыўся новы аўтобусны маршрут з Мінска ў Палангу. Адным словам, сувязі, якія ў свой час былі разарванымі, аднаўляюцца і гэта дае надзею, што і нашу краіну не будуць аб'язджаць міма турысты з Прыбалтыкі...

ПАДАРУНАК ТЫДНЯ

Прыемны падарунак на час летніх канікулаў і адпачынкаў зрабіла хатнім карыстальнікам камуціруемага беспарольнага доступу да сеткі Інтэрнет рэспубліканскае аб'яднанне "Белтэлекам". З 1 чэрвеня па 31 жніўня ўведзены ў дзеянне тарыф "Летні" — у працоўныя дні (з 8 гадзін раніцы да 20 гадзін) звычайны тарыф зніжаны для насельніцтва на 15 працэнтаў. Дарэчы, на сённяшні дзень колькасць абанентаў Інтэрнету перавысіла ўжо 70 тысяч, прычым больш за 50 тысяч з іх — гэта кватэрныя абаненты. Як бачыце, паціху і мы, беларусы, не адстаём ад цывілізацыі...

КОНКУРСЫ

"На цябе наша моладзь, надзея..."

Музей Купалы працягвае цыкл мерапрыемстваў "З Купалам у сэрцы". 31 мая музей наладзіў конкурс малюнка на асфальце пад назвай "Ой ты, маё сонца, як жа свеціш ясна!" сярод дзяцей 6-10 гадовага ўзросту, прымеркаваны да 120-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і да Міжнароднага дня абароны дзяцей.

Песняй "Прывітальнай" сустрэў гасцей фальклорны ансамбль "Мілавіца" Цэнтра пазашкольнай работы Кастрычніцкага раёна г. Мінска (мастацкі кіраўнік Марыя Снітко, акампаніятар — Барыс Яўгенаў). У ганаровае журы конкурсу ўвайшлі: галоўны спецыяліст па культуры Адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска Іна Пяцелька; даверaны ўрач Беларускага дзіцячага фонду Лідзія Літвіновіч; мастакі Аляксей Марачкін; Дзяніс Барсукоў, паэт, акцёр, рэжысёр Сяргей Патаранскі.

Дзеці з задавальненнем удзельнічалі ў конкурсе, а гэта значыць, што было жаданне дакрануцца душой і сэрцам да неўміручай Купалавай паэзіі, невычэрпнай крыніцы натхнення. 162 удзельнікам былі ўручаны эмблемы конкурсу, дзе дзеці пазначылі сваё імя, а таксама камплект каляровай крэйды.

Свае малюнкі маладыя творцы прысвяцілі нашай краіне, роднай мове, гістарычным асобам і падзеям, купалаўскім мясцінам, беларускім пейзажам, героям твораў Янкі Купалы і самому паэту. Журы адабрала 25 адметных малюнкаў. Пераможцам конкурсу былі ўручаны мяккія цацкі, фотаальбомы, нататнікі, каляровыя алоўкі, асадкі, кніжкі і іншыя прызы. Ніхто не застаўся без падарункаў — усе ўдзельнікі атрымалі памятныя сувеніры. Фундатарамі конкурсу выступілі Беларускі дзіцячы фонд, Адміністрацыя Цэнтральнага раёна г. Мінска, Беларускі саюз мастакоў у асобе Аляксея Марачкіна і Міжнародны фонд Янкі Купалы.

Дзіяна Кавалевіч,
старшы навуковы супрацоўнік музея Янкі Купалы
Фота Сяргея ЛУК'ЯНАВА

ПРЭМ'ЕРЫ

І дзецям радасць...

У Нацыянальным тэатры балета Беларусі юнага гледача чакае сюрпрыз. Паводле сюжэта сусветна вядомай казкі братоў Грым створаны балет "Беласнежка і сем гномаў" у пастаноўцы Наталлі Фурман на музыку польскага кампазітара Багдана Паўлоўскага. Лібрэта Наталлі Фурман і Марыны Каралёвай. Музычны кіраўнік і дырыжор спектакля Алег Лясун.

Стваральнікі спектакля трактавалі гэту казку нетрадыцыйна, свядома дапоўніўшы яе сюжэтную лінію і ўвёўшы новых персанажаў. У гэтай дзівоснай гісторыі, расказанай у танцы, ёсць, канечне ж, і чараўніцтва, і перамога дабра над злом.

Маляўнічыя дэкарацыі Л. Сідзельнікавай, касцюмы Ж. Капуснікавай раскрываюць свет казкі ў яго шматстайнасці.

"Беласнежка..." — гэта сямейны спектакль, які будзе цікавы не толькі дзецям, а і іх дарослым бацькам.

Сцяпан БУРАЎКОЎ
Фота В. МАЙСЯЁНКА



У Саюзе беларускіх пісьменнікаў

На чарговым пасяджэнні секцыі паэзіі разглядалася творчасць Алены Якаўлевай, Алены Котавай, Генадзя Говара, Міколы Салаўцова. Для прыёму ў СБП рэкамендаваны Алена Якаўлева, Алена Котава, Генадзь Говар. Па прапанове членаў секцыі творчасць Міколы Салаўцова прапанавана перадаць на разгляд секцыі дзіцячай літаратуры.

●

Штогадовая творчая вечарына паэта і барда Алеся Камоцкага пад назвай «Дом, пабудаваны з дзвярэй», адбылася ў вялікай зале Доме літаратара. Падчас сустрэчы гучалі песні ў выкананні аўтара.

М. Р.

Дзень памяці Янкі Купалы

28 чэрвеня 2002 года спаўняецца 60 гадоў, як трагічна абарвалася жыццё народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Супрацоўнікі Літаратурнага музея Я.Купалы смуткуюць разам з усімі, хто любіць Беларусь, шануе паэта-прарока, філосафа, уладара дум народных.

У гэты дзень а 8 гадзіне ў касцёле святога Роха на Залатой горцы адбудзецца імша, а ў 16 гадзін — ускладанне кветак да надмагільнага помніка песняру на Вайсковых могілках па вуліцы Казлова.

Саюз беларускіх пісьменнікаў і Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы запрашаюць усіх жадаючых прыняць удзел ва ўшанаванні памяці Янкі Купалы, аддаць даніну павагі таленту паэта і грамадзяніна, ускласці кветкі любові, пашаны, надзеі.

ВІНШУЕМ!

"Гэта Сашаў дом..."

Дом, ён жа — Рэспубліканскі каледж пры Беларускай акадэміі музыкі, — гэта людзі. Таленавітыя, захопленыя, свайму дому адданыя. Аднаго з іх тут нядаўна віталі-віншавалі: юбілей. Тады міжволі й падарыў дырэктар каледжа У. Кузьменка назву для сённяшняй нататкі, трапна вызначыўшы творчыя, педагагічныя, дзелавыя, настальгічныя ды сяброўскія стасункі юбіляра з музычным домам на плошчы Свабоды, 7. У гэтай знанай школе для даравітых дзяцей, якая сёння завецца "комплексна": гімназія-каледж, 60-гадовы музыкант і педагог, лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу піяністаў і дыпламант міжнароднага спаборніцтва камерных ансамбляў у Маскве, Аляксандр Мільто калісьці вучыўся. Цяпер працуе. Зрэшты, што значыць — працуе? Творчая прафесія — гэта не служба "на рабочым месцы". Гэта лёс і лад жыцця.

І юбілейная вечарына нічым не нагадвала казённую імпрэзу. Яна прагучала як шчыры і гарманічны твор камернага жанру, прысвечаны духоўна блізкім людзям, сябрам і ўвасоблены разам з імі. Сабраліся розныя пакаленні, паяднаныя на, можна сказаць, містычным узроўні агульным дзяцінствам, агульнымі маральнымі прынцыпамі, агульнымі чалавечымі, эстэтычнымі каштоўнасцямі.

Выступалі музыканты Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі, артыстам якога два дзесяткі гадоў быў і А. Мільто — піяніст, клавесініст, арганіст. Завітаў на вечарыну "Сірынкс", выпеставаны Н. Аўраменкай, — менавіта з флейтыстамі былі звязаны першыя выпрабаванні А. Мільто як піяніста-канцэртмайстра. Фартэпіянны дуэт Настассі Пазняковай ды Ганны Гетманавай — таксама знак творчай біяграфіі юбіляра: ён пасля першай бліскучай перамогі дзяўчат на міжнародным конкурсе напісаў пра іх — для "ЛіМа", з якім ужо даўно супрацоўнічае як няштатны аўтар. А вакальны квартэт юнакоў, якім кіруе маэстра У. Глушакоў, нібы нагадаў, што гадаваўся А. Мільто ў спеўным і артыстычным асяроддзі: бацькі былі харыстамі опернага тэатра.

Сам юбіляр іграў у той вечар на клавесіне, у дуэце з вядомым скрыпачом, прафесарам В. Зяленіным. Дарэчы, разам яны правялі серыю адметных канцэртаў у Зале камернай музыкі, што на Залатой Горцы. Пра папулярныя ў філарманічнай публікі праграмы А. Мільто і В. Зяленіна "ЛіМ" неаднойчы пісаў. Напэўна, з часам з'явіцца працяг тых публікацый, бо дуэт музыкантаў мае ўжо новыя творчыя задумы. Цікава...

С. БЕРАСЦЕНЬ

Савет фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

30 мая 2002 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб зацвярджэнні складу савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва».

У склад Савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва ўвайшлі: рэктар установы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча ўстановы "Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія", народны артыст Беларусі (старшыня савета фонду) **Міхаіл Казінец**, дырэктар — мастацкі кіраўнік дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы "Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр балета Рэспублікі Беларусь", народны артыст СССР (намеснік старшыні савета фонду) **Валянцін Елізар'еў**, першы намеснік Міністра культуры (намеснік старшыні савета фонду) **Уладзімір Рылатка**, дырэктар дзяржаўнай установы "Нацыянальная бібліятэка Беларусі", заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь **Галерыта Алейнік**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу **Наталля Аўдзеева**, мастацкі кіраўнік народнага ансамбля танца "Радасць" Брэсцкага гарадскога Дома культуры, народны артыст Беларусі **Анатолій Вераб'ёў**, дацэнт кафедры кампазіцыі ўстановы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі" **Галіна Гарэлава**, рэктар установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры", заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь **Ядвіга Грыгаровіч**, начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь **Міхаіл Дарашкоў**, старшыня грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз тэатральных дзеячаў", заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь **Аляксей Дудараў**, мастак-жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь **Леанід Дударэнка**, дырэктар — мастацкі кіраўнік дзяржаўнай установы "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі", народны артыст Беларусі **Валянцін Дудкевіч**, старшыня грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз журналістаў" **Леанід Екель**, артыстка — вядучы майстар сцэны дзяржаўнай установы "Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы", народная артыстка Беларусі **Марыя Захарэвіч**, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь **Іван Карэнда**, заслужаны архітэктар Рэспублікі Беларусь **Леанід Левін**, мастацкі кіраўнік дзяржаўнай установы "Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага", народны артыст Беларусі **Барыс Луцэнка**, старшыня грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз кампазітараў", народны артыст СССР **Ігар Лучанок**, галоўны навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, старшыня прэзідыума Рэспубліканскага савета грамадскага аб'яднання "Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры" **Станіслаў Марцэлеў**, першы намеснік міністра інфармацыі **Станіслаў Нічыпаровіч**, народны мастак Беларусі, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі **Георгій Паплаўскі**, галоўны рэдактар рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" **Генадзь Пашкоў**, галоўны рэдактар установы "Рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва" **Аляксандр Пісьмянкоў**, першы намеснік міністраў фінансаў **Анатолій Сверж**, начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай сферы апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь **Алена Сівалобава**, мастацкі кіраўнік — дырэктар дзяржаўнай установы "Заслужаны калектыў Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь", народны артыст Беларусі **Міхаіл Фінберг**, намеснік дырэктара дэпартамента — начальнік упраўлення па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны дэпартамента па аховегісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры **Васілій Чэрнік**, мастацкі кіраўнік Тэатра-студыі кінаакцёра рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм", заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь **Аляксандр Яфрэмаў**.

"Янка Купала і еўрапейскі літаратурны працэс"

4 — 5 ліпеня 2002 г.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міжнародны фонд Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы праводзяць VI Міжнародныя Купалаўскія Чытанні

"Янка Купала і еўрапейскі літаратурны працэс", прысвечаныя 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы

Пасяджэнні адбудуцца ў памяшканні Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы па адрасе: г. Мінск, вул. Я. Купалы, 4

У плане работы канферэнцыі:

4 ліпеня

Пленарнае пасяджэнне.

5ліпеня

Пасяджэнне "круглага стала".

Урачыстая вечарына да 120-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Янкі Купалы ў Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы.

6 ліпеня

Паездка ў філіял музея Янкі Купалы "Вязынка" для ўдзелу ў Рэспубліканскім свяце паэзіі "Купалле".

7 ліпеня

Ускладанне кветак да помніка Янкі Купалы.

Адрас аргкамітэта:
Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы
220030, г. Мінск, вул. Я. Купалы, 4.
тэл. 227-79-43, тэл. 227-78-66, 227-73-54
факс 227-79-43

Для іншагародніх.
(8-017)227-79-43 (па Беларусі)

Калі ёсць патрэба ў замаўленні месца ў гасцініцы, просім тэрмінова паведаміць па факсе (37517) 227-79-43 (з замежжа), або даслаць ліст на адрас: РБ 220030, г. Мінск, вул. Я.Купалы, 4.

АБСЯГІ

БРЭСТЧЫНА...

Феномен Марыі Канапніцкай

Польская пісьменніца, буйнейшы майстар рэалістычнай літаратуры XIX стагоддзя Марыя Канапніцкая з поспехам пісала ліра-эпічныя вершы, паэмы, апавяданні. Яна — аўтар кнігі "Міцкевіч, яго жыццё і душа". Часта наведвала Беларусь, вяла перапіску з Янкам Лучынам. Яе вершы на беларускую мову перакладалі Альгерд Абуховіч, Гальяш Леўчык, Янка Купала, Зоська Верас, Анатоль Вялюгін, Сяргей Дзяргай, прозу — Васіль Каваль і Янка Брыль.

25 мая прыхільнікі таленту Марыі Канапніцкай адзначылі 160-годдзе з дня яе нараджэння. А надоечы ў Брэсцкім дзяржуніверсітэце два дні праходзіла міжнародная навуковая канферэнцыя, удзел у якой узялі вучоныя з Мінска і Гродна, з Украіны (Луцк) і Польшчы (Люблін, Седльце).

Сімвалічна і тое, што на канферэнцыі прагучала некалькі дакладаў пра літаратурныя паралелі Марыі Канапніцкай і Янкі Купалы, у прыватнасці, змястоўным было выступленне прафесара Аляксея Майсейчыка "Янка Купала — перакладчык лірыкі М. Канапніцкай".

У межах канферэнцыі адбыўся пяты па ліку універсітэцкі фестываль паэзіі Марыі Канапніцкай, пераможцы якога ўлетку адправяцца на міжнародны фестываль у Пшэдбожэ-Гуры-Мокрэ.

Неўзабаве выйдзе зборнік матэрыялаў канферэнцыі.

І яшчэ. Загадчык кафедры класічнай і сучаснай замежнай філалогіі Алена Ківака паведаміла, што ўдзельнікі мерапрыемства вырашылі праводзіць аналагічную канферэнцыю раз у пяць гадоў. Асабліва гэта цешыць студэнтаў беларуска-польскага, руска-польскага і руска-украінскага аддзяленняў філфака, у якіх з'явілася добрая магчымасць сказаць сваё слова ў вывучэнні творчай спадчыны Марыі Канапніцкай.

Вікторыя БАРЫСЮК

Мастакі з Баранавіч

У выставачнай зале Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра праходзіць выстава мастакоў Баранавіцкага раёна. Пяць таленавітых майстроў прадставілі свае творы. Работы Андрэя Багданава, Анжэлікі Вакуліч, Юрыя Лешыка і Анатоля Ганчара знаходзяцца ў прыватных калекцыях Ізраіля, Германіі, Расіі, Польшчы, Амерыкі, Італіі, Даніі. А Сяргей Грыгор'еў выстаўляецца ўпершыню.

Творы мастакоў супярэчлівыя па сваім характары, уражваюць эмацыянальна-духоўнай насычанасцю, складанасцю сюжэта.

Андрэй Багданаў жыве ў свеце рыцарскім, міфалагічным. "Саламея", "Помста на Сол Тры", "Моргейн", "Салдат сусвету", "Валькірыя" — назвы работ гавораць самі за сябе. І каларыт твораў строгі, халодны, нясветлы.

Краявіды родных Баранавіч ва ўсёй прыгажосці ў розныя поры года адлюстраваў Анатоль Ганчар. Духоўнасцю і рэальнасцю прасякнуты карціны Юрыя Лешыка "Кава з малаком", "У 100 метрах над зямлёю ў ноч на Івана Купалу", "Ева", "Свет адчуванняў"...

Аксана КЛУНІНА

ГОМЕЛЬШЧЫНА

"Новая зямля" ў Светлагорску

У Светлагорскай карціннай галерэі імя Г. Пранішнікава адбылося адкрыццё выставы народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча. У экспазіцыі прадстаўлены 90 акварэльных ілюстрацый мастака да кнігі Я. Коласа "Новая зямля". Падчас адкрыцця выставы старшыня Беларускага фонду культуры У. Гілеп урачыста прэзентаваў светлагорцам саму кнігу, якая выйшла толькі некалькі месяцаў таму дзякуючы ініцыятыве і намаганням БФК. Наведвальнікі выставы, якая будзе доўжыцца да канца чэрвеня, маюць магчымасць набыць гэта выданне паэмы Я. Коласа ў карціннай галерэі.

Н. Ш.

ГРОДЗЕНШЧЫНА

Чалавек Сусвету

Беларусь разам з сусветнай грамадскасцю адзначае ў ліпені 200-годдзе Ігнація Дамейкі — педагога і навукоўца. ЮНЕСКА ўключыла гэты юбілей ва ўласны каляндар памятных дат.

Лёс Дамейкі, які нарадзіўся ў Карэліцкім раёне, што на Гродзеншчыне, быў цесна звязаны з Літвой, Польшчай, Францыяй. А ў Чылі ён абвешчаны нацыянальным героем. Імем Дамейкі там названы універсітэт, нацыянальная бібліятэка.

З нагоды памятнай даты ў Мінску мяркуецца правесці міжнародную канферэнцыю.

Яўген ЛАПЦЕЎ

МІНШЧЫНА...

Волаты беларускай паэзіі

Слуцкая гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма распрацавала праграму мерапрыемстваў, прысвечаных юбілеям Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Ва ўсіх структурных падраздзяленнях сістэмы арганізаваны кніжныя выставы "Беларускай паэзіі волат", "Песняры народных дум", "Палымяныя вяшчальнікі свабоды". Створана тэматычная картатэка "Новае ў перыёдыцы (да юбілеяў пісьменнікаў)". Праходзяць літаратурныя віктарыны, вусныя часопісы, літаратурна-музычныя вечары. Маладыя паэты Случчыны прымалі ўдзел у конкурсе "Нас слова Купалы да творчасці кліча".

Святочна праходзіў літаратурна-музычны вечар "Купалы воблік непаўторны..." у цэнтральнай гарадской бібліятэцы. На сустрэчу былі запрошаны вучні старэйшых класаў школ горада. Ішла гаворка пра жыццё і творчасць Купалы, гучалі песні на ягоныя вершы. Увазе прысутных была прадстаўлена выстава кніг "Увесь сусвет табе, мой родны кут".

А. ПІСАРЫК

Памяці Міколы Улашчыка

На здымку: На сядзібе Музея выяўленчага мастацтва (фонд Анатоля Белага) у Старых Дарогах з'явіўся чарговы помнік (восьмы па ліку) — беларускаму гісторыку Міколу Улашчыку. Тры гады гэты памятны знак праляжаў без справы ў Дзяржынску, на радзіме Улашчыка — А. Белы меркаваў устанавіць яго ля мясцовай бібліятэкі, але не знайшоў згоды ў тамтэйшага кіраўніцтва. Помнік уяўляе сабой рэльефную выяву, умацаваную на унікальным трохмятровым па вышыні камяні рэдкай пароды ружовага фінскага граніту. Лёс наканаваў Улашчыку, які сябраваў з паэткай Ларысай Геніюш, зноў сустрэцца на музейнай сядзібе. Два гэтыя помнікі — першыя на Беларусі, устаноўленыя ў гонар палітвязняў.

Н. К.

Каб слова вольнае пачуць

Са сваімі шматлікімі чытачамі-землякамі сустрэўся народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін. У Лепелі, Бешанковічах, Віцебскай абласной бібліятэцы перад інтэлігенцыяй і моладдзю паэт чытаў свае вершы і пераклады твораў Шэкспіра, Лоркі, іншых класікаў сусветнай літаратуры. Рыгор Іванавіч выказаў упэўненасць, што беларуская мова будзе жыць, бо вырасла пакаленне, якое лічыць яе найвялікшай духоўнай каштоўнасцю. Разам з Барадуліным у сустрэчы браў удзел бард Алесь Камоцкі.

Арганізавала мерапрыемства абласная рада Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Менавіта гэтая грамадская арганізацыя правяла на Віцебшчыне і сустрэчы з лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы Генадзем Бураўкіным.

Святлана ГУК
г. Віцебск

Чалавек і свет

Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. Машэрава пры дапамозе міжнароднага фонду "Рэнавабіс" правёў міжнародны навуковы семінар "Чалавек у акаляючым свеце: філасофскія, культуралагічныя і тэалагічныя аспекты". Семінар аб'яднаў навукоўцаў самых розных ВНУ: філосафаў, біёлагаў, псіхолагаў, філолагаў і прадстаўнікоў дзвюх хрысціянскіх канфесій — каталіцтва і праваслаўя. Як заўважыў доктар багаслоўя ксёндз і прафесар Анджэй Шэўціў, гэта першы семінар, які заклаў пачатак плённай работы на перспектыву.

Святлана ГУК
г. Віцебск

Роднаму слову вучыцца

Упраўленне адукацыі Віцебскага аблвыканкама разам з Інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў адукацыі падвяло вынікі абласнога конкурсу "Лепшы рупліўца роднага слова". У ім удзельнічала звыш за 200 чалавек. Сабраны багаты матэрыял па беларускамоўным навучанні. Пераможцы атрымалі ў падарунак кнігі, слоўнікі, а таксама падпіску на абласную газету "Народнае слова".

Святлана ГУК
г. Віцебск

ВЫСТАВЫ

Мастак з легенды

Сімвалічна, што выставай твораў Уладзіміра Зінкевіча пачала свой юбілейны, 10-ы год Светлагорская карцінная галерэя "Традыцыя" імя Германа Пранішнікава. У. Зінкевіч напачатку лета 1996 года ўпершыню парадаваў землякоў знаёмствам са сваёй творчасцю, а пасля паспрыяў таму, каб у нашай галерэі адбыліся персанальныя выставы знакамітых беларускіх мастакоў Г. Вашчанкі, Л. Шчамялёва, В. Шаранговіча, А. Бараноўскага, В. Альшэўскага, В. Славука, У. Вішнеўскага, Ф. Янушкевіча, У. Басалыгі і іншых.

Для многіх з нас тады сам Зінкевіч быў мастаком з легенды. Так-так, даводзілася і мне не раз чуць пра тое, што некалі жыў у Светлагорску хлапчук, які марыў стаць славутым мастаком. Ён наведваў гурток выяўленчага мастацтва і ўжо тады вызначаўся дзёрзкай упэўненасцю, што яму шмат дадзена таленту. Але колькі было, ёсць і будзе такіх хлапчукоў. Ці мала іх згубіла свае куды больш сціплыя мары на вірлівых дарогах жыцця... Тым не менш хлопчык здзейсніў сваю мару, скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, быў прыняты ў прафесійны саюз майстроў выяўленчага мастацтва, яго творы ёсць нават у Траццякоўскай галерэі.

Прасякнутыя рамантычнай узнёсласцю, карціны У. Зінкевіча сёння ўпэўнена займаюць сваё месца на самых прэстыжных выставах. Больш таго, гэты мастак стаў выкладчыкам у інстытуце, які закончыў (цяпер Беларуская акадэмія мастацтваў), быў прызначаны загадчыкам кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

Больш за пяць гадоў таму адбылося першае знаёмства з творамі нашага земляка. Цікава, што сувязь паміж мастакоўскімі карцінамі і гледачом усталёўваецца не толькі на ўзроўні візуальнага ўспрымання, а дзякуючы падсвядомай духоўнасці. Здольнасць да абагульнення выяўлялася ў яго творах гэтак таленавіта з такой сілай і ўзнёсласцю, што хацелася верыць у магічнасць мастацтва. Многія карціны нібыта працягвалі стварацца на нашых вачах нанова...

І вось 15 новых твораў. Адразу ж бачна, што мастак захаваў вернасць самому сабе, а майстэрства яго стала яшчэ больш чарадзейным. Іншы раз проста не верыцца, што акрылавыя фарбы тояць у сабе такія прасветленыя, каларытныя магчымасці. Імгненнасць, рухомасць, фрагментарнасць і ў той жа час непарушная цэласнасць магічнага рэалізму не можа не выклікаць захаплення. Канкрэтнай тэматыкі ў яго новых карцін няма. Усё тая ж казачная ірэальнасць, пачуццёвасць уяўлення, паэзія бессюжэтнасці, пяшчота псіхалагічнага магнетызму.

Стаю перад карцінай "Дзень выпадковых сустрэч", углядаюся ў знаёмыя рысы кранальна прыгожай жанчыны, у якой адразу ж пазнаю жонку мастака Валянціну Сідараву. І прыгадваю аповед Зінкевіча пра іх нядаўняе сумеснае знаходжанне ў Парыжы. Вось так Валянціна карміла там птушак з далоні. Блакітнаваты асмужана-паветраны фон карціны надае ёй яшчэ большую рамантычнасць. А колькі дабрыні ў гэтай працягнутай птушкам далоні...

Дарэчы, рукі Зінкевіч піша з асаблівай псіхалагічнай дакладнасцю і маляўнічасцю. Вось яны трапятліва закрываюць вочы (карціна "Ранішняе святло"), вось нібыта выратоўваюць, засланяючы ад нейкай навалы ("Анёл"), вось абяссілена звісаюць у палёце ("Прысвячэнне Леапольду Стафу"), вось яны працягнуты, нібы просяць выратавання ("Маленне").

Мастак уключыў у новую экспазіцыю таксама два нацюрморты. Але для напісання іх абраў нешта зусім не класічнае. Так, гэта творы з задуманага і ажыццёўленага ім цыкла "Старыя рэчы". Мы бачым нейкае рыззё, кавалкі старых вяровак, даўно сапсаваны, пагнуты чайнік, рэшткі нейкіх непатрэбных рэчаў... Але напісана гэта з пераканаўчым майстэрствам. Спыняюць увагу гледачоў і партрэты. Мастак выразны там, дзе імкнецца засяродзіцца на псіхалагічнай узрушанасці сваіх герояў ("Позірк", "Сустрэча"). Апошні з названых твораў — класічны прыклад двайнога партрэта. Уладзіміра Зінкевіча заўжды вабілі пейзажы — няпэўнасць стану прыроды, менавіта тых імгненняў, калі вечар пераходзіць у ноч, а ноч — у раніцу. Пра гэта зноў і зноў думаеш ля пейзажных твораў "Вячэрняе святло", "Першы снег", "Святло ў лесе". Асобна згадаю карціну "Патаемная цішыня". Мастак здолеў перадаць нібыта пачутую і намі зімовую цішыню паветра, ракі, аддаленага лесу...

І ці трэба гаварыць, што Уладзімір Зінкевіч пачуў на ўрачыстым адкрыцці сваёй выставы шмат захапляльных, удзячных слоў ад шматлікіх прыхільнікаў яго таленту, ад сябра Уладзіміра Савіча, ад намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра Патупчыка, ад першага намесніка старшыні Светлагорскага гарвыканкама Яўгена Ждановіча і іншых. Святочнасці настрою спрыялі скрыпічныя творы ў выкананні выкладчыцы мясцовай музычнай школы Алы Марцьянавай.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ

ВАРУНКІ

Прымі квіточак, Дынька!

Неяк, бадай у двухгадовай даўнасці размове, вядомая і дастаткова "прадзвінутая" крытыкеса Г. К., прагаварылася фразай, якая мне цяпер не раз успамінаецца. "Не ведаю, — сказала яна, — з якога кубла вылятаюць гэтыя новай генерацыі асобныя літпачварыкі, але таго-сяго з іх я больш за ўсіх засцерагаюся. Зачэпіш — не абярэшся"...

І ўспомніў я нядаўна, наіўны, як, працуючы ў "Крыніцы" ў аддзеле сучаснай беларускай прозы, змушаны быў неяк рэдагаваць стос аповедаў невядомага мне А. Дынькі (сябе ён заве Дынько́, з націскам на о). Меў я і неасцярожнасць яшчэ і падкрэсліць там-сям яго практыкаванні. Ніводнае з іх у часопісе не з'явілася — урэшце ўсё вырашалася калегіяльна. Той нязначны эпізод я запамятаваў. Але, пэўна, не запамятаваў А. Дынька. Тым больш не запамятаваў, калі невядома кім і як быў прызначаны рэдактарам "Нашай Нівы".

Апошнім часам на старонках гэтай газеты і ў звязцы з часопісам "ARCHE" (Скарына) маёй сціплай асобе пачалі надаваць празмерную ўвагу і шукаць, як кажуць, "слабыя месцы". Звычайна я ніколі не зважаю на няхай сабе і несправядлівую крытыку, цалкам пагаджаючыся з апошнім "нобелем" В. С. Найполам: "Для пісьменніка важна, каб яго творчасць правакавала некаторую варожасць. Калі пісьменнік не выклікае варожых адносінаў да сябе, ён мёртвы". Але характар публікацый часам бывае надакучлівым, і, што насцярожвае — хамскім, якое збіваецца на "дробныя паскудствы". Не разумею я, напрыклад, чым "не ўгадзіў" сп. Дыньцы і бронзавы прызёр зімовай Алімпіяды па фрыстайле А. Грышын, да здымка якога на 1-й паласе ("НН" ад 22 лютага 2002 г.) А. Дынька прыляпіў гучнае і хамскі-абразлівае слова "халяўшчык".

Але ж — пра свае стасункі.

13 жніўня 2001 г. на старонках "Нашай Нівы" з'явілася рэцэнзія на мой зборнік прозы "Любіць ноч — права пацукоў" ("Мастацкая літаратура", 2002 г.), падпісаная псеўданімам Кастусь Травень. Там усё — і па-хамску сканструяваны загаловак, і тэкст, зроблены з жаданнем нанесці сабачы ўкус. (Сабачая тэма ў "НН" — адна з прывілеяваных...) Дый рэцэнзавалася чамусьці не кніжка, а адзін, выхаплены з кантэксту аповед. Аўтар гэтай "пстрычкі" хаваўся і дасюль хаваецца за псеўданімам Травень, баючыся, пэўна, небеспадстаўна, за цнатлівасць уласнай пысы. (Падазраю, што гэта сам рэдактар А. Дынька, але ж гэта толькі маё падазрэнне...) Дык вось, гэты "літцецярук" не інакш выконваючы "заданне", раз-пораз істэрычна балбоча пра маю сціплую творчасць на старонках газеты, павучаючы, як трэба пісаць на яго погляд, "чарнушніку" Юры Станкевічу. І зусім невыпадкова, што да яго далучыліся, нібы "адазваныя з запасу", занафталінены" літхам Д. Жукоўскі з Гародні, а таксама П. Абрамовіч і Г. Туровіч. Асабіста я зусім не ў крыўдзе на Абрамовіча і Туровіча (іх рэцэнзіі, апублікаваныя ў "ARCHE" за № 4 2001 г., хаця і абвінавачваюць мяне ледзь не ў расізме, гомафобіі і г. д., пазбаўлены хамства. Тым не менш гэтыя "выраслыя на перніках" (па трапным выразе Астаф'ева) крытыкі даволі па-самаедску папракаюць мяне: чаму Юры Станкевіч не аптыміст, як яны, і не дае рэцэптаў як "змагацца з ліхам"? Не падабаюцца ім мае перасцярогі наконт нашай будучыні: лепш жа пісаць пра тое, як... "неверагодна расквітнее наша Беларусь і да яе будуць прыязджаць з удзячнасцю з іншых дзяржаў" і таму падобную лухту. Хочаце ад пісьменства "літаратурнага макдональдства?" Я ж не даю рэцэптаў, бо не філосаф і не палітолаг. Дый хіба ў гэтым задача і сэнс літаратуры? Невядома яшчэ ўвогуле, што для нас — Ліха? Можа, гэта прышэсце не толькі "чужынцаў", а і такіх як вы, сп. Дынька? Варта ўспомніць Пазаліні (..."за вашымі перадавымі намерамі бачу зласлівыя тварыкі гаспадаркоў"...) і г. д. Асабіста для мяне не сакрэт, што за вамі нехта стаіць і дае накірунак улюбёнаму вамі "сабачаму" руху.


Ф. РП-1
Министерство связи Республики Беларусь
АБОНЕМЕНТ на газету / журнал 63125
Наша ніва
(наименование издания)
на 2002 год по месяцам:
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Кому Станкевич
(фамилия, имя, отчество)
Куда пер. Московский д 18
(адрес)
ДС 4/11
20.03.2002

Але ж цікава, што вы асабіста, сп. Дынька, лічыце, так бы мовіць, эталонам літаратурнага пісьменства? Адзін такі, за подпісам Кастусь Травень, з'явіўся ўрэшце ў "НН" ад 26 лістапада 2001 г. Як? — падумалася, — сам Травень? Вялікі выкрывальнік? Настаўнік і літПравадыр?

І вось чытаю. Але, але... Аповед носіць гучную і прэтэнцыёзную назву "Дамінанта". Прымітыўны, убогі тэкст нясе нават нейкую сюжэтнасць: "прысадзісты, у файных чорных портках, у бліскучых модных пантофлях і адпрасаванай цёмна-блакітнай кашулі" сталага веку дэмакрат "трымаючы пад пахай стос патрыятычных газэт і, разгарнуўшы "Пагоню", едзе ў тралейбусе да "прыпынку "Вуліца Веры Харужай".Тут да "тутэйшага" "пад'ехаў" "каржакаваты загарэлы здаравячок гадоў пад пяцьдзесят", якога аўтар далей называе "саўком".

На "абмежаванай жыццёвай прасторы тралейбуса" гэтыя двое, нібы бабы на базары, пачынаюць сварку з-за... мовы. Галоўны герой, перамогшы ўрэшце горлам "саўка", сыходзіць на прыпынку, "упэўнены, ветлівы і прыгожы"... Далей зноў ідзе пасаж пра бліскучыя пантофлі, файныя чорныя порткі і г. д. "І прыгожыя менскія жанчыны прыпынялі свой позірк на памяркоўным (?!) мужчыну, што нетаропка крочыў па вуліцы ў *напрамку Камароўкі* (падкрэслена мною. — **Ю. С.**), несучы з сабою адратаваную дамінанту жыцця". Гэта, так бы мовіць, канцоўка. Шлях дэмакрата вызначаны: базар. Камароўка. Гэта "прыкол", анекдот? — спытаеце. Не, гэта "эталонныя" творы "Нашай Нівы". Вучыцеся, народы і дзяржавы! Піша К. Травень!

Днямі, праходзячы з паэтам Л. Галубовічам ля рэдакцыі "НН", я прапанаваў таму на заклад: ці надрукуюць у "перадавой" "газэце" пад кіраўніцтвам А. Дынькі мой аповед? "Так", — сцвярджаў наіўны паэт. "Ні ў якім разе", — аспрэчыў я.

Мы зайшлі да рэдактара і мелі з ім гутарку. Там я са здзіўленнем даведаўся, што ў "НН" аўтары з Оршы, Гомеля даслалі на мяне станоўчыя рэцэнзіі, але друкаваць іх Дынька не намераны, бо "яны вялікія па памерах" (?!).

Далей усё выйшла, як я і меркаваў. Аповед быў адхілены са зласлівай радасцю. "Вашае апавяданне нам ідэйна і настраёва чужое", — паведамілі мне праз "газэту". Вось дык дэмакраты, ха-ха... Нават класік Стэфан Цвейг мне тут успомніўся: "Няма найбольшай асалоды для хама, як укалоць таго, хто яго разгадаў"... і г. д.

Думаецца, што ўвогуле цікавая і "прадзвінутая" газета "Наша Ніва" выбера сабе крыху іншы напрамак, чым... "Камароўка", да якога вядзе яе (цытую "ЛіМ") "...здольны рабіць дробныя паскудствы" А. Дынька) і тыя, хто за ім стаяць. Усё-ткі традыцыі былых рэдактараў: Я. Купалы, А. Уласава, А. Луцкевіча, абавязваюць. Не "сабачы брэх" і чытанкі пра "педыкаў" патрэбныя зараз моладзі. І не кампілятары што спрытна гуляюць на модных тэмах і сюжэтах.

Таму я і адмаўляюся ад падпіскі, пакуль рэдактарам у газеце сп. А. Дынька.

*ps: на прагучаўшай 9 чэрвеня па "Радыё Свабода" дыскусіі аб праблемах будучыні Беларусі з удзелам В. Быкава, А. Лукашука, а таксама А. Дынькі (на апошняе здзіўляюся выбару "Свабоды" —**Ю. С.**), наш аптыміст зноў заспяваў пра кісельныя берагі і малочныя рэкі, што чакаюць краіну, але быў з мудрым сарказмам абвергнуты толькі адной фразай: "Можа здарыцца так, — сказаў яму Васіль Уладзіміравіч, — што праз некалькі гадоў тэма Беларусі ў свеце будзе зачынена".*

Юры СТАНКЕВІЧ

У сэрцы сваёй мовы

ДУМКІ, РАЗВАГІ, КРЭСКІ

Павел МІСЬКО

...Ківаецца маятнік у старасвецкіх ходзіках: "Ці так? Ці так? Ці так?" Нібы дапытваецца ў цябе (і ў часу) — ці так усё дзеецца на свеце? Ці так ты жыў і жывеш? Жыццё пражыў, а песню так і не паспеў спець (ці дапець)...

Георгій Жукаў, сусветна вядомы палкаводзец, шматразовы Герой Савецкага Саюза, колісь у сваіх успамінах уздыхаў: "Які малы прамежак часу паміж тым, калі гавораць, што яшчэ малады, і тым, калі ўжо занадта стары!", — нібы пацвердзіў яшчэ раз і тое, што і Андрэй Платонаў пісаў: "Жыццё ёсць упускаемыя і ўпушчаныя магчымасці".

Такая думка наведвае — і не раз! — кожнага дзейснага чалавека, калі ён аглядваецца на пройдзены жыццёвы шлях.

Пішаш, пражываеш чужыя жыцці, хай сабе ў многім і ўяўна-сінтэзаваныя, і адчуваеш, як і з цябе самога, бы ў пясочным гадзінніку, высыпаецца ўласнае жыццё — па хвілінах, па гадзінах, па днях, па гадах... Пясочны гадзіннік можна пераварочваць бясконца, — хай перасыпаецца, як з пустога ў парожняе, хай доўжыцца час. А сваіх гадоў назад не вернеш, як ні перасыпай іх, як ні перамацвай у памяці кожную пясчынку — гадзіну, дзень, год. Нічога не перайначыш, не зменіш. Свой жыццёвы раман пішацца адразу — з памаркамі, крамзолінамі, а то і кляксамі.

Праўда, некаторыя спрабуюць у "мумуарах" падчышчаць, сачыняць, што, маўляў, некалі было вось гэтак, а не так, што хацеў ён сказаць тое і тое, а не так, як пайшло пасля цэнзуры. Калі ж сам не паспеў падхарашыць сябе, часам спрабуюць гэта зрабіць бліжэйшыя, яшчэ жывыя, сваякі — жонкі, сыны, дочкі.

Марная справа...

А. С. Пушкін свае мемуары знішчыў, бо — "не хлусіць — можна; быць шчырым — немагчымасць фізічная. Пяро часам спыніцца, як з разбегу перад прорваю..."

●

Багаты турэмны фальклор перадаецца з пакалення ў пакаленне, ад вязня да вязня. Крымінальнікі-заўзятары, рэцыдывісты, старажылы рэжымных устаноў умеюць не толькі "ботаць па фені" (размаўляць на турэмным жаргоне), расказваць турэмныя байкі, дэкламаваць вершы турэмных паэтаў, наколваць на целе ўсялякія малюнкі. Праглядваю іх слоўнік і ў вочы кідаецца: "пісацель — злодзей, які зрэзвае дамскія сумачкі". Што за асацыяцыя нарадзілася ў словатворцы? Няўжо ён "адштурхнуўся" ад жыццёвага факта, які сапраўды меў колісь месца? Няўжо быў час, што нават да такога пісьменнікаў давялі? Іншая справа — слесар: той, хто працуе адмычкамі; цямніла — злачынец, што выдае сябе за сумленнага чалавека; ціхаход — злодзей-адзіночка, які "працуе" вельмі асцярожна; крот — той, хто крадзе праз падкопы і г. д. У гэтых слоўцах сапраўды сэнс праглядваецца.

Але каб **пісацель?!**

●

Караль Вайтыла, былы драматург, паэт, а цяпер папа рымскі, пісаў у маладосці:

Народ, які жыве ў сэрцы сваёй мовы,
Застаецца на працягу пакаленняў
Таямніцай мыслі,
Не ўбачанай да канца.

Думкі, думкі... Жылі ж да нядаўняга часу, а мо і цяпер ёсць народы (ці лепш сказаць — плямёны), якія не сутыкаліся ні з якою цывілізацыяй. Мова іхняя нікому невядомая, ні на якую непадобная, не ўваходзіць ні ў якую групу моў. Гэтае інкогніта і ратавала абарыгенаў ад асіміляцыі, размывання, знішчэння.

Тыя ж цыганы, вельмі даўнія бежанцы з Індыі, рассяліліся па многіх краінах свету. Стагоддзі прайшлі, безліч пакаленняў змянілася. Цыганы паспяхова авалодваюць мовай той краіны, дзе пражываюць. Але сваіх звычаяў, сваёй мовы, для іх святой, не забываюць. Я ведаю факты, калі беларускі выходзяць замуж за цыганоў. Хоцькі-няхоцькі засвойваюць цыганскую мову, звычаі, адзяваюцца, як цыганкі, разам з імі старцуюць па хатах. А калі што ў размове з імі — "О-о, нам, цыганам, гэтага няможна".

Мы ўжо ў іх як суседзі. І паспрабуй пранікні ў таямніцу іх мыслі, мовы, калі яны тут жа хаваюцца за яе, як за абарончы шчыт. А ты стой і лыпай вачыма: пра што яны? Мо згаворваюцца, як лаўчэй цябе аблапошыць?

Нашаму б народу такой жа адданасці роднай мове. Жывучы "ў сэрцы сваёй мовы" (ніхто не забараняе ведаць іншыя!), можна было б сягнуць у небывалыя вышыні духоўнага ўзлёту.

А наша Манька ці адорвыш Ванька, пааціраўшыся ў горадзе месяц-другі, пачынае ўжо заікацца па-руску. Іх жахлівы валапюк карэжыць слых да болю. Горш за тое, такая новаспечаная гараджанка-мамка і на дзіця тупае нагою, калі яно, пабыўшы ў бабулі ў вёсцы, пачынае гаварыць "па-дзеравенску".

Папрок і пішучай "браціі". Усё яшчэ некаторыя мусоляць выраз "матчына мова", "не забывайце матчынай мовы". А лепш было б пісаць: не засвойвайце гэтай тарабаршчыны, вучыцеся беларускай мове!

●

Нікала Дэпрэа Буало:

Вы слоў замежных пазбягайце,
як заразы,
Ладком майструйце ясныя
і правільныя сказы.

Здзіўляе мяне моўная глухата некаторых нашых празаікаў. Замест таго, каб сур'ёзна працаваць з мовай, папаўняць свой слоўны запас з глыбінных народных скарбніц-сховішчаў, хапаюцца за выпадкова пачутае слова і — хоць не да месца яно, тырчыць, з тону-ладу пісьма выбіваецца, убіваюць яго сілком у сказ ці прывязваюць, як цацку.

Раней мяне выводзілі з раўнавагі бясконцыя — распавядаць, распавяду, распавясці (украінізмы), варункі, стасункі (паланізмы), а цяпер слова ейны, ейная. Як быццам па духу нашанскае, але... Ну дзе так кажуць? А слоўца пайшло гуляць ад пісьменніка да пісьменніка, са старонак на старонкі — аж млосна робіцца.

Успамінаецца анекдот. Спраўляюць сярэбранае вяселле. Слова ўзяў муж-гаспадар: "З маейнаю Мар'яй Іванаўнай я пражыў трыццаць гадоў..." Госць-сусед тузае яго за пінжак, шэпча: "Правільна гаварыць — "з маёю!" У адказ гаспадар шэпча: "А з тваёю Аленаю я пражыў дзесяць гадоў. А ты і не ведаў?"

Некалькі гадоў назад гродзенскі бард Шалькевіч, ён жа артыст, сатварыў шлягер, з якім мо і сёння гастралюе, выступае. Галасок так сабе... Ну а словы? У якасці прыпеву абдрэхваў беларусаў — "Жлобская нацыя! Жлобская нацыя!" (хоць сам, здаецца, беларус). Юныя слухачы і слухачкі ажно ў ладкі пляскалі пад гэтую мелодыю, хісталіся ў бакі, гатовыя былі нават у скокі пусціцца. Ці разумелі яны сэнс гэтага слова-абразы? Не разумеў, мабыць, і сам бард. Як не ўспомніць тут "Вяселле ў Малінаўцы", дзе вядомы Папандопула таксама любіў ужываць прыгожыя замежныя словы. А што яны значаць? "Чёрт их знает, зато красивые!"

Я перапароў усе слоўнікі ў сваёй бібліятэцы: беларускія, рускія, украінскія, польскія, заглянуў у Даля... Няма слова жлоб ці жлобскі. У той жа час чуў у нейкім тэлефільме з рускіх вуснаў; "У-у, жлоб, маць тваю..."

●

Зноў з зэкаўскага фальклору: "Жыццё — гэта чарга па смерць, але ёсць такія дзівакі, што пралазяць без чаргі".

Наўрад ці сачыніцель такой "мудроты" чуў пра Заратуштру, тым больш яго выслоўі. Але раптам — дзіўная пераклічка!

"Многія паміраюць занадта позна, а некаторыя — занадта рана. Пакуль яшчэ здаецца дзіўнай запаведзь: "Памры ў свой час" — так сказаў Заратуштра.

Ніхто не адважваецца (ці не можа?) вызначыць, прыйшоў ужо ці не гэты самы "свой час". Асабліва цяжка гэта ўсвядоміць геніям і геніям у двукоссі. У большасці выпадкаў іх так аблашчылі пры жыцці, так кружацца ў іх галовы ад дыфірамбаў, пашанот, узнагарод, што яны і так лічаць сябе жыхарамі неба, і паміраць не трэба.

●

Янка Брыль пісаў: "...Якая цярплівасць у добрых, але сціплых кніг, як яны ўмеюць чакаць чытача, які не ўмее іх заўважаць".

У сваю бытнасць у Гродне я ведаў "інтэлігента", скупога рыцара, які на ўсіх кніжных шафах, паліцах-стэлажах прыладкаваў замкі — і ўнутраныя, і вісячыя, каб — не дай Бог! — хто-небудзь без спросу пакарыстаўся кнігаю. Гэта адносілася і да сваіх, дамашніх, родненькіх.

Калі, калі, чаго дачакаюцца кнігі, пасаджаныя ў турму?

●

У "вельмі навуковых" артыкулах загучала слоўка-тэрмін — неантрап. На поўным сур'ёзе абмяркоўваецца — які ён? Ці такога чакалі, спарадзіўшы-выхаваўшы? Канешне ж, гэта не "новы рускі" ці "новы беларус". Дык хто ж ён, хто? Які?! Мо рысы яго засяродзіліся не ў аднаго-двух гомо сапіенс, а рассыпаны ў тысячах, мільёнах асобін? І ці адпавядаюць яны рэаліям XXI і далейшых стагоддзяў, прагрэсу чалавечай цывілізацыі?

Неантрап — ты хто? І ты... які?
Ты ж не мутант, я спадзяюся?
Ты нараджаўся і ў мінулыя вякі,
Чаму ж сягонняшняга я так баюся?

●

Калі пакараў цябе Бог талентам — трывай, нясі свой крыж на сваю Галгофу, яна і ёсць для цябе — Парнас. Вусныя, а тым больш пісьмовыя скаргі на своё лёс наўрад ці ўвойдуць у збор твораў.

●

Вісліцкі статут XV стагоддзя. Вынятка:

"Коли шляхтичъ шляхтичу лаетъ до матери, ачъ того не отзоветъ, а любо не доконаетъ, што говорилъ, имееть платить за соромоту, какъ за голову, 6- копъ грошей" (арт. 85).

Вось так! Нашы продкі пяць стагоддзяў назад былі больш разумныя і абачлівыя ў захаванні маральных нормаў! За адзін "мацюк" — і такое пакаранне!

А цяпер... Памятаю, як абураўся ў сталічнай газеце наш рускамоўны празаік Іван Панчанка, што нейкія выдавецкія дзялкі (грошы не пахнуць!) надрукавалі "Слоўнік рускага мата", і кніга свабодна прадавалася, адукоўвала і "натхняла" цёмныя масы.

Д'яблава семя сеялася і сеецца па ўсёй постсавецкай прасторы, а мо і за мяжою, бесперашкодна, распаўзаецца звыродлівай эпідэміяй. Прыслухайцеся, як размаўляе моладзь, школьнікі (без падзелу па полавых прыкметах) — усюды, прылюдна, дома і ў школе — "бля... бля... бля..." Колькі разоў не вытрымліваў: "Ты і з маці так? І ў школе з настаўніцай?" І чуў у адказ: "Ты чё, дед? С луны свалился? Чеши, пока цел!"

У вёсцы, дзе ў мяне хатка-летнік, у адной суседняй сям'і муж і жонка размаўляюць паміж сабою і з дзецьмі па прынцыпе 1:8, і ў гэтых адносінах "8" прыпадае на ненарматыўную лексіку. Сам чуў, як іх трохгадовая дачка пасылала ўжо цётку-суседку "на тры літары".

Небывалы прагрэс! І крочыць ён сямімільнымі крокамі.

Камо грядеши?

●

Даўнавата было, а і сёння помніцца.

Генадзь Пішчаеў спяваў "Элегію" Маснэ. Лірычна-пачуццёва, распеўна, глыбока — ад такога цуду душа замірала!.. Але — во парадокс! Яго белькантэ можна было слухаць — з вялікай асалодай — доўга. А тую ж самую "Элегію" ў выкананні віяланчэліста — бясконца. Нечалавечая, незямная па глыбіні пачуццяў мелодыя — звар'яцець можна! Ці плакаць, плакаць, гавеючы душою, узносячыся з ёю ў бязмернасць.

А нехта ж некалі сказаў, што гучанне музычнага інструмента ніколі не заменіць, не пераўзыдзе чалавечага голасу. Жывы голас — і імітацыя голасу. Жыццё — і імітацыя жыцця.

Працягнем далей паралель: жыццё — і яго адлюстраванне ў літаратуры. І пісьменніцкі паказ павінен быць па праўдзівасці больш яркім, жывейшым, чым само жыццё. І тады гэтае другое, "адлітаратуранае", больш возьме за сэрца, за чалавечую душу, выкліча больш роздуму аб сэнсе жыцця, быцця і небыцця.

"Над вымыслом слезами обольюсь..."

Ці не ў гэтым і прызванне літаратуры?

●

"Брыльянтавая рука"... Шмат сцэн сапраўды камічных, і было у свой час нямала смеху: у якія толькі сітуацыі ні траплялі героі! Цяперашнія гледачы, маладыя і падлеткі, таксама шчыра смяюцца, не задумваючыся ці не ведаючы яшчэ, што ўсе галоўныя штукары ў фільме — нябожчыкі ўжо.

А ў мяне нейкае патрасенне душэўнае: як гэта... як ім не... Яны ж на тым свеце ўжо? І выдурняюцца?! Усё, што на экране — віртуальны свет. Дый трукі, як на сённяшні старэчы погляд, часам плоскія, разлічаныя на непатрабавальных.

●

Пра славутага Сергія Раданежскага паломнікі потым расказвалі часам зусім фантастычныя рэчы. Напрыклад, нібыта ён яшчэ ненароджаны, тройчы "воскричал во чреве матери". Гэтак Бог падаў знак, што немаўля чакае вялікая будучыня.

Нашы маладзёны, што бяруцца за пяро, яшчэ не нарадзіўшыся як паэты, не стаўшы на ногі, ужо крычаць пра сябе: "Мы — паэты!", "Паэты — мы!" І бум-бам-плясь! — грукаюць, барабаняць у тазікі ці ў начныя гаршкі.

Як казаў адзін слуцкі дзед: "Ай-яй-яй, каб гэты ваш крык ды нанач. Во-о было б страшна".

Хай пагрукаюць, пабарабаняць, пабурапеняць... Што з іх возьмеш, акрамя аўтографа. І аналізаў...

●

Гартаю "Паэтычнае майстэрства" Буало. Сёе-тое зноў перачытваю, а вось гэтыя тры секстэты захацелася нават перакласці на родную мову:

Настаў быў век, журботны і галодны,
Сваё аблічча разгубіў Парнас высакародны.

Хто словам гандляваў, рвануліся ў паход.
Сумленным творцам гадзілі
і затыкалі рот,
Труцілі душы маладым паэтам,
Нахабна насміхаліся пры гэтым.
Мо запярэчыць мне які нявера,
Але ж і музам трэба снедание,
абед, вячэра,
Калі ж паэт засядзе нашча са сцілом,
А з галадухі бедаку жывот аж падвяло,
То будзе не наўме яму Парнас,
і не да Грацый,
Адно самазабойства
з яго цяжкай працы...
Што ж вас палохае, калі паэты
Свяцілам-каралём абласканы, сагрэты?
Калі ўсе вашы клопаты
пра хлеб надзённы
Бярэ ён назаўжды, а не ўсяго на сёння?
То як такіх не славіць, не хваліць?
Даюць натхненне нам, магчымасць
жыць-тварыць!

Ці не праўда — быццам пра сённяшні дзень? І ці не праўда, што мэтр Буало абураецца тымі, хто гандлюе словамі і душамі, тымі, хто давёў высакародны Парнас да ўзроўню катуха, куды любы парсюк, рассунуўшы лычам загародкі, мог залезці?

А як зразумець шаноўнага маэстра, калі ён заклікае паэтаў, "смирив гордыню", па сутнасці, прадаўшыся за чачавічную поліўку, свяцілу-караля і славіць, і хваліць?

Вядомы дырэктар Прабірнай палаткі, а па сумяшчальнасці паэт Казьма Пруткоў казаў: "Глядзі ў корань!" А мы давайце ўгледзімся, удумаемся ў тое, што прыхаваў Буало між радкоў. Мо такое?

Хочацца ўладыку салодкіх спеваў у свой гонар? Наце, ваша вялікасць, пазабаўляйцеся прыгожаю бразготкаю, пацешце сваё самалюбства. А мы пастараемся застацца самімі сабою, будзем думаць сваё, пісаць сваё, што ідзе ад неба, што мае каштоўнасць вечную.

Лаціняне казалі колісь: мяняюцца часы, мяняемся і мы з імі.

Дзіва што!

Любы ўладыка, заўсёды імкнуўся перацягнуць на свой бок грамадскую эліту, дзеячаў літаратуры і мастацтва, культуры, бо разумеў іх ролю і значэнне ў грамадскім развіцці.

Такое было ва ўсе вякі, ва ўсе эпохі. Нават намнога горш, як, напрыклад, у нас. Зусім нядаўначка, хоць гэта ўжо называюць "у мінулым стагоддзі". Славілі і па адным, і калектыўна, хорам колішняга папа-недавуку, былога маладога паэта Сосо Джугашвілі. Я і сёння памятаю, як нас, школьнікаў, прымушалі вучыць на памяць "Пісьмо беларускага народа Вялікаму Сталіну", калектыўны паэтычны твор:

Ты сонца для нас, што зямлю асвяціла
І ласкай сагрэла палі, гарады.
Ты — рэк паўнаводных імклівая сіла,
Ты — наша жыццё, дарагі правадыр!

А хто марудзіў з хваласпевамі ці не схіляўся да іх, аб'яўлялі нацдэмамі, членамі контррэвалюцыйных арганізацый, польскімі ці якімі іншымі шпіёнамі. Расстрэльвалі, ссылалі ў Сібір ці на Поўнач, замучвалі на капанні каналаў і лесараспрацоўках, ламалі карак жывым ці кідалі з вышыні на жалязякі, як Кузьму Чорнага. Са шматсоценнага калектыву пісьменнікаў і паэтаў, членаў нашых літаб'яднанняў "Маладняк і "Узвышша" засталіся ў рэшце рэшт лічаныя асобы.

Янку Купалу давялі да таго, што рабіў сабе харакіры, а ў 1942 годзе, у Маскве, забілі, скінуўшы ў пралёт лесвіцы. Да Я. Коласа завальваліся з вобыскамі, паласавалі нажамі крэслы, шукаючы кампрамат і "контру". Лютавала цэнзура.

І ўсё гэта пры патуранні і прамым дыктаце правячай кампартыі — "розуму, гонару, сумлення нашай савецкай эпохі".

●

Пушкін, Аляксандр Сяргеевіч. Дваранін, хоць і "потомок негров безобразный" (гэтак ён пра сябе). Не толькі вялікі паэт Расіі, але і чалавецтва.

"Геніяльнасць Пушкіна праявілася яшчэ ў раннім дзяцінстве, — успамінаў браў Леў. — Ён ужо ў восем гадоў сачыняў на французскай мове камедыі і эпіграмы на сваіх настаўнікаў".

Але саскрабем крыху з яго хрэстаматыйны глянец.

Толькі выпадкова ён не стаў упоплеч з дзекабрыстамі на Сенацкай плошчы Пецярбурга 14 снежня 1825 года, калі яны выступілі супраць царскага самаўладдзя. А выпадковасць была ў тым, што ўжо быў сасланы ў сяльцо Міхайлаўскае за свае вершы. Саслаў імператар Аляксандр I.

Паўстанцаў-вайскоўцаў было тады на плошчы каля трох тысяч, не лічачы гараджан-прасталюдзінаў, а царскіх войскаў, тых, што паспелі ўжо прысягнуць Мікалаю I, каля дванаццаці. Па загадзе Мікалая I па паўстанцах

(Працяг на стар. 12)

У гонар Генадзя Кляўко

На будынку Рудзенскай сярэдняй школы, што ў Пухавіцкім раёне, адкрыта памятная дошка ў гонар былога вучня — паэта Генадзя Кляўко. На адкрыцці прысутнічалі родныя літаратара — жонка, дзеці, унукі, сёстры, а таксама загадчык аддзела культуры Пухавіцкага райвыканкама Яўген Сушко, старшыня Рудзенскага гарпасялковага савета Уладзімір Прыёмка, кіраўнік раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Ганна Лабастава, дырэктар раённага краязнаўчага музея Аляксандр Прановіч.

Варта заўважыць, што гэта не першы крок па ўшанаванні памяці літаратараў-землякоў у Пухавіцкім раёне. Дагэтуль былі ўсталяваны памятныя дошкі ў гонар Уладзіміра Хадыкі, Алеся Бачылы, Аркадзя Моркаўкі, Міколы Каспяровіча.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Сустрэча з земляком

Да сустрэчы з земляком, паэтам Навумам Гальпяровічам, супрацоўнікі Наваполацкай цэнтральнай бібліятэкі імя У. Маякоўскага падрыхтаваліся сур'ёзна і грунтоўна. Спецыяльна да гэтай падзеі быў выпушчаны буклет "Аб ісцінах спрадвечных і святых. Творчы партрэт Навума Гальпяровіча", куды ўвайшло слова пра паэта, урыўкі з яго вершаў, бібліяграфія яго твораў і матэрыялаў, напісаных пра яго.

У школы, бібліятэкі, вытворчыя калектывы была накіравана прыгожа аформленая рэкламная лістоўка, якая расказвае пра новую кнігу земляка "Святло ў акне".

На спатканне з госцем прыйшлі ў асноўным тыя, хто добра ведае і памятае Навума Гальпяровіча, які каля 20 гадоў жыцця звязаў з юным прыдзвінскім горадам, быў адным з заснавальнікаў і актыўных удзельнікаў мясцовага літаб'яднання, старшынёй Полацка-глыбоцкай філіі абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў, у якасці карэспандэнта Беларускага радыё вёў летапіс жыцця мясцовых прадпрыемстваў, культурных устаноў.

Сустрэчу адкрыла дырэктар Наваполацкай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы Валянціна Кішчанка.

Навум Гальпяровіч чытаў вершы, адказваў на пытанні, расказваў пра работу Беларускага радыё, дзе ён сёння працуе галоўным рэдактарам.

Сваімі ўражаннямі ад кнігі падзяліліся многія прысутныя, а мясцовы паэт Валерый Старынскі нават склаў верш у гонар госця.

Н. К.

Ушанавалі Багдановіча

24 мая, напярэдадні 85 угодкаў з дня смерці Максіма Багдановіча, у Ракуцёўшчыне, якая ў 1911 годзе стала гасцінным прытулкам для паэта, ушанаваць ягоную памяць сабраліся настаўнікі і школьнікі з Маладзечна, Чысці, Краснага, музейшчыкі, пісьменнікі.

Распачалася імпрэза ў Максімавым садзе з прачулага слова пра Багдановіча вядомага краязнаўца і выдаўца Міхася Казлоўскага.

Затым дзея перанеслася на падворак Ракуцёўскага маёнтка, які ператварыўся ў імправізаваную сцэну. Перад прыхільнікамі таленту Максіма выступілі з вершамі паэты Уладзімір Марук і Віктар Шніп. Выканаў свае песні паэт і бард Эдуард Акулін.

Тут жа адбыўся міні-пленэр навучэнцаў Маладзечанскай мастацкай школы.

Дырэктар музея М. Багдановіча Ірына Думанская назвала гэтую падзею цудоўным акордам перад традыцыйным святам беларускай паэзіі і песні "Ракуцёўскае лета", якое мае адбыцца ў гэтых слаўных мясцінах напрыканцы ліпеня.

Ян АКУЛІН

КРЫТЫКА

Паклон роднай зямлі

Мне здаецца, што разважаючы пра кнігу Міхася Башлакова "Пяро зязюлі падніму" (Мн., Мастацкая літаратура, 2001), трэба, у першую чаргу, пісаць пра паэму "Лілея на цёмнай вадзе". Менавіта яна задае агульны настрой выдання, менавіта ў ёй здолеў паэт выказаць свой боль і адчай, гнеў і крыўду, спадзяванні, успаміны і... горкія расчараванні.

Але гэта зусім не азначае, што вершы аўтара не заслугоўваюць увагі чытачоў. Пачну з першай часткі, — найбліжэйшай мне — "Крыжы-абярэгі". Найбліжэйшай таму, што закранаюцца глыбінныя карані народнай самасвядомасці, духоўнасці, міфалогіі, дэманалогіі, язычніцкай рэлігіі. Мала гэтага, аўтар вельмі ўдала спалучае старадаўняе і сучаснае. "Вадзіца-царыца, Марская крыніца, Ад зла памачніца; Па днях і начах І вячэрніх зарах, Па цёмных лясах, Па імхах балотах, Па травах шаўковых, На зорныя ночы, На ясныя вочы, На мілыя бровы, Нясі мае словы..." Здаецца, гэтыя радкі кожным з нас сотні разоў чутыя-перачутыя, але, тым не меней, яны зачароўваюць, прыцягваюць. У чым справа? Найхутчэй у тым, што паэт усё сваё свядомае жыццё крочыць па родных дарогах-сцяжынках не толькі сам-адзін, а на пару з... Мовай. З бацькоўскай Мовай, якая для яго заўсёды Жывая, Жыватворная, Неўміручая. Менавіта ў яе абарону ён выступае зараз, горача заклікаючы прачнуцца, абудзіцца, успомніць слаўнае мінулае. У некаторых выпадках здаецца, што М. Башлакоў паўтарае традыцыйнае, якое да яго закраналі шматлікія літаратары, але ўсёроўна, знаходзіць нешта сваё, асабістае. Ужо наколькі стаў алітаратураным такі дэманалагічны персанаж, як лясун (лесавік), дзякуючы ўдалым апрацоўкам фальклорнага матэрыялу Я. Купалам, М. Багдановічам, тым не меней, у паэта, ён адметны, бо нагадвае не толькі лясного валадара, але і варажбіта таксама:

У гушчары ля самага балота
Жыве лясун ссівелы і стары.
Замшэла барада, нібы калода.
Сярмяга яго сплецена з кары.
Ні промень не праб'ецца. Ні прахожы
Не пройдзе тут. Не любіць ён людзей.
Ён з раніцы да вечара варожыць
На чорнай застаялае вадзе.

А як моцна паказана змяінае свята, якое вядома ўсім з ранніх язычніцкіх часоў і ў хрысціянскай рэлігіі носіць назву Узвіжання (праўда, у М. Башлакова "Здвіжанне", што значна бліжэй да народнага), "На здвіжанне спаўзаюцца вужы Па сцежках таямнічых на паляны. Гадзюкі свае чорныя крыжы На гульбішча нясуць неспадзявана. Яны паўзуць, каб выстылую кроў У танцы разагрэць. І так спрадвеку. Ахоўнікі запыленых вякоў І змрочных таямніцаў чалавека". Паэт крочыць наперад па жыцці надзвычай асцярожна, нібы баючыся таго, што вось-вось нешта здарыцца, нечакана абрынецца. І ўсё ж калі пачынае разважаць, аналізаваць, то зноў-такі робіць не вельмі радасную выснову — гэтага ўсяго трэба было чакаць. І з-за грахоў нашых цяжкіх, і не толькі перад Богам, але, у першую чаргу, перад самімі сабою, і з-за нашай неабдуманасці ("крумкач крумкоча" — прадвесце бяды), і з-за нашай усеагульнай абыякавасці. Таму і атрымалі тое, што зараз маем, "Хто і сёння нямы? Хто і сёння канае?.. "Гэта мы... Гэта мы... Беларусы... Пытаеш..."

Ці не таму гучаць, як нам здаецца, занадта спрошчаныя, але разам з тым і справядліва-рэальныя словы, "Мы збіліся У жывёльны статак... Жыццё — пастух, куды нас гоніш?" Каб атрымаць прычынна-выніковы адказ М. Башлакоў звяртаецца не толькі да таго, што падказвае яму душа, не толькі да найбагацейшых пластоў нацыянальнай міфалогіі, але і да святых для кожнага сумленнага беларуса імёнаў Міколы Гусоўскага, Кірылы Тураўскага, Янкі Купалы. Размаўляўчы з імі, нібы са сваімі сучаснікамі, аўтар не забываецца падкрэсліць — кожны жыў у адпаведную эпоху, перад кожным стаялі шматлікія перашкоды і нягоды, але кожны з іх праслаўляў сваю Радзіму, Бацькаўшчыну, Беларусь, якая была не простым словам, а святым, за якім падразумявалася ўсё: прырода, народ, мова. Трагічна гучыць і выснова паэта адносна таго, што наш край заўсёды імкнуліся запаланіць, задушыць любую нацыянальную ідэю Адраджэння, а на будзённым узроўні гэта праяўлялася і ў тым, як вымералі і працягваюць вымяраць беларускія вёсачкі. Яны, паводле М. Башлакова, з'яўляліся тымі жыватворнымі ручаінкамі, якія пастаянна жывілі і мову, і нацыю. А тут атрымалася зусім наадварот, вёска Ліпляны (канкрэтны прыклад) мела 13 двароў, а зараз вымірае. Не хочацца паэту вымаўляць, а мне пісаць слова "вымерла"... І ці не па яе памяці гэты радок, "Даўно адкукавала ёй зязюля. Даўно адкукавала за сялом"? Людзі, нібы апамятаўшыся, сталі стаўляць ля кожнага паселішча крыжы-абярэгі, спадзеючыся на іх, як на нейкую апошнюю інстанцыю. Але не дапамагло. Не здолела выратаваць і тое, што дапамагала нашым продкам.

Здарылася самае страшнае нават з таго, што можна было чакаць (частка другая "Радаўніца ў мёртвай зоне"). М. Башлакоў і тут не адыходзіць ад агульнага плану сваёй кнігі, паступова ўзмацняючы псіхалагічны аспект трагедыі. Ён нібы падкрэслівае, выхоплівае паасобныя драбніцы, а ў цэлым атрымліваецца суцэльнае палатно: "Мёртвага вожыка несла ў чорным адзенні жанчына" (перасцярога); "І ля ног маіх плешчацца Сож, Сіні-сіні быў, пачарнеў..."; "У чарнобыльскай зоне вёскі хаваюць"; "Чарнеюць рамонкі за матчынай хатай". На гэтым фоне ажно "Айчына бедная мая Ад скрухі пачарнела". Жудасныя падзеі разгортваюцца падчас "усеагульна-загаднага" свята:

Ах, якія мы праведнікі:
І законнікі...
Смерцю пыхкаў
Рэактар атамнай станцыі.
Мы ж крычалі "ура"!
У Нароўлі і ў Хойніках...
(Не маглі абысціся
Без дэманстрацыі?!).

Сітуацыя такая, што і сам паэт неяк, здавалася б, ліхаманкава спрабуе даць адказ ужо не на шараговыя адзінкавыя пытанні, а на глабальнае, ад якога залежыць лёс усяго народа. І тут М. Башлакоў заклікае да яднання славянскіх народаў, славяншчыны, "А за імі прымрояцца даўнія лікі. Наплываюць чаўны паўзабытых плямён... Уся Славяншчына тут...". Гэты матыў сустракаўся і раней, "Браты мае, адкуль між намі лёд?! У нас адны агульныя вытокі. Расія, Беларусь і Украіна — Славяншчына!.."

Усёабдымны і ўсёагульны пасля-чарнобыльскі боль не дае спакою, патрабуе адшукаць нейкае выйсце. І не столькі для самога сябе, колькі для людзей, якія звяртаюцца да паэта з адзіным усяго пытаннем — што ж нам рабіць далей? Сапраўды, як выправіць наша гаротнае становішча? Ужо не толькі душэўнае, але і матэрыяльна-сацыяльнае? Аўтар адно гаротна выдыхнуў: "Узлячу я над роднай зямлёю, Заспяваю, Заплачу аб ёй. З чорнай хмары Над чорнай бядою Горкай-горкай пральюся слязой". Не, гэта не спроба ўцячы ад суровай рэальнасці, а памкненне ўзняцца над родным краем, каб яшчэ больш глыбока асэнсаваць тую бяду, якая здарылася, якая адарвала людзей ад стагоддзямі наседжаных месцаў. Можна тут крыху перайначыць выслоўе, што глабальнасць гэтай трагедыі бачыцца паэту не з далечыні, а з вышыні. Іменна адтуль ён заўважыў лілею на цёмнай вадзе. Кветку, якая свеціць. Але вось свеціць яна надзеяй ці шматкроць перавышаючай радыяцыяй? Адсюль і рытарычнае пытанне: "Дзе вы, Дзе вы, прарокі Айчыны?" (частка трэцяя "Яе слёзы горкія Айчыны").

І лёсам, і доляй

Гэтае выданне, якое выйшла ў свет дзякуючы дзейснай падтрымцы пісьменніка Уладзіміра Ягоўдзіка, дзякуючы іншым людзям добрым, свежае і ў непасрэдным сэнсе слова і ў пераносным. На цудоўным малюнку сіне-белага колеру (мастак — Уладзімір Вішнеўскі), якім аздоблена вокладка, залацістыя літары склалі тры словы: "Імем няўмольным свабоды". Пад такім загалоўкам сёлета з'явілася гэтая адметная кніга.

Чым жа яна адметная?

Як піша ў сваім кароткім уступным слове "Замест прадмовы" Алесь Траяноўскі (ён паўстае перад чытачом у трох іпастасях — укладальнік, аўтар бібліяграфічных нататкаў і — перадусім — перакладчык), змест зборніка складаюць творы малавядомых або і зусім невядомых у Беларусі ўкраінскіх пісьменнікаў. Адны з іх апынуліся ў эміграцыі, другія — былі загубленыя на сваёй радзіме ў самым росквіце таленту або сасланыя ў лагеры нявольніцкай працы, дзе і абарваліся іхнія жыцці. Доўгі час ім не знаходзілася месца ва ўкраінскай літаратуры савецкага перыяду; сёння ж іх імёны і творчыя набыткі вернуты незалежнай Украіне. Цяпер сёе-тое з твораў іх кагорты ўведае і люд беларускі.

Зборнік украінскай паэзіі, прапанаваны чытачу А. Траяноўскім, самым дзівосным чынам мае кропкі судакранання з гісторыяй беларускай літаратуры, нашай духоўнасцю, культурнымі стасункамі між братнімі народамі ў асобе іх майстроў мастацкага слова. Цікавы факт: адзін з аўтараў, прадстаўленых беларускаму чытачу, Міхайла Драй-Хмара (1889—1939), з'явіўся першым не толькі на Украіне, але і ў свеце перакладчыкам усёй кнігі паэзіі Максіма Багдановіча "Вянок". Менавіта гэты ўкраінскі творца стаў таксама складальнікам і аўтарам прадмовы "Вінка", выдадзенага ў Кіеве ў 1929 годзе. Яго пяру, дарэчы, належаць і артыкулы "Паэт беларускага адраджэння Максім Багдановіч" (1928), "Жыццё і творчасць Максіма Багдановіча" (1929), а таксам праца па гісторыі беларускай мовы.

Літаратурна-асветна-культурныя сувязі паміж Беларуссю і Украінай заўсёды былі двухбаковыя. Між іншым, першы з беларускіх паэтаў у дваццатым стагоддзі, хто, дбаючы аб "шырыні духоўнай", выдатна бачыў абсягі не толькі роднай літаратуры, а і літаратур іншых народаў, асабліва рускага і ўкраінскага, быў якраз Максім Багдановіч. Пра тое сведчыць, апроч перакладчыцкай дзейнасці, цэлы шэраг яго рэцэнзій, нататак і літаратурна-крытычных артыкулаў, сярод іх асабліва прыкметнае месца займаюць тыя, у якіх разглядаюцца творцы: Тарас Шаўчэнка, Іван Франко, Уладзімір Самійлэнка і Грыцько Чупрынка.

У кнізе Міхайлы Драй-Хмары ўсяго два вершы. Адзін з іх трэба прывесці цалкам.

...Гарэлымі сярнічкамі — вуглямі
на шэрых сценах дні свае лічу,
п'ю келіх роспачы, турэмны камень
штодзень удоўж і ўпоперак тапчу.

Нап'юся... Коней запрагаю ў шоры,
лячу за тым, што страціў назаўжды,
каб дзесьці у асмужаных прасторах
дагнаць свае юнацкія гады.

"Вярніцеся, — гукаю, —
хоць у госці!"
"Не вернемся!" — мне чуецца
з гары.

Я на калінавым заплакаў мосце
І зноў убачыў шэрыя муры,

І лапік неба сіняга, у кратах,
і вока незадрэмнае ў "ваўчку"...
Не мчацца мне ўжо
на гнядых крылатых:
ў каменным я, ў каменным я мяшку.

Нярэга, 27.05.1937 г.

Дапытлівы чытач зверне ўвагу на драматычны змест верша і, вядома, зразумее, у якой характэрнай сітуацыі 30-х гадоў, у якім каменным мяшку апынуўся творца. "Вось гэтак паэт, літаратуразнаўца-славіст, прафесар Камянец-Падольскага універсітэта, высокаінтэлігентны, далікатны чалавек быў замардаваны голадам і непасільнай працаю на лесапавале дзесьці на Далёкім Усходзе", — піша А. Траяноўскі ў лаканічным "Слове пра Міхайлу Драй-Хмару".

Вершы Грыцька Чупрынкі, "паэт з вельмі рэдкім, своеасаблівым тыпам таленту, лініі якога пры ўсёй сваёй нескладанасці буйныя, рэзкія і выразныя" (словы М. Багдановіча), гэта жывыя мастацкія ілюстрацыі складанага стану душы паэта ў час, калі Украіна абуджалася да новага жыцця, але нічога не было ясна, што чакае наперадзе. Ужо ў першым сваім украінскім вершы "Мая кобза" (1907) ён піша:

Ты чуеш, як жаласна кобза гудзе,
Аж стогны з грудзей вырывае, —
І ў голаў няўцямная думка ідзе,
І светлая мара знікае.

Гэтак пачынаецца твор, але ў канцы яго з'яўляецца вера, "Што ты **пераможаш** нядолю". У тым жа годзе аўтар паведамляе ў вершы "Бацьку": "... з няпраўдаю лютаю // Сын твой **змагацца** ідзе". Словы пераможаш і змагацца выдзелены мною, каб падкрэсліць думку паэта, што перамагчы нядолю можна толькі змаганнем. Ці не таму

Імем няўмольным свабоды. Старонкі ўкраінскай паэзіі (Пер. на беларускую мову, укладанне і бібліяграфічныя нататкі Алеся Траяноўскага. Мінск, 2002)

Так, у гэтай частцы паўсюль гучыць тэма Айчыны, "З кім ты сёння, мая Айчына? Хто асушыць тваю слязу?"; "Мой боль — гэта боль Радзімы"; "А мо, Айчына, гэта ты галосіш Па ўсіх любімых дочках і сынах?" Але М. Башлакоў акцэнтуе сваю ўвагу таксама і на тых, хто кіраваў родным краем, хто яго бяздумна вёў да "светлай будучыні", якая ў рэальнасці абрынулася шматлікімі трагедыямі палескіх сем'яў і ўсеагульным горам беларускага народа, "Нахлусілі табе, мой народзе, наманілі..." Ці не з гэтых разважанняў узнікае напаўзабытае міфалагічна-багрымаўскае "ваўкалакам абярнуся". Учытаемся ўважлівей у словы: "Не блукайце ўначы, Не вастрыце нажы, Ваўкалакам не страшна прадвесне..." Вядома ж, пасля такой бяды ўжо цяжка [illegible] Таму нам выдатна зразумела паэтава чарговае расчараванне, "Мы — рабы... Мы адвыклі ад волі На вякі, на вякі, на вякі". І яшчэ наступнае: "Прасвісталі мы ўсё, праматалі: Годнасць, гонар і славу дзядоў...". Страціць лёгка, а вось адшукаць, вярнуць — не так проста.

Нездарма, відаць, чацвёртая частка паэмы называецца "Дай мне, Госпадзі, светла пражыць", бо паэт сам нарэшце ўсё ж убачыў выйсце з беспрасветнага становішча ў ачышчэнні... душы, як уласнай, так і душаў шматлікіх сучаснікаў. Ён зразумеў, што толькі гэтакім шляхам можна прыйсці да адраджэння першаставральнай духоўнасці, якая ў жыцці любога з нас асацыіруецца з нечым чысцютка-белым. Гэтую чысціню М. Башлакоў даў права прыносіць на зямлю беларусаў буслам. Аўтар зразумеў, чаго нашы далёкія продкі шанавалі і абагаўлялі саму маці-прыроду, таму, што менавіта ў ёй, у яе праявах, бачылі жывую душу. Пра гэта яскрава нагадваюць радкі, "Рыпіць сасна старая ля дарогі, Рыпіць сасна... Відаць, душа баліць?" Паводле старадаўняга беларускага павер'я вынікала, што менавіта ў дрэвах, якія рыпяць, жывуць душы памёршых людзей. Калі такія дрэвы ссякалі, па няведанні ці ненарокам, то тым самым прымушалі душы шукаць сабе новы прытулак. Гэта лічылася вялікім грахом.

Нібы акрыяўшы душою, паэт катэгарычна пярэчыць міфічнаму прадвесніку няшчасця, "Не крычы нада мною, Крумкач... Яшчэ рана на трызну спяшацца". Разам з тым, ні на імгненне не забываецца пра тое ў якім становішчы знаходзіцца мова. Радзіма. "І Радзіма-пакутніца вечная — Ля царквы, як жабрачка стаіць". Аўтар сцвярджае, што дзеля яе адраджэння ён згодны на ўсё, праўда, робіць невялікую агаворку, "Няхай душа мая самоціцца, Ды толькі хай не праклінаецца". Яно і сапраўды, у продкаў стараліся пазбягаць усемагчымых праклёнаў, былі цвёрда перакананы, што такія словы маюць неўтаймаваную і нязведаную сілу. Дастаткова ўсяго навучыцца ёю карыстацца. Толькі прашчуры за лепшае лічылі дапамагаць людзям, але ні ў якім разе не прыносіць ім шкоды, нават злым, неабдуманым словам. Тым не меней, сам паэт на поўным сур'ёзе перакананы, што ягонае палымянае слова будзе жаданым у кожнай хаціне. Калі не ў сучаснікаў, то ў нашчадкаў абавязкова, "Ляжа на стол Маё звонкае слова — І ў кожнай хаце / Ні многа ні мала / Будуць чытаць Міхася Башлакова".

Другая частка зборніка — гэта вершы, якія займелі агульную назву — "Світальныя коні". У ёй змешчаны творы пра зусім яшчэ недалёкае юнацтва, маладосць, першае нясмелае каханне. Недалёкае, але яго ўжо не вернеш, не пройдзеш па-новаму па сцяжынках маленства, не пагамоніш с сябрамі дзяцінства, многія з якіх ужо назаўсёды сышлі з зямных дарог, знайшлі свой апошні прытулак у розных кутках. Матывы гэтыя ўзмацняюць сум, а іначай і нельга, бо што можаш адчуваць, калі "аклікаюць маленства майго цягнікі". Паэт не адыходзіць ад шырокавядомай традыцыі, характэрнай вуснапаэтычнай творчасці, параўноўвае чалавечае жыццё з кароткім днём, дзе раніца, вядома ж, маладосць, а вечар — старасць... Не паспееш азірнуцца, як яна ўжо стукаецца ў дзверы. Кожнаму б хацелася, каб гэты дзень цягнуўся, як мага даўжэй, але ніхто яшчэ не здолеў супыніць адвечны бег жыцця, няхай сабе і самы павольны, самы размераны, "Чаму ж так рана сёння звечарэла* Шчыміць душа... І просіцца сляза". Але спадабалася зусім іншае, якое, нібы пераклікаючыся з песенным народным матывам, заклікае ўсміхнуцца, бо не ўсё яшчэ згублена, многае чакае наперадзе, ёсць яшчэ многа сілы і жаданне тварыць на карысць людзей. У паэтычных радках гэта атрымалася наступным чынам:

Зялёная восень у госці прыйшла,
Калі маладосць заблудзілася недзе,
А старасць яшчэ ля чужога двара,
А старасць на шэрым кані яшчэ едзе.
("Зялёная восень")

І яшчэ абавязкова хацелася б адзначыць наступнае — аўтар вельмі чуйна ўспрымае прыроду, умее перадаць яе найдрабнейшыя зрухі, карыстаючыся народнымі прыкметамі і павер'ямі, ажыўляючы вераванні далёкіх продкаў, надаючы ўсяму гэтаму актуальны сэнс.

...Перагарнуў апошнюю старонку кнігі "Пяро зязюлі падніму" М. Башлакова і падумалася: "Вось яны сімвалы, якія вядуць паэта наперад, не даюць спыняцца на месцы, — світальныя коні маленства, лілея на цёмнай вадзе суровай рэальнасці і вера, вера ў чалавека, вера ў Беларусь, вера ў тое, што ўсё абавязкова перайначыцца да лепшага".

Аляксей НЕНАДАВЕЦ

ў яго вершах такое абвостранае чалавечае пачуццё драмы. Напрыклад:

Было так светла, ціха ўсюды,
Што здаўся б лішні кожны гук...
Тады ўпаўзла гадзюка ў грудзі
І дзеўбануў мне ў сэрца крук.

Прадчуваннем асабістай трагедыі прасякнуты адзін з самых пранікліва вершаў паэта — "Доказ неўміручасці" (1918):

Я так чакаю, я так хачу вясны,
што баюся
яе не пабачыць.
І калі яна сапраўды настане
ўжо тады,
калі буду я ляжаць у магіле,
то прыйдзі,
я прашу, і скажы мне, крыкні,
што ўжо
царства вясны, царства шчасця і волі
настала вакол!
Не, не трэба прыходзіць?
Ты будзеш далёка
ад мяне.
Толькі мараю, з духам
з'яднаўшыся маім,
лёгкім ветрам шаламні кветкамі і
лісцем, ды ранішняй
квеценню вішань.
Я пачую...
Ззянне, водар і квецень
вясны — гэта
мне боскі доказ неўміручасці.

У кнізе "Імем няўмольным свабоды" творчасць украінскіх паэтаў падаецца не ў адрыве ад іх лёсаў, а ў самай цеснай сувязі з імі, яркімі і (у сваёй абсалютнай большасці) трагічнымі, лёсы тут ствараюць адпаведны фон, з'яўляюцца неабходнай стыхіяй, неадрыўным зместам.

Рэпрэсіўная куля рана паставіла сваю жудасную кропку на жыцці яшчэ аднаго выбітнага паэта — Дмытра Фалькіўскага (1898—1934). Такім псеўданімам падпісваў свае творы вытанчаны і шчыры лірык і мужны грамадзянін Украіны — Змітро Ляўчук, які нарадзіўся на Беларусі, у вёсцы Лепяш каля Кобрына. У яго біяграфіі ёсць, так бы мовіць, "чырвоная" старонка: яшчэ падчас вучобы ў Берасцейскай гімназіі юнака залучылі ў свае шэрагі бальшавікі; ён, удзельнік грамадзянскай вайны, служыў не абы-дзе — у ЧК, што, здавалася б, павінна было яго ўратаваць. Але таталітарны рэжым не дараваў вальнадумства нікому. А ён, паэт, кінуў службу, паехаў у Кіеў і, калі заняўся творчасцю, пачаў асэнсоўваць падзеі і свой удзел у іх не з пазіцый ідэалагічных патрабаванняў, а з пазіцый чалавечага сумлення."Праўдзівае слова паэта... адгукнулася помстай сталінскай улады. Таму былы чэкіст у абвінаваўчым акце стаў... тэрарыстам-белагвардзейцам...", — піша А. Траяноўскі. Пра масавае вынішчэнне ўкраінскай інтэлігенцыі можна меркаваць нават па адным факце: 15 снежня 1934 г. ваенная калегія ў Кіеве пад старшынствам вядомага ката Ульрыха прысудзіла 28 чалавек да расстрэлу. Сярод без віны вінаватых было 15 пісьменнікаў, у тым ліку і паэт Дмытро Фалькіўскі.

Творчасць Уладзіміра Самійлэнкі (1864—1925), апроч геніяльнага Максіма Багдановіча, ацаніў яшчэ адзін геній — Іван Франко (ён — аўтар прадмовы да яго зборніка паэзіі "Украіне" (1906), таго самага, што выдаваўся тройчы.

Уладзімір Самійлэнка — лірык філасофскага складу, даволі з'едлівы сатырык і дасціпны гумарыст, а яшчэ — драматург, перакладчык і публіцыст. Сваім трапным мастацкім словам У. Самійлэнка выкрываў парадкі ў Расійскай імперыі, разгул шавінізму, прыстасавальніцтва свайго чынавенства.

У кнізе "Імем няўмольным свабоды" прадстаўлены 21 творца Украіны. Гэта розныя па жыццёвым шляху, творчых накірунках і ступені адоранасці паэты. Некаторыя (напрыклад, Аляксандр Олэсь) эмігравалі, некаторыя (Алег Ольжыч, Алена Тэліга ды іншыя) былі закатаваныя гітлераўцамі ў часе вайны, а большасць — забітыя ці замардаваныя бальшавіцкай дыктатурай.

Усіх іх яднала адно — любоў да Украіны.

Няма сумнення ў тым, што гэтае унікальнае выданне ўжо знайшло ўдзячнага чытача.

Васіль ЖУКОВІЧ

УРАЖАННЕ

Агеньчыкі гарачыя

Беларуская паэзія жыве... Няхай сабе пыляцца малатыражныя кніжкі многіх аўтараў на паліцах у кнігарнях, ды не хочацца верыць, што набліжаецца ці наблізіўся апошні час вершаванага слова. Тады знікне беларуская культура (без паэзіі якія ж мова і культура?).

Захоўваю "ЛіМ" за 23 лістапада 2001 года, дзе, натрапіў на нізку вершаў Павала Змітрука. Недзе нешта, можа, і чытаў ягонае раней, але, прызнаюся, не адклалася анічога ў памяці. Без асаблівай увагі пачынаў чытаць. І, о Божа! На адным дыханні ўсё "праглынуў". Гэта нешта нечаканае. Яно захапляе, зачароўвае. У тэкстах хапае суму і болю, але ў іх пульсуе надзея, моц і нацыянальны дух. І разумееш, і верыш: калі такія самародкі ёсць — будзе жыць Паэзія! А значыць, і мова.

Хадзіў пасля прычытання вершаў П. Змітрука як ашаломлены доўгі час. Трымалі ў палоне магічныя фразы, знітаваныя таямнічай загадкавасцю і прыцягальнасцю. Імкнуўся глянуць вокам крытыка, заўважаў словы, якіх, магчыма, і ў слоўніках няма, прыкмячаў адвольнасць у рыфмоўцы. Ды ўражвала непрыкметнасць "агрэхаў" пры непрадузятым чытанні. Яны не выпіралі, як нярэдка бывае ў іншых паэтаў. Усё здавалася апраўданым, зразумелым — натуральным. Падстаў у тэксты надта ж правільныя словы, перакруці сінтаксіс, рытміку, рыфмоўку і г.д. у звыклыя тэарэтычныя схемы і... знікае паэзія Павала Змітрука. У такія творы нельга гвалтоўна лезці, яны дыхаюць, жывуць, напоўнены энергіяй.

Пішу пад уражаннем паэзіі Павала Змітрука і ўспамінаецца амаль такі ж стан, калі хадзіў ачмурэлы некалькі дзён, пазнаёміўшыся з вершамі Івана Мядзведзева, якія ён даслаў аднойчы ў рэдакцыю "Вожыка". Тады, помніцца, усе супрацоўнікі былі ўсхваляваныя, нібы адкрылі Амерыку. І Анэля Тулупава хадзіла ўзбуджаная і радаснапрасветленая, і галоўны рэдактар радаваўся — ён адразу ж даў каманду хутчэй рыхтаваць нізку ў друк. Калі наконт іншых твораў здараліся частыя спрэчкі, то тут было аднадушша: у іранічных вершах правінцыяла з вёскі Шарпілаўка, што на Гомельшчыне, быў на здзіўленне высокі ўзровень.

Аказваецца, я ўжо знаёміўся з ягонымі вершамі. Яны друкаваліся ў калектыўным зборніку "Нашчадкі" ("Мастацкая літаратура", 1979 г.). І там ужо праявілася адметнасць творцы. Ягоныя здольнасці пацвердзіліся і ў пазнейшай публікацыі ў "ЛіМе", колішнія супрацоўнікі якога шкадавалі, што ён рэдка заяўляе пра сябе. Іван Мядзведзеў даўно павінен быў бы стаць членам Саюза беларускіх пісьменнікаў, куды рвуцца напралом людзі значна менш таленавітыя. І нічога, што ён ва ўзросце, што кніжак, здаецца, акрамя нізкі ў "Нашчадках", не мае, аднак гэта — Паэт, чалавек, які ўмее здзівіць сваім бачаннем свету. Можа, ягоная "пладавітасць" залежала ў савецкі час ад "тупіц з нутром і мордай мясніка" (Вядзьмак-Лысагорскі), а сёння ад адсутнасці грошай і падтрымкі спонсараў і мецэнатаў?

Нядаўна пазнаёміўся з кніжачкай Ніны Гарагляд "Матчына песня" (1995 г.). Паэтка харошая. Добра заявіла пра сябе ў тых жа "Нашчадках". Дык чаму ж такая доўгая дарога — ажно 16 гадоў! — да другой кніжачкі? Па ўсім адчуваецца, віны аўтаркі ў гэтым няма. Усё, відаць, упіраецца ў грошы і ў сціплы характар, як гаворыцца, непрабіўны. Хапае больш прабіўных, цвёрдалобых. Няхай даруюць тыя, хто прабіўны, але таленавіты. Урэшце, камусьці больш шанцуе.

Парадаваўся за землякоў-пастаўчан, якія выпусцілі паэтычны альманах "Рунь". І пасумаваў адначасова па той жа самай прычыне, што і Алена Васілевіч ("ЛіМ", 23 лістапада 2001 г.). Балюча, што многія рунеўцы заслугоўваюць ужо таго, каб мець хто першую, а хто другую ці трэцюю кніжкі паэзіі. Аднак ляжаць рукапісы ў сталічных выдавецтвах і пакрываюцца тоўстым-тоўстым слоем пылу...

Балюча чытаць такія радкі
ў "Руні":
Нібы агеньчыкі гарачыя
На сіні жнівеньскай вады,
Цвітуць на Нарачы гарлачыкі —
Мае юнацкія гады.

Да гэтых кветак, што дзівоснымі
З тых непаўторных дзён заву,
У светлых снах махаю вёсламі
І ўсё ніяк не даплыву.

Гэта цытата пра юнацкае з верша Яўстафія Абрамовіча, будаўніка і паэта, якога не стала ў 1997 годзе. Ён так і не ўбачыў асабістай кніжачкі. Плыў, плыў, махаў вёсламі і не даплыў...

А ўсё-такі багатая наша Беларусь на паэтычныя таленты. Толькі ў пастаўскую "Рунь" уключана больш чым два дзесяткі імён. Нямала ж іх і ва ўсіх іншых раёнах. І гэта радуе! Нават маленькія іскрынкі некаму патрэбны. Іншая справа, ці ўсе могуць лічыцца прафесійнымі пісьменнікамі? У апошні час з'явілася многа графаманскіх выданняў, якія псуюць агульнае ўражанне аб паэзіі, дэфармуюць густ чытача сваёй прымітыўнасцю і малапісьменнасцю.Наяўнасць тоўстага кашалька ці празмерная нахабнасць нярэдка дапамагае выдаваць тоўстыя і прыгожыя знешне "шэдэўры" людзям, у якіх паэзіі, як у бочцы без дна вады. На пасяджэннях секцыі паэзіі ў СБП гэта пытанне ўжо не раз закраналася. Але як спыніць нахрапістую плынь шэрасці?

Ёсць і іншая праблема, якая не спрыяе ўтрыманню на высокім узроўні планкі сапраўднай паэзіі. Гэта непаразуменні паміж асобнымі групамі, плынямі, аб'яднаннямі неабдзеленых Божым дарам творцаў. Раней хацелі здзівіць усіх геніяльнасцю і выключнасцю "Тутэйшыя". Цяпер існуе "Таварыства вольных літаратараў". Ёсць таксама "Пэн-клуб", у якім, часам, праяўляецца сярод некаторых яго членаў суперэлітнасць і пагардлівасць да СБП. Несумненна, можна адзначыць у такіх альтэрнатыўных арганізацыях дадатныя моманты, але і Саюз пісьменнікаў з усімі ягонымі мінусамі не лыкам шыты. Усё-такі старэйшая арганізацыя, самая масавая, з добрымі традыцыямі і гісторыяй. Увесь авангард нацыянальнай літаратуры быў у СБП.

Думаецца, іншым пісьменніцкім суполкам не трэба станавіцца ў позу месійных аб'яднанняў, якія выведуць літаратуру і культуру на незвычайныя абсягі. Трэба падтрымліваць канструктыўныя, карысныя ўзаемаадносіны і паміж сабой і з СБП, даваць сумесны адпор шэрасці і графаманству, адшукваць таленты, дапамагаць іх росту, станаўленню.

Дарэчы, мала таго, што паэтаў мала чытаюць простыя чытачы-грамадзяне, дык і некаторыя члены Саюза пісьменнікаў, ад якіх залежыць творчы лёс пачаткоўцаў, часценька не надта дасведчаныя ў тым, што 'яўляецца на кніжных паліцах, і ў перыёдыцы, хто стукаецца ў дзверы пісьменніцкага дома. А інакш чым тады вытлумачыць, што нярэдка нядрэнныя творцы, якія ўжо заявілі пра сябе, якіх рэкамендавала секцыя паэзіі, не праходзяць прыёмную камісію ці раду? Можа, адыгрываюць ролю нейкія асабістыя моманты, непрыманне той ці іншай творчай манеры, не ведаю. Аднак адказныя за прыём у СП павінны быць непрадузятымі, кампетэнтнымі, а калі нешта не чыталі ці не зразумелі, давяраць тым сваім калегам, хто сумленна і прафесійна адносіцца да літаратуры і вылучыў кандыдатуры. Бясспрэчна, ў пісьменніцкую арганізацыю трэба ўключаць зялёнае святло таленавітым людзям, але не трэба і празмерна перагінаць палку, нібыта размова ідзе пра вылучэнне ў геніі ці пра лёс Нобелеўскай прэміі.

На Саюз беларускіх пісьменнікаў многія арыентуюцца, як на маяк, ён з'яўляецца сімвалам яднання майстроў высокага і сумленнага слова. Дай, Божа, каб і далей так было, спрыяй таму, каб таленты не згаралі ў адзіноце.

Янусь МАЛЕЦ

P. S. Нядаўна здзівіў нізкай вершаў у "Полымі" мастак Рыгор Сітніца. Яна прызнана лепшай публікацыяй у часопісе ў 2001 годзе. Нізку Павала Змітрука лічу адной з лепшых у "ЛіМе". Дарэчы, калі пакапаўся ў сваіх шафах, то знайшоў кніжачку маладосцеўскай бібліятэкі "...І надзея, і лёс, і ўспамін". Там змешчаны вершы тады яшчэ (1988 г.) Павела Дзмітрука. Малады паэт заяўляў:

Я любоўю багаты
святой да народа свайго.
Як багаты народ мой песняй,
што шчэ
заспявае,
Як багаты світанак, над гэтым
народжаны краем
Карагодаў, буслоў, курганоў,
камянёў і стагоў.

Праз дзесятак з лішкам гадоў пацвярджаецца, што перад намі творчая асоба, якая не здрадзіла абранаму шляху. Асоба, якая не можа жыць без творчасці, як памянёны вышэй Іван Мядзведзеў, які пісаў у лімаўскай падборцы:

У карты рэжуцца вяскоўцы
Пад п'яны дым і мацюкі,
А я, схаваўшыся ад сонца,
Ў цяньку вышукваю радкі.

Да землякоў вярнуцца словам

На Будакашалёўшчыне стала добрай традыцыяй, калі пісьменнікі-землякі наведваюць сваю "малую радзіму", каб сустрэцца з чытачамі, пагаварыць пра літаратуру, прачытаць новыя вершы, падзяліцца творчымі планамі.

Два гады таму ў бацькоўскі кут прыязджалі Уладзімір Дзюба, Мікола Чарняўскі і Анатоль Зэкаў. Апошнія двое наведалі землякоў і сёлета. Цікава і тое, што М. Чарняўскі, працуючы ў свой час у часопісе "Бярозка", рыхтаваў да друку першыя вершы тады яшчэ школьніка Патапаўскай сярэдняй школы А. Зэкава.

Мінскіх літаратараў прыхільна сустракалі ў дзвюх сярэдніх школах Буда-Кашалёва і мясцовым агратэхнічным каледжы, у родных вёсках — Будзе Люшаўскай і Патапаўцы.

Дарэчы, А. Зэкаў прывёз з сабой і падарыў бібліятэцы сваёй былой школы як уласныя кнігі з аўтографам, так і кнігі сяброў-пісьменнікаў з асабістай бібліятэкі.

Сяргей БЯРНАЦКІ

І саламяны капялюш — на памяць

Аматарскае аб'яднанне "Прадслава", якое дзейнічае пры Іванаўскім Цэнтры культуры і народных традыцый і якое ўзначальвае вядомы не толькі ў раёне педагог Надзея Белавус, чарговае сваё пасяджэнне прысвяціла творчасці празаіка Валянціны Куксы з Брэста. Дарэчы, зямлячцы — ураджэнцы в. Гнеўчыцы, што ў 15 км ад Іванава.

У цесным коле аднадумцаў і прыхільнікаў таленту Валянціны Міхайлаўны шмат цёплых слоў было сказана пра яе аповесць "І верыла ў цуд..." з аднайменнай кніжкі і ўвогуле пра нялёгкае жыццё-быццё пісьменніка ў сучасным грамадстве.

На памяць пра сустрэчу пісьменніцы быў уручаны сапраўдны саламяны капялюш — элемент нацыянальнага ўбрання.

Анатоль КРЭЙДЗІЧ

Вобразы мілыя

роднага краю прысутнічалі, бадай, у кожным прачытаным радку падчас прэзентацыі кніг паэзіі "Крык немаўляці" Міколы Панасюка і "Твое окно" Алены Дуньковіч.

Мерапрыемства правяла Драгічынская райбібліятэка ў рамках тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі і ў шэрагу з іншымі акцыямі: выставай-аглядам літаратуры "Пісьменнікі планеты — дзецям", інфармацыйнай гадзінай "Выпускаем — чытайце", конкурсам малюнкаў "Мой любімы літаратурны герой", ушанаваннем лепшых чытачоў цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі...

Мікола Панасюк вядомы шырокаму чытачу як пісьменнік-дакументаліст, аўтар шматлікіх кніг публіцыстыкі. "Крык немаўляці" — першае яго паэтычнае выданне, нягледзячы на тое, што вершы пачаў пісаць раней, чым публіцыстыку, яшчэ ў школьныя гады. Пра гэта сведчыць змешчаны на апошніх старонках зборніка расповед пісьменніцы Зінаіды Дудзюк пра паэтычную перапіску 17—18-гадовых Міколы і Яўгеніі Янішчыц...

Алена Дуньковіч — настаўніца Драгічынскай гімназіі. "Твое окно" — першы яе паэтычны зборнік, хаця вершы ўжо доўгі час публікуюцца ў мясцовай і рэспубліканскай перыёдыцы.

У бібліятэчнай "праграме" гэтая прэзентацыя пазначана як "Гадзіна шчырай размовы". Сапраўды, гутарка атрымалася выключна шчырая. Таму, відаць, і "гадзіна" расцягнулася амаль на паўдня.

Анатоль КРЭЙДЗІЧ

ПАЭЗІЯ

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

Ты хочаш свята?..

Ты хочаш свята? Свята навакол,
Калі ты дзень расквечваеш усмешкай,
Калі ты дакранаешся няспешна
Да твару сваёй тонкаю рукой.
Ты хочаш свята? Як сады цвітуць!
І ўжо каштаны запалілі свечкі.
І на зямлю спусціўся майскі вечар,
І верыцца, што мроі ажывуць.
Ты хочаш свята? Свята кожны дзень,
Хаця я ўжо на одум вечаровы
Шукаю песню, і шукаю слова,
Спяшаючы паспець, бо час ідзе.
Ты хочаш свята?
Ля тваёй шчакі
Адчую цеплыню, спагаду, вусціш.
І нешта прашантаць захочуць вусны...
І ты — як бераг новае ракі
Хай будзе свята!

●

Столькі я марыў і столькі шукаў
Песню і долю, і шчасця крыніцу,
Столькі старонак табе напісаў —
Ты не магла не адбыцца.
Ты паўстаеш з летуценняў і сноў,
З паху дажджоў і дыхання дуброваў.
І на расстайных сцяжынах гадоў
Ты — маё лепшае слова.

●

Са смуткам пагляджу табе я ўслед.
Твой сілуэт мільгне ў святле аконным.
І ўжо з табою, з новым рухам кожным
Знікае намі створаны сусвет,
Дзе я ў ім — толькі стомлены мінак.
І ў гэтым руху колаў і стагоддзяў
Мы існасць у сабе ізноў знаходзім.
Нібы кахання патаемны знак.

●

За кожны рух тваіх жаданых рук,
За водар валасоў, што пахнуць ветрам.
За маладосць тваю, вясну і лета,
За ціхі вечар, светлую зару
Я ўдзячны лёсу. І з надзеяй зноў
Чакаю, як вады тлыток гаючы,
Нібы здзяйсненне запаветных слоў,
Нібы ад шчасця адшуканы ключык —
Табою блаславёнае святло.
А думалася, што жыццё прайшло.

●

Чырвоную ружу табе я прынёс.
Як споведзь, як згадку,
як знойдзены лёс.
Пялёсткаў пяшчотных заззяла святло,
І ціхае свята над намі ўзышло.
Каб толькі не звяла!, —
я ў неба прасіў.
І плыў паўзабыты над намі матыў.
А кветка ірдзела. І сэрца біццё
Давала надзеі. Давала жыццё.

●

Чаму ты ўсё-такі прыйшла?
Я не хацеў цябе прыдумаць.
Але ты ёсць. І ў свеце тлумным
Крыху паболела святла.
Крыху паболела надзей

Анатоль ЗЭКАЎ

Лісты да цябе

●

Я мог бы
пачаць жыццё спачатку
хіба што з адной умовай:
зноў сустрэць
у ім цябе.

●

Вясна.
Лета.
Восень.
Зіма.
Змяняюцца часіны года.
Толькі адна ты,
мая каханая,
застаешся
для мяне
нязменна
вясной,
летам,
восенню
і зімой.

●

Жадаю,
каб часцей
сустракаліся
нашы вочы,
вусны,
рукі,
каб ніводная клетачка
майго цела
не абмінула
ніводную тваю.

●

Мае маўклівыя вусны
могуць сказаць
нашмат болей,
чым словы.

Дазволь мне
памаўчаць
каля цябе,
любая.

●

Жыццё ляціць
так імкліва!
Я нават баюся,
што не паспею
сказаць табе:
"Будзь маёй!"

●

Калі б гэта было магчыма,
я не выпусціў бы цябе
з абдымкаў сваіх
да скону жыцця.

Эх, як бы я пры гэтым
хацеў жыць доўга!

●

Я мог бы
здрадзіць табе,
каб пераканацца,
што ты лепшая.

Але навошта,
калі я і так
ведаю гэта.

●

Я ніколі
не здраджваў табе
нават у сне.
Ды калі б я і хацеў,
гэта немагчыма,
бо і ў сне
ты заўсёды
побач са мной.

Мікола ШАБОВІЧ

Развітанне з Ненаглядкай

●

Твае вочы — два возеры Ласкі —
Хай ніколі нікім не сурочацца.
Запрасіла ў цудоўную казку —
Мне адтуль і вяртацца не хочацца.

Ты чаруеш, хоць ты не вядзьмарка,
Ты — высокага неба абранніца.
Бы ў сухмень на залётную хмарку,
На цябе мне маліцца да раніцы...

Ты так блізка і гэтак далёка.
Толькі мары віруюць салодкія.
Даплысці да цябе, светлавокай,
Ці знайду хоць адзіную лодку я?

●

Твой профіль бачыцца ў акне.
Які цудоўны вечар гэты!
І адгадаць няпроста мне,
Што на дварэ: зіма ці лета?

Прашу: усмешку падары,
Але чамусьці вусны сцяты,
І толькі зоркі-ліхтары
Ліюць святло сваё зацята...

●

Яшчэ на твары ні маршчынкі,
Яшчэ так любіш ты сваволіць.
Грудзей дзве зоркі-журавінкі
Завуць журбу сваю спатоліць.

Здаецца, сэрца замірае,
Каб не спалохаць незнароку
Гармонію, што ў свет ступае
Нясмелым крокам.

●

Не грэюць сэрца зорныя агні,
Калі надзеі адбірае скруха.
Сягоння ты не фея дабрыні,
Сягоння ты — вядзьмарка-завіруха.

Лясоўнай ходзіш ля начных прысад,
Ля голых дрэў гарэзліва царуеш,
І нараджаеш страсці снегапад,
І белатой грудзей сваіх чаруеш...

●

Яшчэ агонь надзеі не патух,
Але на вуснах спее навальніца.
Дазволь на развітанне кожны рух
Уславіць твой і смехам прычасціцца.

І прычасціцца лёгкасцю рукі,
Што за сабой вядзе мяне імкліва
Між бліскавіц праз золь і скразнякі
Туды, дзе месяц свеціць мігатлівы...

Пакуль агонь надзеі не патух,
Агонь надзеі на тваё каханне,
Мне пажадай: "Да новых завірух!",
Бо ў завірухі ёсць вясны дыханне.

●

Ты не мая, і я цяпер нічый.
Палоску лета ззалаціла восень,
І толькі сонца нейк з-за аблачын
Глядзіць на нас і прабачэння просіць.

●

Ад'язджаеш — нібы адлятаеш.
Так раптоўна, як восеньскі дзень,
Ты няўмольна кудысьці знікаеш.
Твой у цемры хаваецца цень...

Так заведзена, пэўна, ад Бога:
Паасобку нам вершы складаць.
"Хай жа будзе шчаслівай дарога!" —
Толькі й змог я табе пажадаць.

●

Прыстань віцінаў[1]

Хіліцца вечар за гаем.
Месяц, ярчэй пасвяці нам!
Пойдзем, мая дарагая,
Пойдзем на прыстань віцінаў.

Дзе салаўі нам спявалі,
Дзе каласілася збожжа.
Помніш, як мы пачыналі
Першае падарожжа?

Як нашы мары луналі
І не знаходзілі схову?..
Клікалі ў дзіўныя далі
Шчырыя, светлыя словы...

Хіліцца вечар за гаем.
Месяц, ярчэй пасвяці нам!
Пойдзем, мая дарагая,
Пойдзем на прыстань віцінаў.

[1] *Назва верша запазычана ў Яўгена Хвалея*

І мар, узвышана-крылатых,
Бо сэрца пажадала
На новы век. На новы дзень.

●

Я песню табе прасняваю,
Я словы табе прашапчу.
Што будзе праз момант, не знаю.
А можа, і знаць не хачу.
Былі б толькі чыстыя гукі,
Падману б у іх не было,
Каб толькі прыносілі рукі
Пяшчоту, адхлапне, святло.

●

Падаць руку і затрымаць, пакуль
Не перадасца стоенае нешта...
Я за табою дні спалю дарэшты —
Сваю тугу тваёю знаку.

Як дзве душы, так дзве самоты зноў
Пазнаюцца і затрымцяць нясмела,
Нібы які разрад між грэшных целаў
Імгненнаю маланкаю прайшоў.

Адчую тонкіх пальцаў халадок
І адпушчу, бы птушку з клеткі цеснай.
Хаця шкада: была б такая песня!..
А так — адзіны усяго радок.

●

Калі б раптам
ты сказала,
што адпускаеш мяне
на волю
і жадаеш,
каб я
быў шчаслівы
з іншай,
я б хацеў,
каб той іншай
была
зноў-такі ты.

●

Калі б мяне
прымусілі
завесці гарэм,
у якім
была б і ты,
то я не ведаю,
што б у ім
рабілі астатнія.

●

Упершыню
сустрэўшы цябе,
я так зайздросціў
тым хлапчукам,
што хадзілі з табой
яшчэ ў дзіцячы садок.

Цікава:
а ці зайздросцяць цяпер
яны мне?

Фота А. КАЛЯДЫ

ВІНШУЕМ!

ПРАКЛЁН

Міхась ГЕРЧЫК

Прапаную чытачам «ЛіМа» раздзел з новага рамана «Зброя для забойцы». Нягледзячы на дэтэктыўную назву, гэта не дэтэктыў, хаця ёсць у ім і забойца, і незвычайная зброя — капсула радыёактыўнага кобальту, і ахвяра, і следства... Але галоўнае ў рамане — гісторыя стварэння аднаго з першых у Беларусі камерцыйных выдавецтваў. Шалёныя грошы, якія на пачатку дзевяностых гадоў абрынуліся на галовы яго стваральнікаў, ператварылі сяброў — дырэктара «Афрадзіты» Пашкевіча і галоўнага рэдактара Шаўчука — у непрымірымых ворагаў. Нечакана для сябе ўдзельнікам гэтай барацьбы стаў загадчык сховішча радыёактыўных матэрыялаў анкалагічнага інстытута Алег Каласёнак. Даведзены да адчаю цяжкай хваробай адзінага сына, якого можа выратаваць толькі тэрміновая аперацыя ў Германіі, дзесяць тысяч даляраў, Алег «пазычыў» капсулу смяротнай атруты і аддаў яе «напракат» выпадковаму знаёмаму Шаўчуку. Праз тыдзень капсула павінна вярнуцца ў сховішча. Ніхто пра гэта не даведаецца, а сын будзе ўратаваны.

Аднак здарылася непрадбачанае...

АЎТАР

У той няшчасны дзень ніякія прадчуванні не трывожылі Асю Каласёнак. Скончыўшы работу, яна пабегла ў садок забраць Міцю. Прывяла малога дадому, накарміла. Каб хутчэй праляцеў час, пакуль вернецца Алег, пайшла на кухню мыць халадзільнік.

За акном шалела завіруха, вецер хістаў вершаліны дрэў. Алег даўно павінен быў прыехаць. Праўда, ён казаў, што ў чатыры ў горадзе яму прызначыў сустрэчу нейкі чалавек, але ж прайшло ўжо шмат часу. Затрымацца ў Валоўшчыне, у бацькоў, ён не мог, патэлефанаваў бы; ці доўга двум мужыкам закалоць і разабраць кабанчыка. Але дарога сёння, відаць, зусім кепская — пад снегам лёд, як шкло. А ў Алега машына старая, колы "лысыя". Усё збіраўся новыя купіць, ды Міцева хвароба паставіла крыж на ягоных планах... Наогул, добра, што ён да бацькоў выбраўся: мяса кавалак прывязе, сала, яшчэ сёе-тое. Ніна Аўдзееўна, як звычайна, добрую торбу наладкуе — і масла пакладзе, і смятаны, і яблыкаў, і слоік празрыстага ліпавага мёду для ўнука... Халадзільнік вунь зусім пусты. Ася кожную лішнюю капейчыну нясе ў абменны пункт, каб яшчэ хоць некалькі даляраў адкласці сыну на аперацыю.

Наогул, Ася ўжо даўно сама магла б патэлефанаваць у Валоўшчыну і даведацца, выехаў Алег ці не — у ягоных бацькоў, адзіных у вёсцы, быў хатні тэлефон. Паставілі яго яшчэ тады, калі Мікола Пятровіч — трактарыст і камбайнер, Герой сацыялістычнай працы, стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Ды Ася не хацела хваляваць старых —вельмі яны былі кволыя. Смерць старэйшага сына, Васіля, падкасіла абодвух: Мікола Пятровіч два месяцы праляжаў у бальніцы з інфарктам, а Ніна Аўдзееўна дык амаль зусім аслепла ад слёз, кіёчкам намацвае дарогу. Васіль быў маёрам, ваяваў у Афганістане, там і загінуў. Гады за два да гэтага яго пакінула жонка: з'ехала з дачкой і нейкім прыблудам з Барысава, дзе Васіль служыў, кудысьці ў Сібір, вось і прывезлі цынкавую труну да бацькоў у Валоўшчыну.

Пра Васіля Ася ведала толькі па ўспамінах мужа ды фотакартках у вялікай зашклёнай рамцы, што вісела ў старых на сцяне. Са здымкаў, сарамяжліва пасміхаючыся, глядзеў то цыбаты белагаловы хлапчук у накінутым на плечы бацькавым пінжаку, абвешаным ордэнамі і медалямі, як навагодняя ёлка цацкамі, то хударлявы курсант, зашпілены на ўсе гузікі, то бравы лейтэнант у новенькім кіцелі з бліскучымі гузікамі, то капітан з чатырма зорачкамі на пагонах і ўжо ўласнымі — не бацькавымі — медалямі.

Алег часта ўспамінаў старэйшага брата і сумаваў па ім. Асабліва прыкра і яму, і маці з бацькам было, што не давялося нават развітацца з Васілём па-людску: «Груз-200» прывезлі ў запаянай цынкавай труне, і суровы палкоўнік з ваенкамата адчыніць яе не дазволіў.

Кожны год, вясной — на Радуніцу, восенню — на Дзяды, яны ўсёй сям'ёй хадзілі на могілкі. Прыносілі кветкі, прыбіраліся. Помнік Васілю заказваў ваенкамат, там гэта справа, відаць, была наладжана, ніхто нават не параіўся з бацькамі, якім яму быць. Вялізны, пампезны, з чырвонага граніту, з бронзавым барэльефам — ён быў адзін такі на гэтых бедных вясковых могілках з перакошанымі драўлянымі і жалезнымі крыжамі, сціплымі помнічкамі з штучнага мармуру, — нетутэйшы, недарэчна чужы.

Ася выцерла халадзільнік і зазірнула ў пакой. Міця ляжаў на дыване і гуляў з алавянымі салдацікамі. Ён быў белагаловы, як бацька, яе адзіны сынок, але такі маленькі, бездапаможны, смяротна хворы...За што, Госпадзі?! Ну, калі мы вінаватыя перад табой, — і пакараў бы нас, а дзіцятка — за што? — крычала яе адчайная душа.

Міця падняў галаву, убачыў яе ў прыадчыненых на кухню дзвярах і квола ўсміхнуўся.

— А дзе тата?

— Хутка прыедзе.

— Можна, я яшчэ пагуляю.

— Гуляй, сыночак, гуляй.

Зусім яшчэ нядаўна, які год таму, шустры і рухавы, як кропелька ртуці, Міця і хвілінкі не мог выседзець спакойна. За гэты час ён змяніўся непазнавальна. Нават дарога ў садок, якую Міця прабягаў упадскок за пяць хвілін, цяпер была для яго доўгай і цяжкай. Ён задыхаўся, у яго сінелі вусны, і Асі даводзілася браць вялікага ўжо хлапчука на рукі.

Сынава хвароба знясіліла яе, трымала ў пастаяннай трывозе. Бачыць, як з малога па кропельцы выходзіць жыццё і адчуваць сваю бездапаможнасць, немагчымасць нешта змяніць, было невыносна. Днём і ноччу яе свідравала адзіная думка: дзе ўзяць грошы на аперацыю? Жорсткая несправядлівасць жыцця душыла яе — усё ў гэтым свеце належыць багатым! А калі так, дык няхай бы яны і іхнія дзеці і хварэлі. Чаму жыццё яе дзіцяці павінна залежаць ад грошай? Ну, няма ў іх гэтых клятых даляраў, няма.

Ну, былі б яны з Алегам п'яніцамі, пустадомкамі, гультаямі, — з адчаем думала Ася. Але ж абодва працуюць, як чорныя валы, а зарабіць адзінаму сыночку на аперацыю, без якой малы асуджаны на смерць, не могуць. Як жыць, ведаючы, што кожны дзень адбірае ў цябе тваю радасць, тваё шчасце?! Не робяць у нас такіх аперацый, вось бяда. У Нямеччыне робяць, а ў нас — не. А чаму, Божухна,чаму? Няўжо нашы хірургі дурнейшыя за нямецкіх? Знаёмая доктарка з дзіцячай паліклінікі, якая даглядала Міцю, крычала, што таленавітых хірургаў у нас хапае, ды ўсё ўпіраецца ў тыя ж самыя даляры. Вельмі дорага каштуюць спецыяльныя інструменты, камп'ютэрныя даследаванні, лекі, абсталяванне.

Праўда, апошнім часам Алег некалькі разоў намякаў Асі, што, магчыма, шэсць тысяч, якіх ім не хапае, неўзабаве ўдасца знайсці. Пра падрабязнасці, як Ася ні распытвала, не казаў. Стаў нервовы, узбуджаны, ноччу падхопліваўся, стаяў над Міцевай канапай, папраўляў на ім коўдру, прыслухоўваўся, як той дыхае. Ася рабіла выгляд, што спіць, а ў самой ад болю сціскалася сэрца. Яна разумела: страціць Міцю — страціць і Алега. Ён чалавек добры, чулы, пяшчотны, але слабы, бесхарактарны. Не стане, барані Божа, маленькага, старэйшы або сап'ецца, або з іхняга дзевятага паверха выкінецца. Усё яго жыццё дзеля сына.

Ася зірнула на гадзіннік. Божа літасцівы, ужо дзевяць, а Алега няма. Упершыню за ўвесь дзень грудзі апёк халадок трывогі — нешта здарылася.

Яна клала Міцю спаць, калі ў дзверы пазванілі. У Алега быў свой ключ, Ася адразу ж зразумела, што гэта не ён.

— Хто там? — спытала яна, адчыніўшы дзверы на даўжыню ланцужка.

— Міліцыя, — адказаў малады звонкі голас, і Ася ўбачыла праз шчыліну чырвоненькае пасведчанне. — Участковы ўпаўнаважаны лейтэнант Горцаў.

Слаба войкнуўшы, Ася паправіла валасы пад хусцінкай і зняла ланцужок. На пляцоўцы, абтрасаючы з шыняля наліплы снег, стаяў зусім маладзенькі — хлапчук хлапчуком! — чырванашчокі міліцыянер.

— Дазвольце ўвайсці. Гэта кватэра Алега Мікалаевіча Каласёнка?

Яна кіўнула — ад хвалявання адняло мову.

— Гэта ваш муж? Дзе ён?

— Раніцай паехаў да бацькоў у вёску. Я яго ўжо даўно чакаю. А што здарылася?

— На машыне паехаў? А ў вас якая машына? «масквіч"? — Лейтэнант зрабіў выгляд, што не пачуў пытання.

— Так, «масквіч». Што з Алегам?

— Прабачце, а нумар машыны вы памятаеце?

Ася назвала.

— Усё, лейтэнант, хопіць... Аварыя?

Міліцыянер шумна ўздыхнуў і адвёў вочы.

— Даруйце, але ў мяне дрэнныя весткі. Аварыя, і вельмі цяжкая. Лепш бы ён у такое надвор'е сядзеў дома.

—Раніцай было нармальнае надвор'е, хто ж мог ведаць... Што з ім? Ён паранены? У бальніцы? Ды гаварыце, не маўчыце. У якой ён бальніцы.

Лейтэнант перамінаўся з нагі на нагу, камячыў у руках сваю шапку.

— Не трэба вам нікуды ехаць... — нарэшце вымавіў ён, і ў голасе яго адчуваліся спагада і горыч. — Вельмі цяжкая аварыя была, ён на вялізнай хуткасці ў бензавоз урэзаўся. Там такі пажар быў...

Лейтэнант падхапіў непрытомную Асю на рукі, аднёс у пакой, паклаў на ложак. Прынёс з кухні вады, папырскаў у твар. Ася ачуняла. На канапе тоненька заплакаў перапалоханы Міця, яна падышла, узяла сына на рукі, прыціснула да грудзей. Здавалася, яна акамянела — ні слязінкі, ні слова...

Лейтэнант патаптаўся, з жалем паглядзеў на чорныя сляды, якія пакінулі яго боты, і кашлянуў у кулак.

— Мяне прыслалі праверыць, гаспадар быў за рулём ці хто іншы. Даруйце, такая служба...

Ён выйшаў, асцярожна зачыніўшы за сабой дзверы.

— Мама, мне баліць, не прыціскай мяне так, — сказаў Міця. — А дзе тата?

— Няма ў нас больш таты, сынок, — задыхана прамовіла Ася, апусціла сына на ложак, упала, як падкошаная, побач і нема закрычала ад болю, што працяў яе.

●

Толькі праз тыдзень старому Каласёнку дазволілі забраць з гарадскога морга тое, што засталося ад ягонага малодшага сына. А перад гэтым была яшчэ жахлівая працэдура апазнання. Следчы прывёз яго ў морг, завёў у маленькі пакой. Там на стале, абабітым цынкавай бляхай, ляжала *нешта*, накрытае прасціною.

Адчуваючы, як трымціць хворае сэрца, Мікола Паўлавіч нахіліўся над сталом. Адхінуў покрыўку, убачыў непазнавальны, чорны, як галавешка, да касцей абгарэлы твар з праваламі-ямінамі замест вачэй — і адчуў, як ад жаху заварушыліся на галаве валасы.— Я ж вам гаварыў: нічога не чапайце, —незадаволена кінуў ён. — Гадзіннік пазналі? І наколку? Тады падпішыце паперы і хадземце, больш тут няма чаго рабіць. Мая вам парада: будзеце хаваць, труну не адчыняйце.

Стары Каласёнак зразумеў — і другога сына, малодшага, давядзецца хаваць у забітай цвікамі труне, бо на тое, што ён убачыў, глядзець жывым людзям ніяк не выпадала. Значыцца, і з Алегам ні маці, ні жонцы з сынам, ні суседзям не давядзецца развітацца па хрысціянскім звычаі. Няхай запомняць не абгарэлае, не пашкамутанае на кавалкі цела, а вясёлага белагаловага хлопца...

Жоўты, з чорнай паласой аўтобус, які вёз Алега ў Валоўшчыну у апошні шлях, павольна поўз па абледзянелай дарозе. Стары Каласёнак панура сядзеў на бакавым сядзенні, абапіраючыся на свой кій, і час ад часу пазіраў з-пад сівых касматых броваў то на нешматлікіх Алегавых сяброў, то на нявестку, якая як самлела над труной, то на ўнука, захутанага зверху па футры ў пуховую хустку. Сінія вусны малога і чорныя кругі пад сінімі заплаканымі вочкамі гаварылі дзеду, што той ужо не жылец на гэтым свеце, калі не здарыцца цуд. А з ім абарвецца апошняя нітачка, на якой трымаецца ўвесь Каласёнкаўскі род.

«Бог доўга прымяраецца, ды балюча б'е», —прыгадаў ён прарочыя словы былой суседкі Сычыхі. Ды ўжо ж куды больш балюча... Калісьці, цэлае жыццё таму, калі ён яшчэ быў падлеткам, Сычыха пракаркала іх над вогнішчам, якое ён, Мікола, першы валоўшчынскі камсамолец, разам са сваімі сябрукамі Федзькам і Янкам распаліў са старых абразоў, кніг і іншай непатрэбшчыны, што перашкаджала ім зрабіць у вясковай царкве маладзёжны клуб. Ідэю хлопцам падказалі ў райкаме камсамола. Царква пасля арышту папа і пападдзі была зачынена на замок, чаго ж пуставаць такому памяшканню! Ноччу яны зламалі замок, вывалаклі ўсё на паляну ў недалёкі лес і падпалілі. Сухое прасмаленае дрэва гарэла ярка і бяздымна, пырскаючы ў цёмнае неба святочным салютам іскраў, а яны скакалі вакол вогнішча, як дзікуны, і нешта крычалі, каб прыхаваць свой страх, падсвядомае адчуванне, што робяць нешта кепскае, непатрэбнае, нялюдскае. Тут на іх і набрыла старая Сычыха, якая шукала сваю козачку.

(Заканчэнне на стар. 12)

Дзеці павінны быць шчаслівымі

Залатымі літарамі ў гісторыю сусветнай мастацкай літаратуры ўпісана імя знакамітай, цудоўнай жанчыны, вялікай шведскай пісьменніцы Астрыд Ліндгрэн, якая ўсё сваё жыццё і творчасць прысвяціла дзецям. Яна лічыла, што дзеці павінны быць шчаслівымі, радавацца жыццю, не мець недахопу ў бацькоўскай любові і пяшчоце. Сапраўдная абаронца дзяцінства, Ліндгрэн нязменна, і ў жыцці, і ў творах, вучыла бачыць у дзіцяці асобу, паважаць і ахоўваць яго правы.

Менавіта гэтай незвычайнай жанчыне, якая, на жаль, нядаўна пайшла з жыцця, і быў прысвечаны паказ спектакля "Міа, мой Міа!.." па матывах аднайменнай казкі Астрыд Ліндгрэн, які адбыўся 31 сакавіка ў Магілёўскім абласным тэатры лялек. Больш за 8 гадоў назад Алег Жугжда злучыў бязмерную любоў і пяшчоту сэрца шведскай казачніцы, якое балела за кожнае абяздоленае дзіця на Зямлі, са сваім рэжысёрскім талентам і ажыццявіў пастаноўку гэтага спектакля, які лічыцца адным з лепшых у тэатры. Як ніякі іншы, ён прыдатны для сямейнага прагляду і ўжо шмат гадоў прымушае дзяцей і дарослых хвалявацца за галоўнага героя, маленькага хлопчыка-сірату, якога ўзялі з дзіцячага прытулка. Гледачы жадаюць яму перамогі над злосным Рыцарам і задумваюцца пра неабходнасць міру як на Зямлі, так і ва ўласнай сям'і.

Таццяна ДОЛЬНІКАВА,

педагог тэатра

"Кім" — у народным тэатры

Падчас наведвання Рагачоўшчыны, дзе ладзілася ўрачыстае адкрыццё бюста народнага пісьменніка Беларусі Андрэя Макаёнка, знакаміты драматург Аляксей Дудараў зрабіў падарунак мясцоваму народнаму тэатру — перадаў для пастаноўкі сваю п'есу "Кім". Нарэшце адбылася прэм'ера спектакля, які ўжо ідзе на сцэнах сталічнага Купалаўскага, магілёўскага і маладзечанскага тэатраў. Пастаноўкай "Кіма" ў Рагачове займаўся рэжысёр народнага тэатра гарадскога Дома культуры Аляксей Сількевіч. Спектакль спадабаўся гледачам і зараз з поспехам ідзе ў многіх сельскіх Дамах культуры.

Міхась СЛІВА

Куцюр'е чакаюць узлёту

Адзінаццаты міжнародны конкурс мадэльераў-дызайнераў і рэспубліканскі конкурс агенцтваў мадэляў, які па традыцыі праходзіў у Віцебску, назваў новыя імёны сярод лепшых беларускіх куцюр'е. У конкурсе, дарэчы, прынялі ўдзел больш за сто мадэльераў з розных гарадоў Беларусі, лаўрэатамі сталі 16.

У намінацыі "прамысловае мадэліраванне" першую прэмію атрымала мастачка з Гомеля Алена Шыловіч (за калекцыю мужчынскага адзення). Пінчанкі Наталля Кандыбіна і Ірына Палхоўская вызначыліся ў намінацыі "клас-клуб", прадставіўшы адзенне для дзяцей і падлеткаў. Плённым стаў фестываль і для віцебскіх дызайнераў. Людміла Каваль з работай "Частка цябе" атрымала запрашэнне ад старшыні журы, вядомага мадэльера расійскага канцэрна "Панінтэр" і кампаніі "Бос Бізон" У. Зубца на ўдзел у фестывалі моды "Рускі сілуэт".

Высока ацанілі работы нашых мадэльераў і замежныя госці з Польшчы і Германіі. Віцэ-прэзідэнт нямецкага Саюза дызайнераў моды і тэкстылю Дзмітрый Мецлер заўважыў, што многія мадэлі маглі б упрыгожыць любы еўрапейскі подыум, але ім патрэбна добрая рэклама і грошы.

Святлана ГУК

г. Віцебск

МУЗЫКА

Знайсці прызванне ў хоры

У кожнай класічнай аперэце ўдзельнічае хор. Са з'яўленнем новых жанраў — мюзікла, эстраднага шоу — яго роля ў спектаклях значна ўзрасла. У сёлетняй прэм'еры Дзяржаўнага музычнага тэатра Беларусі "Галактыка кахання" хор увогуле знаходзіцца ў цэнтры ўвагі гледачоў. Ён працуе на сцэне больш за ўсіх іншых выканаўцаў.

Наша размова з галоўным хормайстрам Святланай ПЯТРОВАЙ пра тое, што ўяўляе сабой сёння хор папулярнага музычнага тэатра краіны, у якім ён творчым стане, ці можа спаборнічаць са славутым хорам Нацыянальнага тэатра оперы Беларусі.

— Перад хорам паўсталі больш разнапланавыя задачы. Цяпер у нашым рэпертуары болей жанраў, чым было раней. Калі раней мы працавалі, у асноўным, над аперэтай, то сёння — і над эстраднымі шоу, і над тэматычнымі канцэртамі — напрыклад, паводле твораў Дунаеўскага. Да оперы яшчэ справа не дайшла, але, думаю, з часам і гэта будзе для нас актуальна.

— Так, у Музычным тэатры можна ставіць не толькі музычную камедыю, але і музычную драму. У чым тут адрозненне функцый хору?

— У музычнай камедыі, на мой погляд, функцыі хору больш шырокія. Існаванне хору на сцэне опернага тэатра даволі статычнае. Галоўная яго задача — выйсці і дакладна, яскрава выканаць партыю. Наш хор, бадай, больш удзельнічае непасрэдна ў сцэнічным дзеянні. З гэтай прычыны ёсць нават пэўнае абмежаванне ўзросту пры прыёме ў наш калектыў. Харысты павінны мець здольнасць добра рухацца, быць дынамічнымі на сцэне, асабліва ў мюзікле. У некаторых замежных краінах увогуле няма падзелу на хор і балет у сучасных музычных тэатрах. Калі артыст прыходзіць уладкоўвацца на працу, ён спявае і танцуе.

... Рэпетыцыя хору перад вячэрнім спектаклем. Прасторная зала цокальнага паверха задрапіраваная чырвонай тканінай. На вокнах — белыя жалюзі. У цэнтры залы — чорны раяль, які, напэўна, шмат "пабачыў" на сваім вяку. За ім — трох 'ярусны подыум. Верхні рад займаюць мужчыны. Два ніжнія належаць цудоўнай палове хору.

"Дили-дили-дили-дили-ди-ли", — гучна, на "фортэ", спявае хор знакамітую мелодыю Дунаеўскага, — Дили-дили-дили-дили-бом! Мы ли в шторм и штили не ходили..."

"Стоп! — пляскае ў далоні Святлана Пятрова. — Паўторым у голас: "Мы ли в шторм и штили не ходили!"

Хор [illegible] для вымаўлення фразу...

— А хор мае сёння ўсе неабходныя магчымасці? Ён цалкам укамплектаваны? Які прафесійны ўзровень харыстаў?

— Не магу сказаць, што хор укамплектаваны так, як патрабуецца. Не хапае мужчынскіх галасоў, а таксама жаночых — альтовай групы. Камплектаваць хор сёння даволі складана. Некаторыя таленавітыя харысты сыходзяць у оперны тэатр. Мне, вядома, прыемна, што ад нас ідуць "не куды-небудзь", а ў оперны, але... Увогуле, я зрабіла б два склады хору, каб пашырыць яго магчымасці, у тым ліку за кошт канцэртнай дзейнасці.

Хор Музычнага тэатра існуе ўжо 30 гадоў. Доўгі час ім кіравала таленавіты прафесійнік, сапраўдны майстар сваёй справы Нэла Андросава. З першых гадоў дзейнасці хору па сёння ў ім спяваюць артысты старэйшага пакалення: Л. Казючыц, З. Мінгалёва, М. Шэляпіна, Л. Емяльянава, Ф. Міркіна, І. Літвін, М. Дубарэзаў, М. Куршацоў, В. Шэйпа.

— З якіх навучальных устаноў, у асноўным, прыходзяць у ваш хор?

— Да нас "прыходзіць" Мінскае музычнае вучылішча, як вакальнае аддзяленне, так і харавога дырыжыравання. Універсітэт культуры таксама рыхтуе для нас кадры. З Акадэміі музыкі ёсць выпускнікі. Хацелася б, каб болей прыходзіла моладзі з вакальнай адукацыяй. Але гэта ў значнай ступені залежыць ад нашых заробкаў...

— Сёй-той кажа, што харыст — гэта вакаліст, які не знайшоў сябе ў ролі саліста. Гэта так? Ці спяваць у хоры — таксама прызванне?

— Думаю, нельга казаць пра харыстаў — маўляў, яны "не дацягнулі" да салістаў. Так, некаторыя з іх сапраўды прыходзяць у хор з марай выйсці ў салісты. Але не ўсе робяцца салістамі. І зусім не таму, што ў іх не хапае таленту. Яны знаходзяць сваё прызванне ў харавым мастацтве. Уменне адчуваць ансамбль, знаходзіць аптымальнае гучанне голасу, каб не "вытыркаць" яго, — не кожны саліст на гэта здольны.

— У многіх харыстаў — акадэмічная адукацыя. А ў музычным тэатры ім даводзіцца удзельнічаць у праектах накшталт папулярнага шоу. Як яны да гэтага ставяцца?

— Па-рознаму. Але ў прынцыпе, жанр шоу для нас новы, а ўсё новае — цікава. Для мяне самой было цікава паспрабаваць свае сілы ў новым жанры: што з гэтага атрымаецца. Я лічу, што хор дастаткова хутка злавіў сутнасць эстраднай манеры. Вы маглі гэта адчуць нават сёння, на рэпетыцыі, калі мы выконвалі Дунаеўскага. Цяпер назіраецца тэндэнцыя амаль кожны канцэрт ператвараць у відовішча з элементамі шоу. Возьмем, для прыкладу, канцэрты Павароці, Карэраса, Дамінга: на сцэне амаль заўсёды прысутнічае хор, прычым, вялікі хор! Стваральнікі канцэрта выкарыстоўваюць усе сродкі, каб прыцягнуць увагу гледачоў да таго, што адбываецца на сцэне. У такіх шоу для хору вызначана вельмі важнае месца. Бо хор узбагачае і гучанне голасу саліста.

— Часта харыстам даводзіцца выступаць у ролі артыстаў, быць у цэнтры ўвагі публікі, удзельнічаць у сцэнічным дзеянні, крыху іграць. Гэта ўплывае на якасць выканання?

— Для мяне, вядома, важна, каб у першую чаргу хор гучаў чыста, дакладна. Ды сцэнічныя задачы ў харыстаў бываюць даволі складаныя. Мы не стаім на сцэне нерухома. Так, напрыклад, у адным са спектакляў хор з'яўляецца з-пад вялізнай, метраў у дзесяць, коўдры. Спачатку харысты ляжаць пад коўдрай, потым самі з сябе яе сцягваюць, падымаюцца ўсім табарам і адразу ўступаюць у тон. Гэта адбываецца пасля таго, як яны дзесяць хвілін дыхалі пад коўдрай. А ў іншай пастаноўцы мы стаім... спінай да дырыжора.

Клас!.. У Гродне

У Гродзенскім музычным вучылішчы адбыўся дзівосны святочны канцэрт, прысвечаны 70-годдзю Беларускай акадэміі музыкі. У ім удзельнічалі студэнты класа дацэнта кафедры спеваў, заслужанай артысткі Беларусі Людмілы Колас.

У недалёкім мінулым Л. Колас — бліскучая прыма Вялікага тэатра Беларусі. Цудоўны голас вялікага дыяпазону дазваляў ёй звяртацца да самых розных твораў і опернага, і камернага жанраў. Колькі дзівосных вобразаў створана ёю не толькі на сцэне беларускага опернага, а і ў іншых знакамітых тэатрах свету! Яна прайшла сур'ёзную стажыроўку ў "Ла Скала", дзе яе творчымі кіраўнікамі былі выдатная спявачка Джульета Семіяната і маэстра Сільвестры. Цудоўнае спалучэнне вакальнага дару і артыстызму зрабіла Людмілу Колас сапраўднай прымадоннай тэатра. Асобна можна распавесці пра яе паспяховы ўдзел у буйных міжнародных конкурсах.

Сёння Людміла Якаўлеўна шчодра дзеліцца сакрэтамі прафесійнага майстэрства са сваімі вучнямі, якія ў сваю чаргу вылучаюцца на прэстыжных вакальных конкурсах. З 16-ці выпускнікоў яе класа дзесяць маюць узнагароды.

Зразумела, не ўсе прыходзяць у клас ужо спанатранымі ў вакальным мастацтве. Аднак педагог з дзівоснай інтуіцыяй умее вызначыць творчы патэнцыял вучня. Адметна, што Людміла Якаўлеўна аднолькава паспяхова працуе з усімі жаночымі галасамі, пачынаючы ад мецца-сапрана да самых крыштальных каларатур і глыбокіх драматычных тэмбраў.

Канцэртная праграма ў Гродне прадставіла яркую, маляўнічую галерэю характараў і тэмбраў. Можна адзначыць высокую якасць выканання і валоданне прафесійнай тэхнікай вакалу ва ўсіх удзельніц імпрэзы, але асабліва прыемна, што кожны твор быў не проста праспяваны, а перажыты, сыграны актрысай. Цудоўна прагучала песенька Пепіты з аперэты І. Дунаеўскага "Вольны вецер" у выкананні Аксаны Кулік. Тэмперамент, яркасць вобраза, уразлівая эмацыйнасць маладой спявачкі дазваляюць гаварыць пра яе несумненную сцэнічную будучыню. Цеплынёй і мяккасцю, шчыра беларускай пяшчотай сагрэла сэрца песня Л. Захлеўнага "Мілавіца" ў выкананні Ганны Стэкавай.

Сярод студэнтаў Л. Колас — наша зямлячка, выпускніца Гродзенскага педагагічнага каледжа Валерыя Рэсіна. Яна займаецца прафесійным вакалам толькі другі год, але ўжо адзначана дыпломам конкурсу "Убельская ластаўка". Яе выхад на сцэну ўразіў звонкім іскрыстым бісерам каларатур, па-дзіцячы гуллівых, прыгожых, гнуткіх.

Надзвычайны драматызм, жарсць і напал пачуццяў выявіла Наталля Александровіч у арыі Ліу з оперы Д. Пучыні Турандот". Сіла голасу, глыбіня тэмбру, цудоўнае валоданне дыяпазонам... Недарэмна яна мае званне дыпламанта Міжнароднага конкурсу "Бурштынавы салавей".

Чалавечы голас — адзіны дасканалы інструмент, здатны дакранацца да самых патаемных струнаў нашай душы. Гэта тое, што нараджаецца з сэрца і ідзе да сэрца,

ІМПРЭЗЫ

Спява-ла-ла-ла-стаўка...

Дзверы канцэртнай залы перад звонкагалосай птушкай чамусьці не расчынілі. Давялося ёй спяваць у фае другога паверха, кажучы інакш — у холе з прыгожай урачыстай назвай "Габеленавая зала Мінскага музычнага вучылішча". У вялікія, нібы шкло акеанарыума, шыбы смаліла бесцырымоннае сонца, ствараючы для канкурсантаў і публікі некамфортныя ўмовы. Дарэчы, і публіка — пераважна студэнты вучылішча — не надта цырымонілася: сноўдала ўверх-уніз, жвава совалася з боку ў бок, падтрымліваючы лёгкі шумавы фон...

Такое было вонкавае ўражанне ад першага тура фестывалю-конкурсу "Убельская ластаўка-2002". А калі глянуць глыбей, прыслухацца?

"Убельская ластаўка", апякунка маладых спеўных талентаў Міншчыны, беларускай вакальнай музыкі, найперш — творчасці нашага земляка С. Манюшкі, не вярнулася б сёлета з выраю, калі б не энтузіязм супрацоўнікаў аддзела культуры Чэрвеньскага райвыканкама, педагогаў Беларускай акадэміі музыкі, сталічнага музычнага вучылішча імя М. Глінкі ды абласной капэлы "Sonorus" з яе мастацкім кіраўніком А. Шутам. Іх супольнымі намаганнямі фестываль-конкурс удалося зладкаваць. Давялося, праўда, абмежавацца адной узроставай групай спаборнікаў, адкрыццё і першы тур правесці ў Мінску, а на Манюшкаву радзіму сабрацца наступным днём, каб прадоўжыць і ўрачыста завяршыць конкурс.

На адкрыцці выступіў намеснік міністра культуры Беларусі В. Гедройц, які адзначыў працу неабыякавых людзей Чэрвеньскай (Ігуменскай) зямлі па ўшанаванні асобы іх выдатнага земляка, папулярызацыі яго творчасці. Між іншым, сёлетняя "Убельская ластаўка" наведалася да мінчукоў у знамянальны час: 150 гадоў таму тут упершыню прагучала опера С. Манюшкі "Сялянка" — твор, знакавы для беларускай нацыянальнай культуры.

Чалец журы, мастацкі кіраўнік "Беларускай Капэлы", старшыня Таварыства аматараў музыкі С. Манюшкі, оперны спявак і педагог В. Скорабагатаў перадаў у дар бібліятэцы Мінскага музычнага вучылішча 25 выданняў, да выпуску якіх спрычынілася аб'яднанне "БК". Тут і нарысы В. Дадзіёмавай пра кампазітараў мінуўшчыны, і зборнік "Царкоўная музыка на Беларусі", укладзены Г. Пікардам, і ноты вакальных твораў, і выданні з серыі "Музыка старажытных сядзібаў", і клавір оперы "Агатка", і манаграфія В. Скорабагатава пра кампазітара Я. Тарасевіча... Усё гэта будзе вывучацца і агучвацца — на занятках у класе, на акадэмічных канцэртах, у адкрытых выступленнях будучых музыкантаў.

Перад пачаткам конкурсу спявалі лаўрэаты "Убельскай ластаўкі" 2000 і 2001 гадоў. Сярод іх — ужо добра вядомы барытон У. Громаў, адметныя маладыя вакалісткі А. Рагоўская, А. Бондарава...

Першы ж сёлетні конкурсны тур паказаў добры ўзровень падрыхтоўкі спевакоў-пачаткоўцаў, а галоўнае — іх прафесійны патэнцыял, развіццё якога можа даць

Не бачым дырыжора — ускладняецца задача для хору. А яшчэ нас любяць ставіць вельмі высока, "пад аблокі"...

— Часам на эстрадзе хор, ці вакальная "група падтрымкі", выконвае важную ролю, калі голас у выканаўцы не вельмі выразны, а хор дапаўняе яго гучанне. У музычным тэатры такая праблема магчымая?

— У прынцыпе, хор і закліканы падыгрываць салістам, суправаджаць іх голас. У нас няма задачы "зацямніць" салістаў; падтрымліваць іх — так. Магу сказаць, што ў нашым хоры ёсць галасы не горшыя, чым у салістаў тэатра. Дый з хору выйшлі многія салісты, напрыклад, Антон Заянчкоўскі, Лідзія Кузьміцкая, пачынаў у нас і Васіль Мінгалёў.

Сама ж Святлана Пятрова скончыла Свярдлоўскую кансерваторыю па класе харавога дырыжыравання. Потым з мужам, таксама музыкантам, пераехалі ў Омск. Ён (цяпер — заслужаны артыст, вядучы барытон Нацыянальнага тэатра оперы Беларусі Уладзімір Пятроў) працаваў у оперным тэатры, яна выкладала харавыя дысцыпліны ў інстытуце культуры. Думала, што ўсё жыццё будзе займацца педагогікай. Мела "свой" студэнцкі хор, абрала свой кірунак навуковай дзейнасці. Але ў Мінску для яе знайшлася праца хормайстра ў Тэатры музкамедыі. Праз некалькі гадоў яна стала галоўным хормайстрам. У наступным годзе адзначыць юбілей — дзесяты сезон у тэатры.

— Што сёння ў планах? Над чым працуе хор?

— Задумваем вялікі творчы вечар хору. Хочацца зрабіць падарунак як для аматараў тэатра, так і для людзей, якія ўсё жыццё прысвяцілі працы ў ім. Хачу, каб людзі адчулі свята. Возьмем рэпертуар мінулых гадоў, разгледзім новы. Запросім салістаў з гучнымі імёнамі. Вопыт працы над канцэртам спатрэбіцца хору ў будучым. Бо гэта вялікі стымул для творчасці.

"Жанчыны могуць ісці грыміравацца, мужчыны застаюцца!" — кажа Святлана Пятрова. Яна дае некалькі заўваг харыстам мужчынскай групы, яшчэ раз праслухоўвае іх нумар. У зале ўсталёўваецца цішыня. Мы пачынаем размаўляць. А па радыётрансляцыі — гучнай сувязі з усімі памяшканнямі тэатра, — абвяшчаюць пачатак спектакля...

Андрэй АХМЕТШЫН

прымушае трапятаць і плакаць, весяліцца і радавацца, ачышчае і пераносіць у свет узвышаны, незямны. Невыпадкова нават выканаўцы-інструменталісты нярэдка звяртаюцца да вакалу. У класе Л. Колас ёсць дзве студэнткі-піяністкі. Кацярына Феакцістава, закончыўшы фартэпіяннае аддзяленне Калінінградскага вучылішча, цяпер удасканальвае сваё вакальнае майстэрства ў Людмілы Якаўлеўны. Таццяна Гаўрылава, дыпламант Міжнароднага вакальнага конкурсу ў Карлавых Варах (Чэхія), закончыла БАМ і магістратуру па класе фартэпіяна, лаўрэат II прэміі конкурсу піяністаў імя Шапэна ў Шафарна (Польшча). Асабліва ярка выступіла Т. Гаўрылава ў ролі Серыны з оперы Дж. Гершвіна "Поргі і Бес", уразіўшы тонкасцю і выразнасцю створанага ёю музычнага вобраза.

Кульмінацыяй канцэрта, яго ўпрыгожаннем сталіся выступленні магістрантаў класа Л. Колас — Дзіны Багданавай, Алены Таболіч і Настассі Масквіной. Яны працуюць ужо як прафесійныя артысткі.

Кіра ЗАРЭЦКАЯ,

навучэнка Гродзенскага дзяржаўнага музычнага вучылішча

выдатныя мастацкія вынікі. Спаборнічалі дзяўчаты і хлопцы ва ўзросце да 23-х гадоў, студэнты музычных вучэльняў, Акадэміі музыкі, педагагічнага універсітэта імя М. Танка. Маладыя спеўныя галасы заўсёды звяртаюць на сябе ўвагу. Асабліва, калі ў іх адчуваецца "прафесійная агранка", натхненне і артыстызм. Так ці іначай, а ўвагу "балельшчыкаў" прыцягвалі каларатурнае сапрана В. Рэсінай, мецца Г. Сакольнік, сапрана Г. Янушкі. Уразіў А. Макарэвіч, з першай вакальнай фразы якога (раманс Дэмана) было зразумела: у яго барытоне — усё "о'кей"!

Журы пад старшынствам прафесара Л. Івашкова прадоўжыла працу наступным днём — у Чэрвеньскім раённым цэнтры культуры, куды прыехалі ўдзельнікі 2-га тура. Лідэрамі "Убельскай ластаўкі-2002" былі названы Алеся Аўдзеева (2-гі курс падрыхтоўчага аддзялення Акадэміі музыкі, клас Т. Ніжнікавай) ды Вячаслаў Лесік (I курс БАМ, клас Л. Івашкова). Лаўрэатаў і дыпламантаў ганаравалі ва ўрачыстай абстаноўцы, а кагосьці і падчас канцэрта, дзе маладых вакалістаў падтрымалі музыканты капэлы "Sonorus", якая, дарэчы, у тыя майскія дні адзначала сваё 10-годдзе.

С. БЕРАСЦЕНЬ

Латнік з адкрытым забралам

Такім у творчасці і жыцці паўстае мастак Віктар Альшэўскі. І не толькі таму, што сярэднявечны латнік зрабіўся апошнім часам асноўным мастацкім вобразам яго жывапісных палотнаў. Рыцар, вобраз галантнага сярэднявечча, дама сэрца, пяшчотная і адначасова халодная лілея... Віктар Альшэўскі захоўвае рыцарскі вобраз і ў жыцці — знешнасцю, паводзінамі, адносінамі да сяброў.

Віктар Альшэўскі — прадстаўнік таго пакалення беларускіх мастакоў, якія смела ўключылі ў кола сваіх інтарэсаў увесь свет, уяўленне пра які Віктар сфарміраваў, калі пражыў год у Нарвегіі, як стыпендыят Міністэрства адукацыі гэтай краіны, падчас сваіх падарожжаў па Італіі, Германіі, Егіпце. Магчыма, гэта так моцна паўздзейнічала на мастака, што тэмамі яго работ сталі зусім не родныя фальклорныя матывы — сам мастак небеспадстаўна лічыць блізкімі беларускаму гледачу і рымскія купалы, і егіпетскія піраміды... Падчас навучання на кафедры манументальнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў маладога мастака навучылі думаць нетрадыцыйна. Гэтым вылучаюцца, дарэчы, многія выпускнікі гэтай кафедры, такі стыль усталёўваў загадчык кафедры Гаўрыла Вашчанка.

Віктару Альшэўскаму заўжды былі даспадобы вялікія палотны, манументальныя вобразы, неперагрувашчаныя дэталямі кампазіцыі. Так, найбольш яркім успамінам дзяцінства Віктар лічыць "чорнага каня", запрэжанага ў святочны вазок для маладых. Ён не памятае, як чорны жарабец уздыбіўся і яго, зусім малога, ледзь выцягнула з-пад капытоў нейкая жанчына. "Заўсёды звяртаю ўвагу на ўздыбленыя постаці коней... — згадвае мастак. — У сёмым класе, калі я быў навучэнцам мастацкай школы, на канікулах намаляваў на ўсю сцяну бацькоўскай хаты сюжэт з рыцарам на ўздыбленым кані. Гэта была, практычна, мая першая вялікая манументальная работа. Думка стварыць вялікае палатно на гэты сюжэт нарадзілася ў дзяцінстве. Гартаў кніжкі, шукаючы адказ на пытанне. Рыцарская тэма была для мяне вызначальнай. Уздыблены конь, паабапал воіны з коп'ямі і мячамі, на другім плане палац на гары. Намаляваў эскіз, пасля разбіў на клетачкі, перанёс на сцяну. Старанна маляваў акварэльнымі фарбамі. У гледачах і крытыках недахопу не было. Праз час па краях карціну аклейвалі новымі шпалерамі, а праз дзесяць год ад яе застаўся кавалачак, памерам з разгорнутую кніжку — галава рыцара і вуха каня".

Віктар Альшэўскі імкнуўся на кожным этапе творчай сталасці дадаць сваім палотнам новую выразнасць. "Мяне не ўсе разумелі, калі я ўводзіў у карціны залачоныя ўстаўкі. А сёння золата можна пабачыць на карцінах многіх мастакоў, якія лічаць гэта сваёй знаходкай. І гэта — нармальна," — кажа Віктар. Творчых эксперыментаў мастака не прыпыняюць ні неразуменне калег, ні крытыка. Сам ён лічыць: шлях кожнай творчай асобы — у штодзённым пошуку. У апошняй жывапіснай серыі "Лісты часу", праца над якой працягваецца ў Альшэўскага ўжо не адзін год, мастак імкнуўся эксперыментаваць ужо не з фігурамі, а з самой прасторай палатна. Віктар Альшэўскі спрабуе стварыць прасторавыя кампазіцыі, выйсці за плоскасць палатна, зразае яго вуглы, дадае зверху храмавыя купалы... Віктар насычае свае карціны сімваламі, галоўным з якіх лічыць таго ж латніка. Акрамя іх стала прыжыліся на палотнах мастака храмы, кветкі...Часта сустракаецца гадзіннік, як сімвал часу і прасторы, птушкі-людзі, кола-калаўрот жыцця, дамы-ракавіны, мудрыя совы. Сабраныя разам, на першы погляд нічым не звязаныя, постаці і рэчы ўспрымаюцца ірэальна, як зашыфраванае пасланне. Выяўленчае мастацтва не можа ўспрымацца павярхоўна, лічыць мастак, а карціна — не простае капіраванне вонкавай формы. Карціна для Альшэўскага была і застаецца сістэмай аналізу, эмацыянальным і разважлівым працэсам падсвядомасці, асацыятыўнага мыслення, абстрагаванасці да гістарычнай памяці. Зрэшты, ключом да ўнутранага сусвету чалавека, раўнавагаю паміж дзіцячай наіўнасцю ўспрымання і дарослай мудрасцю спазнання.

У Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.Масленікава адбылася выстава В.Альшэўскага "Лісты часу", якая стала працягам праекта жывапіснага падарожнага дзённіка мастака. Цікава, што з кожнага падарожжа В.Альшэўскі прывозіць акрамя ўражанняў і замалёвак — падарожныя нататкі. Урыўкі з іх, некалькі яркіх успамінаў дзяцінства былі апублікаваны. Сам мастак не адносіцца да свайго "пісання" залішне ўважліва. Але яны дапамаглі яму выразна зразумець і сфармуляваць канцэпцыю серыі "Лісты часу".

Поўны паказ гэтай серыі мастака і адбыўся ў Магілёўскім музеі. Магілёўская прэса назвала Віктара Альшэўскага другім Сальвадорам Далі. Дарэчы, сюррэалістычнасць твораў мастака адзначалася і на выставе сучаснага беларускага мастацтва ў Цэнтры Кардэна, дзе праходзілі Дні беларускай культуры. Але французскія крытыкі адрознілі беларускі сюррэалізм ад агульнасусветнай накіраванасці з-за яго неагрэсіўнасці. Аднак не толькі гэта прыемнае параўнанне з сусветнавядомым майстрам забяспечыла поспех выставы "Лісты часу" ў Магілёве. Выставу Віктара, што нарадзіўся ў вёсачцы Вугольшчына на Магілёўшчыне, усяго праз рэчку ад родных мясцін класіка пейзажнага жанру Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Магілёў прымаў як вяртанне знакамітага земляка. Магілёўскі музей на працягу сямі год запрашаў В.Альшэўскага прывезці персанальную выставу. Але варта сказаць, што якраз за гэты час не толькі канчаткова сфармулявалася новая прасторавая канцэпцыя мастака, але сапраўднае рэфармаванне перажыў сам музей. Еўрапейскі ўзровень памяшканняў, прафесійнае асвятленне, а галоўнае, магчымасць мастаку свабодна сфармаваць экспазіцыю — такога не дае мастаку зараз ніводная мінская выставачная зала.

Сёння Віктар Альшэўскі выкладае ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, разам з тым ён з гонарам носіць званне сябра Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва. Ён зацікаўлена адгукаецца на новыя выставачныя праекты. Напрыклад, незадоўга да магілёўскай экспазіцыі В.Альшэўскі прыняў удзел у выставе, прысвечанай памяці Бялыніцкага-Бірулі разам з У.Панцялеевым і Л.Журавовіч (усе яны родам з мясцін знакамітага пейзажыста). Да кожнай выставы Віктар шукае фінансавых спонсараў і магчымасць выдаваць каталогі. Ён адносіцца да таго нешматлікага на Беларусі кола людзей творчасці, якія спадзяюцца толькі на сваю актыўнасць і прыцягваюць да супрацоўніцтва прыватныя фірмы і дзяржаўныя прадпрыемствы. Некалькі год з яго дапамогай рыхтуецца для ААТ "Керамін" вялікі перакідны каляндар, дзе кожная старонка прадстаўляе вялікую рэпрадукцыю мастака. У гэтым годзе каляндар прэзентаваў творчасць не толькі В.Альшэўскага, але і сяброў БелАВМ, а таксама падаў мастацтвазнаўчыя звесткі пра іх. Варта сказаць, што каляндар атрымаў вышэйшую ўзнагароду на конкурсе "Мастацтва кнігі".

Як Віктару Альшэўскаму ўдаецца спалучаць творчасць, што патрабуе адзіноты ды цішыні, і грамадскую дзейнасць, на гэта пытанне яму і самому адказаць складана. "Трэба толькі не сядзець, склаўшы рукі, — кажа ён. — Уставаць разам з сонцам, паспяваць папрацаваць у цішыні майстэрні, даводзіць задуманае і абяцанае да канца, сустракацца з людзьмі. І ніколі не апускаць рукі."

Наталля ШАРАНГОВІЧ

У тэатры "Зьніч"

Напрыканцы красавіка адбылася прэзентацыя новых кніг — зборніка вершаў Віктара Шніпа "Інквізіцыя" і зборніка прозы Людмілы Рублеўскай "Старасвецкія міфы горада Б." Арганізатар імпрэзы Галіна Дзягілева сумясціла яе з адкрыццём выставы твораў маладога тэатральнага мастака Меранкова. Выстава, дзе былі прадстаўлены карціны рамантычнага кшталту — гэткая настальгія па XVIII стагоддзі з няспешным жыццём і высокімі пачуццямі, ды яшчэ правінцыйныя краявіды, што знікаюць пад уплывам жорсткай урбанізацыі.

Выстава пэўным чынам настроіла гледачоў перш-наперш на ўспрыманне навелаў кнігі Л. Рублеўскай. Бо ў кнізе дзея адбываецца ў невялікім беларускім горадзе на мяжы XIX—XX стагоддзяў. Не вялікім, але і не маленькім, з усімі атрыбутамі тагачаснай цывілізацыі. Новыя вершы В. Шніпа запомніліся іранічным стаўленнем да шэрагу жыццёвых з'яў. Яны нібыта прапануюць чытачу паглядзець на звыклае з нечаканага гледзішча. Вершы і навелы прадстаўлялі публіцы артысты мінскіх тэатраў. Акрамя таго, выступіў краязнаўца з Маладзечна Міхась Казлоўскі, дзякуючы якому кнігі пабачылі свет, спявалі песні Ірына Лемяшонак і бард з Гомеля Андрэй Мельнікаў і, зразумела, свае творы прачыталі Людміла і Віктар.

Наш кар.

•

20 мая адбылася вечарына барда Аляксандра Вашчанкі, прысвечаная прэзентацыі дэбютнага альбома "Свечка на дажджы". Зборнік складаецца з 16 песень, акрамя аўтарскіх, ёсць песні на вершы Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, Р. Барадуліна. Сам Аляксандр Вашчанка загадчык кафедры народных інструментаў этнаграфічнай школы № 3 з музычна-харавым ухілам. На вечарыне прагучалі песні ў выкананні яго сяброў — Марыны Печурэвіч і Алеся Камоцкага. Паэт Анатоль Вярцінскі з радасцю падзяліўся ўспамінам пра першае знаёмства з гэтым таленавітым чалавекам.

•

27 мая адбыўся паказ літаратурнай кампазіцыі паводле твораў М. Багдановіча "Васількі на снезе" ў выкананні моладзі, якая свой вольны час праводзіць у Лошыцкім парку. Маладых людзей аб'ядноўвае любоў да сваёй нацыянальнай культуры. Яшчэ іх называюць валанцёрамі — студэнты ў вольны час знаходзяць магчымасць папрацаваць у парку, а пасля работы ладзяць незвычайныя канцэрты. На вечарыне ў тэатры — гэта спроба сябе на прафесійнай сцэне, бо кожны з іх піша вершы, песні, прымае ўдзел у розных маладзёжных акцыях. Намеснік дырэктара парка Яўген Рыгоравіч Церахаў падтрымаў ідэю такога незвычайнага аб'яднання, якое да сёння не мае назвы і трымаецца толькі на маладым энтузіязме.

Г. СПАСКАЯ

Штукары з "Мар'інай скарбніцы"

33 майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з Пухавіцкага раёна, якія аб'яднаны ў клуб "Мар'іна скарбніца", прадставілі свае работы ў выставачнай зале Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці. Кераміка суседнічае з настольнай лямпай і пісьмовым прыборам, сплеценымі з лазы, мяккія цацкі — з саламянымі капелюшамі, вырабы са скуры і камянёў — з маслабойкамі, цэбрамі і іншымі бондарскімі рэчамі.

Выстаўка пераконвае: талентаў на пухавіцкай зямлі хапае. Што прыкметна, народныя промыслы жывуць і квітнеюць не толькі ў вёсках, але і ў самім райцэнтры — Мар'інай Горцы.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

ВІНШУЕМ!

ПРАКЛЁН

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

Як жа страшна крычала яна, як кідалася ў полымя, каб хоць нешта выхапіць, уратаваць, а нясцерпны жар адганяў яе, не даваў наблізіцца. Зразумеўшы, што нічога ўратаваць не ўдасца, Сычыха ўкленчыла на калені, і пракляла іх, уздзеўшы да цёмнага неба кастлявыя рукі. І іх, і іхніх дзяцей, і ўнукаў — аж да сёмага калена. Каб гарэлі яны ў агні, як тыя абразы пагарэлі...

Раніцай пра тое, што яны нарабілі, як растрывожаны вулей, гула ўся вёска. Усіх траіх бацькі збілі ледзь не да смерці — больш за тыдзень не выходзілі з хат, залізваючы гузакі.

«Бог доўга прымяраецца...» Не, не так і доўга. Вясной сорак трэцяга Мікола, Федзька і Янка — партызаны атрада «За Радзіму!» — трапілі ў засаду. Каласёнку ўдалося вырвацца, адсядзецца ў балоце, а ягоных сябрукоў схапілі і прывалаклі ў вёску, у Федзькаву хату. Туды ж прыгналі Янкавых бацькоў з малодшымі дзецьмі — усяго чатырнаццаць душ. Забілі вокны і дзверы дошкамі, аблілі хату бензінам і падпалілі...

Праклён старой Сычыхі нібы і не закрануў Міколу, а праз нейкі час уся гэта гісторыя са спаленымі абразамі і царкоўнымі кнігамі выветрылася з ягонай памяці. Да вызвалення ён партызаніў, тры блакады перажыў, сыпны тыф перамог, двойчы паранены быў — выжыў. У армію забралі, аж да Эльбы дайшоў. У сорак шостым дэмабілізаваўся, вярнуўся дадому — малады, прыгожы, усе грудзі ў ордэнах ды медалях.

Усяго дасягнуў стары Каласёнак сваім мазалём: славы, павагі, людской удзячнасці. Адукацыі не хапіла — у вялікія начальнікі мог бы выбіцца. Надта ж анкета ў яго была прыгожая для тых, хто вырашаў, каму кім быць: член партыі, партызан, механізатар, не злодзей і не п'яніца... Двое сыноў-памочнікаў падрасталі, на прэміі і ўзнагароды начальства не скупілася. А што яшчэ чалавеку трэба? Жыві ды радуйся. Ён і радаваўся — аж да цынкавай труны з Васільком, які згарэў у сваім танку ў далёкім Афганістане. Закапалі ягоную радасць у сыпучы пясок, а самога, адвезлі ў бальніцу. На тым усё і скончылася. Але чорны праклён Сычыхі вырваўся аднекуль з глыбінь памяці, забраў спакой, напоўніў душу трывожным чаканнем новай бяды. І вось яна прыйшла.

Шафёр прытармазіў каля Крыжавых, павярнуў направа, на Заслаўе. Стары Каласёнак нават не заўважыў гэтага —з пакутлівай тугой успамінаў апошні дзень, калі бачыў Алега.

Сын прыехаў рана, яшчэ як след не развіднела, але Мікола Пятровіч ужо закалоў кабанчыка і смаліў яго паяльнай лямпай. Алег хуценька пераапрануўся і ўзяўся памагаць.

Яны лоўка і спрытна рабілі звыклую сялянскую справу. Неўзабаве ўсё было скончана: напластавана на засолку сала, падрыхтаваны для вэнджання кумпякі, пасечана і ўпарадкавана мяса... Маці напакавала Алегу сумку — не падняць. Паклалі ў машыну і селі снедаць. Нягледзячы на забарону ўрачоў, Мікола Пятровіч кульнуў пад свежыну чарачку, а Алег адмовіўся — дарога. Елі моўчкі; апошнім часам пры сустрэчах з бацькам Алег больш маўчаў. Хмура, зацята. Крыўдаваў. З гэтай крыўдай і на той свет пайшоў.

Буйныя, як гарох, слёзы выкаціліся з-пад прыплюшчаных вачэй, і Мікола Пятровіч паспешна выцер твар шурпатай далонню. Зробленага не пераробіш. Хто ж ведаў, хто мог уявіць, што ўсё так абернецца? Хіба што старая Сычыха? Колькі часу прайшло, як яе няма, больш за паўстагоддзе, ужо і магілка згубілася, затапталася — нікога ў цёткі не засталося, каб прыгледзець, а жудасныя словы яе жывуць і праўдзяцца. Васіль, Алег — хто наступны? Ён сам, жонка, Міця?..

— Ты не памрэш, — успомніліся горкія Алегавы словы, — ты жалезны. А вось Міця памрэ. І я следам...

Сынава хвароба узрушыла Алега. І раней слабы, бесхарактарны, тут ён быццам звар'яцеў — толькі пра тыя клятыя даляры і гаварыў: дзе іх узяць, што прадаць, што зрабіць, каб Ася з Міцькам маглі паехаць у Германію. А неяк восенню вычытаў у газеце аб'яву: «Куплю ўзнагароды. ДОРАГА.» Якраз перад Кастрычніцкімі святамі яны прыехалі на чорным «мерсэдэсе» — Алег і мінскі калекцыянер, а можа, і звычайны спекулянт. Малады, але шустры, вочкі так і бегаюць.

— Тата, пакажыся нам пры поўным парадзе, — папрасіў Алег.

Не зразумеў Мікола Пятровіч, навошта, але пайшоў у спальню, пераапрануўся і выйшаў, трошкі бянтэжачыся перад чужым чалавекам. А той як зірнуў на яго, так і самлеў — зорка Героя працы, чатыры ордэны Леніна, чатыры — Чырвонага сцяга, два — Чырвонай зоркі, два — салдацкай Славы, Айчыннай вайны першай і другой ступеняў, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Дружбы народаў... Ды з тузін, а можа, і больш, медалёў. Шумна выдыхнуў:

— Бяру ўсе. Восем штук, як і дамаўляліся.

— А не мала? — спытаў Алег.

— Вядома, калі па адным прадаваць ды яшчэ за мяжу вывезці, можна выручыць і больш. Але ж гэта рызыкоўна, ды і грошы, ты казаў, пільна патрэбны. Так што згаджайцеся.

— Хлопцы, пра што гэта вы? — разгублена прамармытаў Мікола Пятровіч — ад здзіўлення і гневу ў яго перахапіла горла. — Ты што, сынок, блёкату аб'еўся? Дык ты ўжо і нас з маткай на продаж пастаў, можа, і за старых дурняў што-небудзь угандлюеш.

— Тата, пачакай, — збянтэжыўся Алег, — я не хацеў цябе пакрыўдзіць. Вядома ж, трэ было спачатку пагаварыць з табой, але я... Міцю з кожным днём усё горш. Прафесар, які яго глядзеў, сказаў: не зробіце аперацыю у бліжэйшыя тры-чатыры месяцы, рыхтуйцеся да самага кепскага. Што ж мне рабіць, тата? Гэта ж выйсце, выйсце... Дакументы ў цябе застануцца... і калодкі... Усе ж і без гэтых бляшак ведаюць, хто ты!

— Што рабіць? Каб жа я ведаў,сынку. Мы ўсё, што маглі, прадалі, да капейкі табе аддалі. Што засталося? Хата? Карова? Ну, добра, прададзім і карову, як-небудзь пражывём. А «бляшкі» мае не чапай. Я за іх крывёй плаціў, працай ад відна да відна...

Тады і кінуў яму ў твар Алег свае горкія словы: «Ты не памрэш, ты жалезны...»

— Так, — устаючы, сказаў калекцыянер. — Як я разумею, дамовіцца не ўдасца. Шкада. А ўжо ж і краіны тае няма, якая гэтыя цацкі вам чапляла, і нічога яны нявартыя ў звычайным жыцці. Я вам на ўсякі выпадак сваю візітовачку пакіну, перадумаеце — патэлефануйце.

Яны паехалі, і з таго самага дня Алег так ні разу з бацькам па-людску і не пагаварыў. Зацята маўчаў, адводзіў вочы. Ды і прыязджаў толькі двойчы. І больш ужо не прыедзе.

І на пахаванні, і за жалобным сталом людзей было да крыўднага мала — некалькі Алегавых сяброў, супрацоўнікі, бліжэйшыя суседзі — хто не мог не прыйсці. Ды і тыя, падняўшы для прыліку тры чарачкі, хуценька разышліся. «Праклятая хата... праклятая сям'я», — паўзло па вёсцы. Праклён старой Сычыхі чорнай хмарай навіс над сядзібай Каласёнкаў.

У тую бясконцую снежаньскую ноч Мікола Пятровіч так і не прылёг; да самай раніцы, звесіўшы на рукі цяжкую кудлатую галаву, прасядзеў за сталом. Самае страшнае ў жыцці выпала яму — перажыць абодвух сыноў, такіх маладых, здаровых, прыгожых, каму б толькі жыць ды жыць, цешачы старых бацькоў.

Знясіленыя перажытым, зваліліся Ася, Міцька і жонка, а ён сядзеў, бы акамянелы, і думкі цяжкімі жорнамі круціліся ў ягонай галаве, блыталіся, выціскалі з вачэй горкія і бездапаможныя старэчыя слёзы. Няўжо яму яшчэ суждана перажыць і адзінага ўнука?

На досвітку змучаны стары падняўся, знайшоў на кніжнай паліцы візітоўку мінскага калекцыянера. Той прыляцеў на сваім «мерсэдэсе» хвілін праз сорак — быццам чакаў званка.

...Ася ляжала ў ложку, прыгарнуўшы да сябе сына, і глядзела ў столь, быццам спадзявалася ўбачыць там сваё разбуранае, знявечанае жыццё. Вочы ў яе былі пустыя, як іржышча восенню. Мікола Пятровіч паклаў на коўдру тоўсты пакунак грошай, перавязаны гумкай.

— Не плач, дачушка, — сказаў ён, — слязамі гору не паможаш. Едзь у горад, хутчэй рыхтуй свае паперы. Трэба малога ратаваць.

Пераклаў з рускай аўтар

P.S. *7 чэрвеня Міхасю Герчыку споўнілася 70 гадоў. Віншуем нашага аўтара з юбілеем і жадаем яму добрага здароўя і творчага плёну.*

У сэрцы сваёй мовы

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5)

стралялі з гармат карцеччу. Па ўспамінах удзельнікаў паўстання і відавочцаў, на плошчы, на набярэжнай Нявы, на лёдзе ракі засталіся ляжаць сотні трупаў.

Афіцыйнай каранацыі Мікалая І яшчэ не было, і каб абяліць сябе перад грамадскасцю хоць крыху, ён паслаў у Міхайлаўскае фельд'егера, каб той прывёз паэта на аўдыенцыю.

На прыёме ў цара Аляксандр Сяргеевіч тросся не толькі ад таго, што перамёрз за дарогу, але і ад страху: чым скончыцца візіт? Пяцярых жа яго сяброў, кіраўнікоў паўстання, павесілі на тэрыторыі Петрапаўлаўскай крэпасці, многіх саслалі ў Сібір, аддалі ў салдатчыну на Каўказ.

Кажуць, выйшаў Пушкін ад цара са слязьмі на вачах: Мікалай І памілаваў яго, падручыўся быць асабістым цэнзарам усяго, што паэт напіша. "Цяпер ён мой, — сказаў імператар гасцям і прыдворным. — Цяпер гэта будзе іншы Пушкін!".

За Пушкіным пачалі сачыць ледзь не кругласутачна: куды б ні ехаў, куды б ні ішоў — чуў патыліцаю дыханне саглядатаяў. Амаль на кожны крок трэба было прасіць дазволу — аблыталі па руках і нагах, як павук муху.

"Я з засмучэннем бачу, што нават самы малы з маіх учынкаў выклікае падазрэнне і нядобразычлівасць... Я кожную мінуту бачу сябе як напярэдадні няшчасця" — пісаў ён шэфу жандармаў А. Бенкендорфу, спадзеючыся на паслабленне рэжыму. А тым часам Бенкендорф дакладваў цару: "Быў літаратурны абед... Пушкін сказаў (пра Мікалая І. — **П. М.**): "Ён даў мне жыццё і, што больш важна, — свабоду. Віват!"

Нішто сабе свабода!

Вядома ж, на тым абедзе Бенкендорфа не было. Яму данеслі, пераказалі словы Пушкіна. І ці не падазраваў ужо Аляксандр Сяргеевіч, хто з прысутных даносчык, і той панегірык выдаў спецыяльна для яго вушэй?

А. Бенкендорф Пушкіну:

"У адказ на ваша пісьмо 7 студзеня спяшаюся паведаміць, што яго вялікасць Гасудар не ўдастоіў уважыць вашу просьбу наведаць зарубежныя краіны, мяркуючы, што гэта спустошыць вашы грашовыя сродкі і ў той жа час адцягне вас ад вашых заняткаў".

Які клопат пра яго літаратурныя заняткі! Якое спачуванне бядотнаму фінансаваму становішчу!

Пісаў у гэты час Пушкін мала, браўся за прозу. "Каб я не быў вымушаны абставінамі, я для прозы не абмакнуў бы пяро ў чарніла", — апраўдваўся ён перад сябрамі. Друкаваўся рэдка, хаця плацілі яму па 25 рублёў за вершаваны радок (па запісках Аляксандра Сяргеевіча: адзін дабротны абед у рэстарацыі, з шампанскім, каштаваў 17 рублёў), ён вечна быў у даўгах. "Памагала" яму ў гэтым і тое, што быў заядлым валакітаю-залётнікам і карцёжнікам ("я гатовы хутчэй памерці, чым не гуляць" — яго словы).

Аднойчы, прагульваючыся па Царскім Сяле, Пушкін сутыкнуўся з імператарам. Пра што між імі была гаворка, А. Смірнова, блізкая знаёмая яго, у сваіх успамінах не ўдакладняе. Запісала толькі, што пры сустрэчы Пушкін сказаў ёй: "Чорт вазьмі, адчуў подласць ва ўсіх жылах".

І ў той жа час ён піша вершык, прысвечаны Мікалаю І:

Мощно хранила нас
Верная длань —
Глас умиления,
Благодарения,
Сердца стремления —
Вот наша дань.

Можна смела сцвярджаць, што ў той час знерваваны Пушкін проста шукаў сабе смерці. Без дазволу Бенкендорфа ён адпраўляецца ў падарожжа ў Арзрум, за Каўказ, у дзеючую армію. Хацеў заадно пабачыцца з братам, з сасланымі туды дзекабрыстамі. Але, па ўспамінах сяброў, то лез пад турэцкія кулі, то ляцеў з шабляю нагала паперадзе войска, то падхопліваў у забітага піку, каб схапіцца з туркамі. Галоўнакамандуючы войскамі Паскевіч урэшце не вытрымаў: "Жыццё ваша дарагое для Расіі; вам тут рабіць няма чаго!" — і пад узброеным канвоем выправіў яго з дзеючай арміі.

Па вяртанні Пушкін тут жа атрымаў ад Бенкендорфа грознае пасланне: "...Па якіх прычынах вам уздумалася не стрымаць дадзенага мне слова і накіраваліся ў закаўказскія краіны, не папярэдзіўшы мяне пра намеры вашы зрабіць гэтае падарожжа?" Выклікаў і імператар з гэтай нагоды. Ён то пагардліва ўглядаўся сваімі шэрымі, на выкаце буркуламі ў твар Пушкіна, то падкручваў вус, то нагладжваў з патыліцы ўперад, на лысіну, валасы, то ўглядаўся ўжо іначай, як удаў на трусіка. Пушкін і расказваў тое-сёе, і апраўдваўся, маўляў, галоўнакамандуючы дазволіў яму паездку. На што цар сказаў: "Трэба было прасіцца ў мяне. Хіба вы не ведаеце, што **армія мая**?"

Пра жыццё і трагічны лёс Пушкіна можна было б яшчэ многа гаварыць. Але вернемся зноў да вершаў Буало. І ў роздуме пачухаем патыліцы...

І ўспомніцца нам народная мудрасць: "Кіпцюрком у сіло — і ўсёй пташцы невесяло", хоць яна — "асляпляльна-сонечны паэт Расіі" (В. Верасаеў).

10 лютага 2002 года споўнілася 165 гадоў з дня трагічнай гібелі А. С. Пушкіна. І адбылося гэта ў 37 гадоў жыцця.

ІМПРЭЗЫ

Там, дзе Іслач бруіцца...

Злева направа: Вячаслаў Рагойша, жонка Таццяна Вячаславаўна, сын Усевалад, бацька Пётр Іосіфавіч, родная цётка Надзея Іосіфаўна, маці Валянціна Антонаўна. Ракаў, 25.01.1971 г.

5 чэрвеня споўнілася 60 гадоў вядомаму вучонаму-педагогу доктару філалагічных навук, прафесару, загадчыку кафедры тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта Вячаславу Рагойшу. З гэтай нагоды на філфаку БДУ адбылася святочная імпрэза, на якую прыйшлі павіншаваць юбіляра калегі па працы, пісьменнікі, студэнты і прыхільнікі творчасці Вячаслава Пятровіча.

9 чэрвеня ў мястэчку Ракаў на Валожыншчыне, дзе нарадзіўся Вячаслаў Рагойша, у Доме культуры прайшла святочная вечарына. На ёй прагучала шмат цёплых слоў у адрас юбіляра, як ад сяброў літаратараў, так і ад землякоў. Госці змаглі наведаць бацькоўскі дом Вячаслава Пятровіча, дзе створаны музей поліэтнічнай культуры Ракаўшчыны. Кожны змог пазнаёміцца з газетай "Ракаўскі шлях", якую ўжо трэці год выдае сваімі сіламі В. Рагойша.

P. S. Віншуючы Вячаслава Пятровіча з юбілеем, жадаем яму моцнага здароўя, натхнення і творчых поспехаў. А нашым чытачам прапануем вершы Уладзіміра Караткевіча, якія ён у свой час прысвяціў Вячаславу Рагойшу і яго сям'і. Творы друкуюцца ўпершыню

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ

Эпіталама Таццяне і Славе

Кахання Бог у светлай сіле
Сядзіць між нас. Я п'ю нагбом
За вас: прыгожых, добрых, мілых,
За ваш стары і новы дом.

Да схілу дзён сваіх астатніх
Мы вам сябры. Няхай жыве
Наш гонар: Слава і Таццяна,
Сябры ад сёння і — навек.

Малю аб вечным і адзіным:
Хай шчасны будзе на вякі
Шлюб Беларусі і Украіны,
Шлюб Львова й Іслачы-ракі.

(Напісана і прачытана на вяселлі Вячаслава Рагойшы і Таццяны Кабржыцкай у Ракаве 8 лістапада 1967 года).

•

Каня і падкову мы дорым сягоння
У дзень нараджэння
для нашага Славы:

Каня — каб заўсёды
любіў ты Пагоню,
Падкову — на шчасце,
на вечнасць, на славу.

(Надпіс на адвароце падараванага Вячаславу Рагойшу ў дзень яго нараджэння 5 чэрвеня 1980 года барэльефа з выявай галавы каня і падковы).

Славу Рагойшу з лепшымі зычэннямі ў дзень саракагоддзя

Не будзь да славы
надта ласы,
Пі памаленьку і не трусь,
І беларускага Пегаса
Любі, як маці-Беларусь.

Хадзі за ім старанна,
з потам,
І не шкадуй мазгоў і ног.
Тады і ён дабром адплоціць...
А з ім — і Беларускі Бог.

5 чэрвеня 1982 г.

Якуб Колас і Украіна

У Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася вечарына "Якуб Колас і Украіна", на якую прыйшоў амбасадар Украіны на Беларусі Анатоль Дронь.

Падчас вечарыны было падпісана пагадненне паміж Літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа ў Мінску і Кіеўскім Літаратурна-мемарыяльным музеем Максіма Рыльскага. Падпісалі яго дырэктары музеяў Якуба Коласа і Максіма Рыльскага Зінаіда Камароўская і Ніла Підпала. Пагадненне прадугледжвае плённае супрацоўніцтва і сяброўства паміж музеямі, узаемны абмен кніжнымі і мастацкімі выстаўкамі, фондавымі матэрыяламі...

Атмасфера сустрэчы стала яшчэ больш святочнай, калі ўсіх гасцей вечарыны запрасілі прайсці на сядзібу музея, дзе адбылася літаратурная імпрэза "Пяснярства вузы кроўныя".

Перад прысутнымі выступіў вакальны ансамбль "Берагіні" Стаўбцоўскай школы мастацтваў пад кіраўніцтвам Тамары Барахавай. Іх выступленне перамяжоўвалася з цудоўнымі ўкраінскімі песнямі хору народнай украінскай песні "Крыніца", які прадстаўляў дыяспару братняй Украіны ў Мінску.

Натхнёна прамаўляў пра Украіну, яе літаратуру і вялікага Шаўчэнку народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. Сяргей Законнікаў гаварыў аб сваіх падарожжах на Украіну, пра рух адраджэння ў гэтай краіне і прачытаў верш "Беражы сябе, Украіна!"

Сын Якуба Коласа Міхась Міцкевіч прыгадаў эпізоды свайго жыцця, звязаныя з Украінай.

Заканчваў свята Мікола Чарняўскі, які шмат пераклаў на беларускую мову твораў украінскіх паэтаў.

Андрэй ГРЫГАРОВІЧ,
навучэнец Мінскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа № 1
Фота Алеся ФЕДАРЭНЧЫКА

"Слова пра Коласа"

У сярэдзіне мая на Стаўбцоўшчыне прайшоў Тыдзень дзіцячага мастацтва, прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. У яго ўваходзілі марш-парад духавых аркестраў "Залатая труба", фестываль дзіцячых тэатраў "Казкі жыцця", фестываль харэаграфічных калектываў "Бусляняткі", дзіцячае свята мастацтваў "Альбуцкая крынічка" і, безумоўна, фестываль юных музыкантаў "Сымон-музыка", які стаў заключным акордам тыдня. На радзіме песняра ён праводзіўся Літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа ў 13 раз і традыцыйна адкрываўся літаратурнай імпрэзай "Слова пра Коласа".

Гасцямі імпрэзы былі член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук, прафесар Міхась Мушынскі, старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп. З новымі вершамі на ўлонні наднямонскіх лясоў выступіла Раіса Баравікова.

Ганна ЗАЙЦАВА
Фота Алеся ФЕДАРЭНЧЫКА

Юбілей беларускага паэта ў Рызе

У Доме Асацыяцыі нацыянальных культурных таварыстваў Латвіі сабралася беларуская грамада Рыгі на ўрачыстасць з нагоды 60-годдзя беларускага паэта, кавалера вышэйшай узнагароды дзяржавы Ордэна Трох Зорак Латвійскай Рэспублікі Сяргея Панізніка. Вечарыну ладзіла Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак" разам з Саюзам пісьменнікаў Латвіі.

Віншавалі Сяргея Панізніка старшыня Латвійскага таварыства беларускай культуры "Сьвітанак" Таццяна Казак, першы сакратар беларускай амбасады ў Латвіі Дзмітры Шкурдзь, вядомыя латышскія пісьменнікі Андрыс Веянс, Улдыс Бэрзіньш, Эрыкс Ханбергс і Сяргей Жураўлёў, дырэктар Рыжскай Беларускай асноўнай школы Ганна Іванэ (Нябеская), дырэктар Бюро па аўтарскіх правах Ілона Паклонэ, прафесар Латвійскага універсітэта Ілга Апінэ, старшыня Аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар" Вячка Целеш, старшыня латвійскай суполкі Грамадскай міжнароднай асацыяцыі беларусістаў Мірдза Абала, намеснік старшыні Таварыства беларускай культуры "Мара" г. Ліепаі Валянціна Грыбоўская і інш. Перад пачаткам юбілейнага віншавання была адкрыта выстава мастака-беларуса Міхася Галынскага, які жыў у Ліепаі (творы прывезла яго дачка Аляксандра Слівіна).

Падарункам юбіляру стаў канцэрт, падрыхтаваны мясцовымі беларускімі талентамі. Ансамбль "Вавёрачка" Рыжскай Беларускай асноўнай школы пад кіраўніцтвам выпускніцы Латвійскай музычнай акадэміі Наталлі Дзірвук выканаў песні "З Купалам у сэрцы" на словы С. Панізніка і "Сэрцу Беларусі" М. Кэмпэ ў перакладзе С. Панізніка. Оперная спявачка выпускніца Беларускай кансерваторыі Ганна Крупская выканала беларускія песні, у тым ліку і раманс "Споведзь" В. Войціка на словы С. Панізніка. Беларускія песні розных аўтараў спявалі выпускніца Рыжскай Беларускай нядзельнай школы студэнтка Медыцынскай акадэміі Ілона Варатнікова, а таксама музыкант і кампазітар Стась Клімаў. Акампанавалі спевакам музыкі — выпускнік аддзялення музыкі Мінскага педінстытута Сяргей Калеснікаў, піяністы Людміла Ларыёнава (Кароль), выпускніца Беларускай кансерваторыі, а таксама выпускніца Маладзечанскай музычнай вучэльні Наталля Камілеўская, дачка беларускага паэта ў Латвіі Барыса Кастапенкі. Вершы С. Панізніка чыталі вучні Міхась Казак, Ксенія Сяргей, Дзіяна Голубава і Карына Макня, а таксама прыхільнікі паэзіі юбіляра Таісія Бачкарова, Таццяна Казак і Наталля Камілеўская.

Вячка ЦЕЛЕШ
г. Рыга

"Слова беларускага ўладар"

19 мая на Валожыншчыне прайшло літаратурнае свята "Слова беларускага ўладар", прысвечанае Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу. Яно праводзілася ў форме аўтавандроўкі з прыпынкамі ў Тупальшчыне, Люцінцы і Пяршаях. Свята арганізавалі аддзел культуры Валожынскага райвыканкама, Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка і раённы цэнтр культуры. Акрамя арганізатараў свята, у аўтавандроўцы ўдзельнічалі пісьменнікі Генрых Далідовіч, Вячаслаў Рагойша, Віктар Шніп, Людміла Рублеўская, Валянціна Гіруць-Русакевіч, Язэп Янушкевіч, дырэктар сталічнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна Наталля Чуева. Каля магілы В. Дуніна-Марцінкевіча ў в. Тупальшчына адбылася імша. Пасля ўдзельнікі свята наведалі сядзібу пісьменніка ў Люцінцы. Ушанавалі памяць Ядвігіна Ш. каля яго мемарыяльнай дошкі ў Пяршаях.

Заключным акордам свята стала вялікая літаратурная вечарына, якая прайшла ў Пяршайскім СДК, дзе выступіў народны тэатр пад кіраўніцтвам М. Ганчарыка і пісьменнікі з Мінска.

Н. К.

АНОНС

Працягваючы традыцыі асветніцтва

Важнай культурна-гістарычнай падзеяй 2002 года з'яўляюцца юбілейныя даты, звязаныя з выдатнымі беларускімі асветнікамі: 900-годдзе Еўфрасінні Полацкай і 450 гадоў з часу смерці Францыска Скарыны.

З гэтай нагоды Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны 27 чэрвеня праводзіць "круглы стол" на тэму: "Асветніцкая місія Еўфрасінні Полацкай, Сімяона Полацкага і Францыска Скарыны ў еўрапейскай культурнай прасторы сучаснасці".

Удзельнікі "круглага стала" — навукоўцы, педагогі, духавенства, прадстаўнікі сістэмы адукацыі, культуры — ставяць задачы:

- асэнсаванне асветніцкай місіі ў кантэксце выкліку сучаснасці;
- роля асобы асветніка ў грамадскай перспектыве;
- праблема пераемнасці ў асветніцкай традыцыі.

Запрашаюцца да ўдзелу ўсе зацікаўленыя асобы і ўстановы.

Час правядзення — 27 чэрвеня, 14.00.

Месца правядзення — ННАЦ імя Ф. Скарыны, вул. Рэвалюцыйная, 15, 2-гі паверх, тэл. 206-57-97; 220-93-50.

ЧАСАПІС

Сінтэз навукі і мастацтва

Сёлета мастак Генадзь Чысты адзначае сваё 55-годдзе. Для музейшчыкаў гэта імя вядомае. Дзякуючы Г. Чыстаму Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры мае па-мастацку якасныя і цікавыя экспазіцыі.

Супрацоўніцтва гэта, а шчыра кажучы, сяброўства, даўняе. Пачалося ўсё ў 1991 годзе з працы над музейным праектам на радзіме Францішка Багушэвіча. Потым была праца ў Цімкавічах. Яе вынік — Літаратурны музей Кузьмы Чорнага (1993).

Шмат часу Генадзь Чысты аддае працы над экспазіцыямі юбілейных выстаў. З 1994 г. іх было сем.

Кожная новая выстава — старонка гісторыі музейнай справы. Праца мастака-афарміцеля ідзе побач з навуковай працай супрацоўнікаў музея. Сёння музейная экспазіцыя стала, безумоўна, сінтэзам навукі і мастацтва. Вобраз, які бачыць мастак, а потым пераносіць у залы музея, дапамагае наведвальнікам адчуць час, зразумець эпоху, прапусціць праз сябе асабістую далучанасць да гісторыі роднай зямлі. Еднасць літаратуры і мастацтва, як нідзе ў іншым месцы, праяўляецца ў літаратурнай экспазіцыі. Вельмі яскрава гэта адчуваецца ў працах Генадзя Чыстага. Хочацца спадзявацца, што мастак яшчэ не раз парадуе і музейшчыкаў, і наведвальнікаў сваімі цікавымі мастацкімі ідэямі.

Вольга ГУЛЕВА

У краязнаўчы збор раённай бібліятэкі

Уладзімір Ліўшыц — добра вядомы на Магілёўшчыне і ва ўсёй Беларусі краязнаўца. Кандыдат філасофскіх навук, ён з'яўляецца аўтарам болей 40 кніг і брашур па краязнаўстве і літаратуразнаўстве. Першая з іх — "Горки. Историко-экономический очерк" — пабачыла свет у 1984 годзе. Прыхільныя рэцэнзіі на гэтую кнігу былі змешчаны ў горацкай раённай газеце і ў газеце "Советская Белоруссия". З таго часу вызначыліся і асноўныя зацікаўленні У. Ліўшыца — гісторыя Горацкага краю, гісторыя Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

Пэўныя стасункі з Горкамі, з галоўнай сельскагаспадарчай ВНУ краіны ёсць і ў многіх пухаўчан. Таму, магчыма, і зацікавіць шэраг новых паступленняў у Пухавіцкую раённую бібліятэку. Фактычна — падарунак горацкага рупліўца краязнаўчай нівы. Уладзімір Ліўшыц, зрабіўшы дарчыя надпісы, перадаў у Пухавіцкую раённую бібліятэку цэлы шэраг сваіх кніг. А гэта — і нарыс "Чатырыжды ганаровы" (пра вучонага Іллю Стальмашонка), "Горы-Горацкі земляробчы інстытут (1863—1864 гг.). Выдатныя вучоныя і прафесары", "Літаратурны музей Максіма Гарэцкага", "Сын вёскі" (пра пісьменніка Васіля Каваля), "Раскопкі вакол Горацкага "Парнаса", "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія", "Кафедра механізацыі жывёлагадоўлі і электрыфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці", "Навечна ў памяці народнай". Некаторыя з гэтых прац напісаны У. Ліўшыцам у сааўтарстве. Падараваў горацкі краязнаўца пухаўчанам і гісторыка-дакументальную хроніку Горацкага раёна "Памяць".

Магчыма, услед за У. Ліўшыцам і іншыя краязнаўцы Беларусі спрычыняцца да фарміравання краязнаўчага аддзела Пухавіцкай раённай бібліятэкі. У Мар'інай Горцы, іншых паселішчах раёна жывуць ураджэнцы многіх куточкаў Беларусі. Пэўна ж, іх зацікавіць краязнаўчая, гістарычная інфармацыя пра свае мясціны.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

ПЕРАКЛАДЫ

Альберта Маравія (сапраўднае імя Альберта Пінкерле 1907-1990)—вядомы італьянскі раманіст і навеліст (раманы: "Абыякавыя"(1929), "Рымлянка" (1947), "Пагарда"(1954), "Чачара"(1957), "Маркота" (1960); зборнікі малой прозы: "Рымскія апавяданні" (1954) і "Новыя рымскія апавяданні" (1959). Лаўрэат прэстыжных літаратурных прэмій "Стрэга", "Мардзотта" і "Віарэдджа", вядомы ў многіх краінах свету.

Асобныя творы Альберта Маравія на беларускую мову перакладалі А. Шаўня і І. Пташнікаў.

Прапанаванае апавяданне ўваходзіць у зборнік "Рымскія апавяданні".

ПЕРАКЛАДЧЫК.

Альберта МАРАВІЯ

Майскі дождж

СА ЗБОРНІКА "РЫМСКІЯ АПАВЯДАННІ"

У бліжэйшы час я зноў наведаюся ў "Закусачную паляўнічых" на Монтэ Марыо, але пайду туды з прыяцелямі, якіх сустракаю кожную нядзелю. У гэтай кампаніі граюць на акардэоне, і з-за адсутнасці дзяўчат, хлопцы танцуюць самі па сабе. Аднаму пайсці туды ў мяне не хопіць адвагі. Па начах, раз-пораз, мне сняцца сталы гэтай закусачнай, цёплы майскі дождж, які пляскае па сталах зверху, і паніклае галлё дрэў, што хіліцца да іх, а паміж дрэў, у вышыні, белыя аблокі — яны плывуць над панарамаю забудовы Рыма. Я нібыта чую голас Антоніо Токкі, гаспадара закусачнай, так, як чуў яго той раніцы, калі ён, раззлаваны, клікаў з сутарэння: "Дзірчэ, Дзірчэ!". І мне здаецца, што бачу самую Дзірчэ — яна ў чаканні кідае позірк на мяне, перш чым накіравацца ў скляпенне сваёй упэўненай хадою, а затым крокі яе адгукаюцца на сходках.

У закусачнай я апынуўся выпадкова, ідучы з горада; і калі мне прапанавалі там працаваць афіцыянтам, без платы, падумаў: "Што ж, не будзе грошай, затое буду жыць у сям'і". Ды трапіў я не ў сямейнае асяроддзе, а ў пекла.

Гаспадар, Антоніо Токкі — тоўсты, амаль круглы, нагадваў шар з масла, аднак без дабрадушнасці, як звычайна ў таўсцякоў, а з нейкай жорсткасцю, злосцю. Твар яго, шырокі, шэры і тлусты, у вялікай колькасці складак, з маленькімі калючымі, падобнымі да змяіных, вочкамі. Хадзіў ён заўсёды ў камізэльцы, нарукаўніках і шэрай кепцы з насунутым на вочы казырком. І дачка яго, Дзірчэ, характарам была не лепшай за бацьку — таксама ўпартая, злая, рэзкая. Але прыгожая: з тых невялічкіх статных, добра складзеных жанчын, якія, калі ходзяць, б'юць нагой па зямлі, нібыта гаворачы: "Гэтая зямля мая!" Твар у яе быў шыракаваты і мярцвяна-бледны, а вочы і валасы чорныя. Бадай, адна маці ў іхняй сям'і была добраю: гэтай жанчыне было каля сарака гадоў, але на выгляд ёй можна было даць усе шесцьдзесят: худая, з абвіслым, як у бабулек, носам і старэчымі валасамі. Розумам, яна, відаць, не вылучалася; прынамсі такое ўражанне рабіла, калі стаяла каля пліты з выцягнутым у нямым смеху тварам; калі ж паварочвалася, то было відаць, што ў яе ўсяго толькі пара зубоў.

З вуліцы закусачная мела дугападобную шыльду, колеру бычынай крыві, дзе жоўтымі літарамі напісана: « Закусачная паляўнічых. Уладальнік Антоніо Токкі». Калі заходзіш у двор, апынаешся між дрэў, пад якімі стаяць сталы, і адсюль адкрываецца панарама Рыма. Сам дом, пад чарапічным дахам — вясковы, з двара амаль глухая, без вокан, сцяна. Лета — найлепшая для закусачнай пара, калі сюды з раніцы да вечара прыходзіць мноства людзей: і сем'і з дзецьмі, і закаханыя пары, і кампаніі мужчын. Людзі сядзяць за столікамі, п'юць віно, ядуць стравы, прыгатаваныя Токкі, і любуюцца панарамай. У такую пару мы не мелі часу нават перадыхнуць — я з гаспадаром безупынна завіхаліся каля кліентаў, а жанчыны гатавалі і мылі посуд. Па вечарах мы настолькі стамляліся, што адразу шлі спаць, нават не гледзячы адзін на аднаго. А вось узімку ці нават у іншую пару года, калі ішлі дажджы, пачыналася бядота. Паміж бацькам і дачкою існавала варожасць, але варожасць—яшчэ слабое азначэнне: каб іх воля, дык пазабівалі б адно аднаго. Бацька быў уладарны, прагны, дурнаваты і з-за дробязей распускаў рукі; дачка ж — цвёрдая, як камень, скрытная, дзёрзкая, заўсёды за ёю павінна быць апошняе слова. Прычына іх нянавісці, магчыма, была перш за ўсё ў тым, што яны адной крыві, а, як вядома, нішто больш, чым кроў, не абуджае такіх пачуццяў; але тут нянавісць трымалася таксама з-за разыходжання ў інтарэсах. Дачка была амбіцыёзнаю і казала, што каштоўную магчымасць паказваць панараму Рыма яны маглі б скарыстоўваць выгадней, а так, паводле яе слоў, пакідаць сабакам. Яна ўпарта даказвала, што бацька павінен зрабіць танцавальную пляцоўку з бетонным покрывам, наняць аркестр, развесіць венецыянскія папяровыя ліхтарыкі, перабудаваць дом і адкрыць мадэрновы рэстаран, назваўшы яго «Рэстаран Панарама». Але бацька не згаджаўся: і таму, што быў прагным і насцярожаным да ўсяго новага, і таму, што гэтая прапанова зыходзіла ад дачкі — ён бы лепш перарэзаў сабе горла, чым саступіў ёй. Сутычкі паміж бацькам і дачкою адбываліся заўсёды за сталом: распачынала, са злосцю, Дзірчэ, закранаючы нешта прыватнае — напрыклад, бацькаву звычку адрыгваць падчас ежы; Антоніо адказваў брыдкаслоўем; дачка не спынялася, тады бацька даваў ей аплявуху. Трэба заўважыць, што гэта, напэўна, прыносіла яму асалоду, бо на твары з'яўляўся адметны выраз: ён прыкусваў зубамі ніжнюю губу і міргаў вачыма. Для дачкі ж гэтая аплявуха была як свежая вада для кветкі: яна зелянела ад нянавісці і злосці. Тады бацька хапаў яе за валасы і пачынаў моцна біць. Падалі талеркі, шклянкі. Маці, вельмі хвалюючыся — хоць, як заўжды, са сваёю вар'яцкай усмешкаю на бяззубым твары, — усхоплівалася і ставала паміж імі. А я, з перапоўненым горыччу сэрцам, выходзіў на вуліцу і адпраўляўся на праходку ў бок Каміллуччы.

Я пайшоў бы ад іх даўным-даўно, каб не каханне да Дзірчэ. Я не з тых людзей, што здольны лёгка закахацца, таму што па натуры прагматычны — жаночыя словы і позіркі мяне не зачароўваюць. Ды калі яна замест слоў і позіркаў аддае саму сябе, цалкам, акрамя таго знянацку, гэта іншая справа. Тады ты трапляеш нібыта ў капкан, і чым больш робіш дзеля таго, каб вызваліцца, тым глыбей у тваё цела ўразаецца зуб'е капкана. Магчыма, яшчэ да знаёмства са мною, у Дзірчэ быў план: я ці хто іншы— для яе было ўсё роўна, бо як толькі я трапіў у іхні дом, яна ўначы, калі я ўжо спаў, прыйшла ў мой пакой. Такім чынам, паміж сном і няспаннем, калі я амаль не разумеў, адбывалася гэта наяве ці ў сне, Дзірчэ прымусіла мяне раптам перайсці ад абыякавасці да страсці. Адным словам, не было паміж намі ні размоў, ні позіркаў, ні дакрананняў рук, ні ўсіх астатніх хітрасцяў, да якіх звяртаюцца закаханыя, каб выказаць свае пачуцці. Здавалася, што яна распусная жанчына і робіць гэта за нейкія дробныя грошы. Дзірчэ аднак не была такой. Наадварот, яе ўспрымалі як прыстойную і гордую дзяўчыну. Дык вось гэтая розніца — паміж маім уражаннем і меркаваннямі іншых — стала для мяне не чым іншым, як пасткаю.

Характар у мяне спакойны і разважлівы, але бывае, што я шалею: калі мяне раззлуюць, кроў б'е мне ў галаву адразу. Гэта можна заўважыць і па маім абліччы: я бландзін, і твар у мяне бледны, але дастаткова дробязі, каб ён пачырванеў. Дзірчэ мяне дражніла, і я хутка зразумеў, чаму: хацела настроіць супраць свайго бацькі. Яна мне даводзіла, што несумленна маўчаць і бяздзейнічаць, калі ў маёй прысутнасці бацька даваў ёй аплявухі, цягаў за валасы і нават, як было аднойчы, кінуў на зямлю і пачаў біць нагамі. Я не кажу, што яе развагі беспадстаўныя: мы былі каханкамі, і таму я павінен быў яе абараняць. Але я разумеў, што ў яе іншая мэта. Злуючыся, што Дзірчэ мяне папракае за баязліўства, і ўсведамляючы, што робіць так наўмысна, я ўсё гэта больш не мог зносіць. Між тым аднойчы гаворка набыла іншы паварот: маўляў, як было б добра, каб мы змаглі пажаніцца і самастойна, яна і я, адкрылі рэстаран "Панарама". Дзірчэ зрабілася добрай-добрай, ласкавай, пяшчотнай. Гэта быў найлепшы час нашага кахання; але я ўжо яе не пазнаваў і думаў: тут нейкі сабака закапаны. На самай справе, у адно імгненне яна змяніла музыку ў чарговы раз і сказала, што мы, у шлюбе ці без шлюбу, не маглі ні на што спадзявацца да той пары, пакуль жывы яе бацька. І ўрэшце яна сказала адкрыта: мы павінны забіць яго. Гэта адбылося таксама, як і ў першую ноч, калі яна ўвайшла ў мой пакой — без папярэджвання і без лішніх хітрыкаў: выказала сваю прапанову і выйшла, пакінуўшы мяне думаць у адзіноце.

На наступны дзень я сказаў, што яна памыляецца, калі думае, што я дапамагу ёй у такой справе. Дзірчэ ж мне адказала, што ў такім выпадку мне лепш пакінуць іхні дом адразу ж — я для яе больш не існую. Слова сваё яна трымала, і з таго дня нават не глядзела на мяне. Мы амаль не размаўлялі, ды ўскосна я пачаў ненавідзець яе бацьку, бо лічыў, што вінаваты ва ўсім ён. Паводле збегу абставін Антоніо Токкі тады штодня меў сутычкі з Дзірчэ, і здавалася, што ён так паводзіў сябе дзеля таго, каб ува мне абудзіць нянавісць.

Звычайна май—вельмі добрая пара для закусачнай: людзі падымаюцца сюды, каб выпіць віна і пакаштаваць свежых бабоў. Але ў гэтым годзе замест добрага надвор'я ўсе дні бесперапынна, як з вядра, зялёны двор закусачнай паліваў дождж. Нават сабака туды не прысоўваўся, і таму настрой у гаспадара заўсёды быў дрэнны. Аднойчы раніцаю ён зласліва адшпурнуў талерку і гыркнуў:

— Ты што, наўмысна падсоўваеш мне такую брыдоту, рэшткі даўнішняга супу?!..

А Дзірчэ яму ў адказ:

— Каб наўмысна, то яду паклала б туды!

Ён зыркнуў на яе і даў аплявуху, такую моцную, што ў яе ажно грэбень з валасоў вылецеў. А ліў дождж , і мы сядзелі амаль у цемнаце. Твар Дзірчэ быў белы і спакойны, нібыта мармуровы. З таго боку, адкуль упаў грэбень, павольна-павольна распускаліся валасы, падобныя да змей, якія абуджаюцца.

Я прамовіў да Токкі:

— Ты што хочаш так яе прыбіць?

— Гэта не твая справа,— адказаў ён у здзіўленні, таму што гэта быў першы раз, калі я ўмешваўся.

Я адчуў амаль што гонар, як быццам абараніў слабую істоту, хоць гэта быў зусім не той выпадак. Мне тады здалося, што з'явілася нагода, прычым адзіная, вярнуць яе. Чырвоны ад запалу, які мяне ахапіў, з налітымі крывёю вачыма, я голасна вымавіў:

— Стой! Я табе не дазволю здзекавацца з яе! Зразумеў?

Дзірчэ пад сталом узяла мяне за руку — да мяне дайшло, што папаўся, але было ўжо позна.

Токкі ўстаў і сказаў:

— Ты таксама атрымаеш сваё!

Ён ударыў мяне па шчацэ, але няўдала. Я схапіў шклянку і выплеснуў усё віно яму ў твар. Пра гэтую шклянку і пра гэтае віно я, можна сказаць, думаў ужо не менш як месяц. Мне быў вельмі даспадобы такі жэст, гэтаксама, як ненавісны быў Токкі. Лінуўшы ў твар віном, зрабіўшы жэст, які мне вельмі падабаўся, я кінуўся наўцёкі па лесвіцы ўгару. Гаспадар тым часам гукаў услед:

— Я заб'ю цябе, аблуда, галадранец!

Я замкнуў дзверы свайго пакоя, падышоў да акна і пачаў глядзець на дождж. Прыляцеўшы ў пакой, я, раз'юшаны, узяў нож, які ляжаў у скрыні, і ўтыркнуў яго ў падаконнік з такой сілай, што зламалася лязо.

Гэта адбывалася там, наверсе, на гэтым праклятым Монтэ Марыо, а каб у Рыме, пэўна ж, я ніколі б не згадзіўся на падобнае. А там, наверсе, усё мела сваю натуральнасць,

і тое, што напярэдадні здавалася немагчымым, на наступны дзень ужо было вырашана. Мы з Дзірчэ дамовіліся, абмеркавалі спосаб, дзень і час. Звычайна раніцай Токкі разам з дачкой, якая нясла яму буталь, спускаўся ў склеп і набіраў на дзень віно. Каб спусціцца ў склеп, неабходна было прайсці па вымураванай каля сцяны лесвіцы з сямі прыступак, пад якімі стаяў ткацкі варштат. Было вырашана, што я пайду ўслед за імі і калі Токкі будзе нацэджваць віно, стукну яго па галаве жалезнаю качаргою, якой звычайна папраўлялі вуглі ў печы. Пасля гэтага планавалася перацягнуць яго да лесвіцы і казаць, што ён сам упаў і прабіў сабе галаву. Не ведаю, хацеў я гэтага ці не, але са злосцю сказаў:

— Я зраблю гэта, каб паказаць табе, што не баюся... А потым пайду і больш ніколі не вярнуся.

Дзірчэ мне ў адказ:

— Тады лепей, каб ты нічога не рабіў, а пайшоў зараз... Я ж цябе кахаю і не хачу страціць...

Яна ўмела, калі хацела, прыкідвацца закаханай; і таму я адказаў, што тады зраблю ўсё так, як дамовіліся, пасля гэтага застануся з ёю і мы адкрыем рэстаран.

У вызначаны дзень Токкі сказаў дачцы, каб яна ўзяла буталь і адпраўлялася ўніз, у склеп. Як і перад гэтым, ішоў дождж, і ў закусачнай было амаль цёмна. Дзірчэ ўзяла буталь і рушыла за бацькам; але перш чым спусціцца, яна павярнулася і дала мне знак, што пара. Маці, якая стаяла каля пліты, заўважыла яе жэст і, раззявіўшыся, зыркала на нас. Я ўстаў з-за стала, падышоў да пліты, узяў качаргу з-пад каміна і шуснуў міма яе. Старая глядзела на мяне і на дачку, вырачыўшы вочы, але было ўжо зразумела, што яна нічога не скажа. Бацька гукнуў са склепа:

— Дзірчэ, Дзірчэ!

— Іду! — адказала дачка. Памятаю, як я ў апошні раз, калі яна спускалася ўніз па ступеньках сваёй упэўненай і пачуццёвай хадою, выгінаючы свою белую точаную шыю пад вушаком, любаваўся яе фізічнай прыгажосцю.

У той момант расчыніліся дзверы з боку саду. У закусачную зайшоў рамізнік з намоклым мяшком на плячах. Не гледзячы на мяне, ён папрасіў:

— Дапамажы мне, хлопча.

І я, з качаргою ў руцэ, машынальна рушыў услед за ім. Непадалёку будавалі хлеў, і там, каля будоўлі, застрагнуў воз, нагружаны каменнем. Конь ужо выбіўся з сілы. Рамізнік — згорблены мужчына, страшнага, амаль жывёльнага выгляду — быў вельмі раз'юшаны. Я паклаў качаргу на перадок воза, падкінуў два камяні пад колы і пачаў штурхаць воз; рамізнік тым часам цягнуў каня за вуздэчку. А на зялёныя і густыя прысады, кусты чорнай бузіны і моцна пахучай квітнеючай акацыі, ліло, як з вядра. Воз не зрушваўся з месца, і рамізнік лаяўся. Ён узяў пугу і выцяў каня з азвярэннем; затым, раз'юшаны, схапіў маю качаргу, што ляжала на возе. Няцяжка было заўважыць, што рамізніка раз'юшвае не воз, а ўсё яго жыццё. Тут у яго выяўлялася нянавісць да каня так, як да чалавека. «Яшчэ заб'е жывёліну»,— падумаў я і ўжо збіраўся крыкнуць, каб ён кінуў жалязяку. Але потым усвядоміў: калі ён заб'е каня, тады я буду выратаваны. Мне здавалася, што ўся мая злосць пераходзіла ў цела рамізніка, які паводзіў сябе па- вар'яцку: ухапіўся за аглоблю, пацягнуў раз-другі, а тады ляснуў каня качаргою па галаве.

Я заплюшчыў вочы, бо не мог глядзець на гэта, а ён біў каня яшчэ і яшчэ. Тым часам я адчуў сябе цалкам спустошаным і амаль страціў прытомнасць. Расплюшчыўшы праз нейкі час вочы, я ўбачыў, што конь упаў на калені, а рамізнік яго б'е, не спыняючыся, але цяпер ужо не дзеля таго, каб прымусіць падняцца, а менавіта каб забіць. Конь паваліўся на бок, узбрыкнуў, слаба ўжо, і апусціў галаву ў гразь. Рамізнік, задыханы і з дзікім выразам твару, кінуў качаргу, тузануў каня, ды ўжо без сэнсу: ведаў, што забіў.

Я прайшоў міма, нават не зачапіўшы яго, і рушыў па дарозе. Праходзіў трамвай на Рым, і я на хаду заскочыў у яго. Азірнуўшыся, убачыў у апошні раз між майскага лісця, абмытага дажджом, шыльду: «Закусачная паляўнічых. Уладальнік Антоніо Токкі».

Пераклад з італьянскай мовы

Уладзіміра ЧАРОТЫ

ПАМЯЦЬ

Агністы шлейф чароўнага святла

РОЗДУМ НА ЖАЛОБНАЙ САРАКАВІНЕ

Божачка, так кожны раз... пры кожнай нагодзе... паўтараеш адно і тое ж як толькі што абуджаны ў цябе сподзіў: "Няўжо?!" Няўжо назаўжды адзвінеў гэты голас, пералівы якога рабілі праніклівa трапяткой малітву альбо гнеўную тыраду і надавалі вясёламу смеху спеўны рассыпісты пераазвон караляў з абарванага шнура, а потым і гулкіх бонаў? І гэтыя трагічныя, поўныя гора, ноты ў раптам агорнутым болем сэрцы, якому выпадае зняверыцца і ўраз страціць аблюбаванае ўяўленне аб шчасці... Так-так, то было і ў яе маладзенькай Ганначцы з паляшуцкіх Куранёў і ў чароўнай у сваім грэшным каханні Юліі Тугінай. Што б ні іграла на сцэне Лілія Давідовіч, яна паэтызавала жаноцкае хараство. Тая ж Чарнушка яе ў спектаклі "Людзі на балоце" ў нейкую хвілю — бы ўвасабленне Купалавых радкоў: "Убор дзявочы абарваны. Зблытаныя косы, Ў вочках толькі рдзяцца слёзы, Як улетку росы". Праўда, вочкамі Ліліны прамяніста-міндалёвыя, ці не напалову ейнага такога прыгожага твару вочы не назавеш...

Ах, многае цяпер, гаворачы пра актрысу Лілію Давідовіч, не назавеш так, як таго вымагае жывое мастацтва ўвасаблення сцэнічнага вобраза вось тутака і зараз, на вачах захопленых гледачоў. О, захапляць залу яна ўмела — сваёй заглыбленасцю ў пакуты і радасці тае гераіні, што сёння ўвечары ажывае на падмостках Купалаўскага тэатра, і ўся яна — ад галавы да пят — з Ліліных нерваў, з Ліліных інтанацый, з Ліліных слёз, з Ліліных парыванняў, з Лілінай красы, аддадзеных актрысай дарэшты ролі, што даручана ёй.

Як я шкадую, што дасюль не навучыўся тлумачыць людзям і не здолею перадаць на словах свае ўражанні ад таго акцёрскага мастацтва, якім віртуозна валодала наша Ліля! Калі табе хочацца карыцца ў сваёй нікчэмнасці перад высокім актам сапраўды маляўнічай тэатральнай творчасці. Бо перад табой пазямному жывы і па-чалавечы пераменлівы характар. У тэмпераментным акцёрскім раскрыцці ягоных таямніц, забабонаў, азарэнняў і слепаты, такой усемагутнай прагі шчасця і фатальнай ахвярнасці...

У каторы раз я пытаю ў самога сябе, чаму і што мяне захапляе, бярэ ў палон і прымушае суперажываць разам з гераіняй, якую выводзіць у святло рампы Лілія Давідовіч, — чаму і што менавіта? Я ж стары тэатрал і ведаю, здаецца, так-сяк тэхналогію акцёрства наогул. Ну, канешне, актрыса пэўным чынам загрыміравана, адпаведна апранута, а словы вымаўляе вызубраныя паводле тэксту п'есы, і мізансцэны разам з партнёрамі паўтарае тыя, што вызначаліся на рэпетыцыях рэжысурай... Дык жа няма гэтага, калі на сцэне Актрыса (з вялікай літары) — ні механічна завучаных слоў, ні аўтаматычна паўтораных інтанацый у голасе, ні прывычных поз і рухаў. Жывое жыццё перад намі!

Лілія Давідовіч заўжды кожнай клеткай свайго арганізма жыла на сцэне жарлівым каханнем альбо жарлівай нянавісцю, жарлівай малітвай ці жарлівай пакорай, ваяўнічым запалам і не менш гарачым жудасным сумам. Сваю душу і сэрца яна настройвала на той лад, што вызначаны пяром такіх відушчых празорцаў, як Фёдар Дастаеўскі і Максім Горкі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і Янка Купала, Уільям Шэкспір і Аляксандр Астроўскі, Генрык Ібсен і Леанід Лявонаў, Андрэй Макаёнак і Іван Чыгрынаў, Іван Мележ і Мустай Карым, Рычард Шэрыдар і Міхась Чарот... Я пералічваю імёны, якія самі па сабе сведчаць пра шчодрую разнастайнасць таго драматургічнага клімату, якім жыла актрыса Давідовіч на працягу сарака гадоў сваёй і сапраўды палымянай дзейнасці ў артыстычным сузор'і Купалаўскага тэатра. І калі вышэй я казаў, што Ліля жыла на сцэне, паглыбляючыся ў ролю, то цяпер удакладняю: яна гарэла творчым агнём — такі ў яе быў мастакоўскі тэмперамент.

Хто пасмеліцца сказаць, быццам я штось перабольшваю, той або мала бачыў актрысу Давідовіч на сцэне, або зусім не сустракаў яе ў спектаклях.

У штодзённых буднях Лілія Міхайлаўна была такім жа максімалістам, як і ў артыстычнай творчасці. Лагодная і вытанчана ветлівая яна магла імгненна паўстаць перад вамі непрымірымай спрачальніцай, гатовай звергнуць любы ваш аўтарытэт, якога вы абагаўляеце, калі ён чужы Ліліным перакананням і яе ўяўленню аб Харастве і Чэсці. Аднаго разу я надта горача адстойваў веліч аднае актрысы старэйшага пакалення, якую Ліля заспела на сцэне ўжо ў яе старэчым узросце і таму не бачыла ў росквіце лепшых дасягненняў, што й казаць, карыфея беларускага акцёрства. Мая субяседніца ледзь стрымліваючыся, прамовіла: "Толькі шануючы чужую думку... вашу, ягамосць, Барыс, шчырую прыхільнасць да нас, да купалаўскіх актрыс... не буду скідаць з п'едэстала вашага куміра..." Ды я здагадваўся, што тое гаворыцца ў палемічным запале, бо сама Ліля засвойвала азы акцёрскага рамяства пад пільным паглядам слыннага Канстанціна Саннікава, адэпта класічнага рэалізму ў сцэнічным мастацтве, як яго разумелі і кіраваліся ім першыя купалаўцы пад кіраўніцтвам Фларыяна Ждановіча і Еўсцігнея Міровіча.

Але, кажу шчыра, ёсць нешта няўлоўнае ў перадачы традыцый акцёрскага выканання роляў ад папярэднікаў новаму пакаленню. Калі не памыляюся, Ліля, як і яе равеснікі, наўрад ці паспела ўсвядоміць і асэнсаваць усё непаўторнае хараство беларускага акцёрства, якое ззяла на купалаўскіх падмостках над імёнамі Лідзіі Ржэцкай і Веры Пола, Ірыны Ждановіч і Раісы Кашэльнікавай, Кацярыны Міронавай і Вольгі Галіны. Ды ў самой школе гэтага акцёрства, у манеры паводзін гэтых актрыс у мастацтве, у іхняй духоўнай годнасці нішто не знікае бясследна. Бывае, ты ў калідоры глядацкага фае і нават на той лесвіцы, па якой мы ўзнімаемся ў гэты храм найсвяцейшага мастацтва, адчуваеш: тут царуе нейкая аура... якісьці мройны павеў блукаючых токаў... няясны подых прывіднай энергіі... Я зайздрошчу таму акцёрскаму сэрцу, у якім тоіцца нерв, здатны ўлавіць... разгадаць... прасякнуцца той аурай, тым павевам, тым подыхам. Бо гэта — і ўдзячнасць наступніка, і прысяга на вернасць запаветам першапраходцаў на ніве беларускага артыстычнага мастацтва. Такое чулае сэрца было ў Лілі Давідовіч.

Каюся: калі я сустракаю такое слугаванне Тэатру, мне пачынае здавацца, што наогул дзякуючы мастацтву, лепшыя ўзоры якога дорыць нам Купалаўскі тэатр, жыць на сучаснай зямлі ўжо ёсць памысная патоля!

Абстрагуючыся ад такой блізка знаёмай мне асобы — Лілічкі Давідовіч, я глядзеў на яе бывала як на жрыцу вялікага мастацтва. Прызнаваўся ёй у гэтым. Яна спагадліва смяялася. Я ўпэўнены, што ёй было прыемна адчуваць у сябе за спіной крылы сапраўднай славы. Помню, аднакроць мы ехалі багемным гуртам у цесным аўтобусе гасцяваць да Біруты Дакальскай на Паўднёвы Захад. І літаральна за спіной Лілінай я пачуў галасы:

— А ў "Дзядзечкавым сне" яна такая гвалтоўная і такая прывабная! Ты ж помніш, разам глядзелі...

— А яна і ў жыцці гэная, — падхапіла падобная на настаўніцу, — вачэй не адвесці. На сцэне самая прыгожая на ўвесь наш Мінск...

Жанчыны напаўголасу вось абменьваліся думкамі, ды я заўважыў, што Ліля чуе гаворку за сваёй спіной. Наструнілася ўся, віду не падае, але ўслухоўваецца. Я зрабіў выгляд, што нічога не заўважыў, толькі сам сабе падумаў пра, можа, самае дакладнае вызначэнне паняцця "слава артыста". Гэта — той адбітак... тое адлюстраванне ягонай своеасаблівай мастакоўскай асобы ў мнагалюддзі, што мае годнасць тэатральнага гледача. Неўпрыкмет для самога сябе гэты глядач падчас спектакля нешта ўвабраў у сваю душу, засвоіў пэўную думку... настрой... нават погляд, перакананне... І потым тое ўспрынятае ў тэатры трывала звязвае з постаццю і абліччам актрысы або акцёра ў вобразе. І такую славу спаўна зведала наша Ліля.

І вельмі цікава, вельмі міла было бавіць час у кампаніі, дзе яна вяла рэй, бо любым сваім спічам абуджала ў застольнікаў якісь успамін пра драматычнае здарэнне або пра дэбют каго-небудзь з прысутных, галаву якога крануў срэбны іней сівізны. Ах, якая гэта цудоўная музычная саната, перакладзеная на мову дасціпнікаў, — бясконцая акцёрская бяседа "пра сваё"! Неяк я гэтак выказаўся ў прысутнасці Лілі і яна мне з тужлівай інтанацыяй адказала: "Бора, нашая бязладная акцёрская гамана не пераліванне з пустога ў парожняе, не, то — адзіны, магчыма, сродак, якім закулісны свет імкнецца лячыць свой прафесійны смутак..." Які смутак? "А божачка, да чаго ж недаўгавечнае нашае мастацтва! — усклікнула Ліля, бо думала пра тое, відаць, усё жыццё. — Вы дзеўбяце дзе трэба і не трэба: "творчасць"... "пафас"... "вобразы"... А вось заслона закрылася, адыгралі мы тыя жа "Людзей на балоце" альбо... была такая камедыя "Матылёк... Матылёк..." І знікае нават след таго, што ты там рабіў усім сваім сэрцам, плоць ад плоці..."

Сапраўды, тэатральная сцэна — нешта накшталт п'едэсталу для нечага велічна яркага і такога мімалётнага, што знікае ў "нікуды" і "назаўжды". І пакуль па-сапраўднаму ідэальны акцёр іграе ролю на падмостках, ён усёй сваёй істотай марыць... Так, усёй істотай — душой і целам — марыць аб тым, хто паўстае ў гэтую хвіліну перад намі, гледачамі, у ягоным абліччы. І калі спектакль праз некаторы час паўтараецца, такая актрыса, як Давідовіч, уваскрашае ў сабе тую жыццядайную мару. Зноў і зноў, пакуль на афішы трымаецца назва спектакля. Увасобленая мара душы і цела, асуджаная на адзін вечар з'явіцца і неўзабаве знікнуць. Парадокс акцёра!

Хто, вы думаеце, першы гаварыў наконт гэтага Ліле? Іван Мележ. Пасля прэм'еры "Людзей на балоце". На ўсё жыццё запомніла ягоную пахвалу маладая дэбютантка: "Вы ўвасобілі, па праўдзе кажучы, маю мару пра Ганну Чарнушку", — ціха прамовіў Іван Паўлавіч і ласкава пагладзіў радасна збянтэжанае дзяўчо (актрыса была апранута паводле ролі) па галаве. Помню, што Ляля... прабачце, Алена Рынковіч, прыгадваючы тое, успомніла сваю жартаўлівую заўвагу маладой каляжанцы: "Як ты цяпер будзеш валасы мыць?! Змыеш цяпло Мележавай далоні..." У адказ Давідовіч прыпомніла, як пры знаёмстве легендарны Георгій Таўстаногаў пацалаваў Рынковіч руку, пасля чаго яе сын, пазней акцёр Валодзя Кін-Камінскі, сказаў: "Мамка, не мый цяпер руку правую. Яе ж сам Таўстаногаў пацалаваў!"

Сябруючы з гэтымі актрысамі, я і сапраўды

паверыў у дзівосную здольнасць людзей тэатра даражыць імгненнай праявай дабрыні і пашаны паміж німі. Уменне, я сказаў бы, прапісаць у сваім сэрцы мімалётны позірк або пяшчотны поціск далоні, — тое мімалётнае, што сведчыць хай сабе і аб хвілінным супольніцтве, аб такой жыватворнай для творчай асобы еднасці душ пры непазбежнай ростані на скрыжаванні жыццёвых пуцявін. Гэтае ўменне цаніць ледзь прыкметную душэўную агульнасць, што раптам узнікае і ўраз знікае, Давідовіч яскрава выяўляла і ў "На дне", і ў "Блакітнай ружы", і ў "Залатой карэце", і ў "Жанчыне з мора". Як на мой погляд, дык гэтым тэатр вучыць усіх нас даражыць тым, міма чаго мы, бывае, праходзім міма, не адзначыўшы ў сэрцы, мо самае дарагое для цябе, а зразумееш ты тое праз багата дзён і начэй пасля, бывае, і зусім запозна.

А як красамоўна адцяняла Давідовіч у паводзінах сваёй гераіні нараджэнне ў ёй тае ўцехі, ад якой можа зайсціся сэрца, калі яна набліжаецца да такой мяжы, што пакідае за сабою бязрадасны, цяжкі і пакутлівы кавалак жыцця, і пераходзіць у другі яго круг — якасны, прываблівы, жаданы. Мяне здзівіла Ліля, калі прызналася, што ёй пра многае стала ясна ў адзін трагічны момант для яе Ганны Чарнушкі пасля зусім дзіўнай рэжысёрскай падказкі Барыса Эрына на адной з рэпетыцый "Людзей на балоце": маўляў, вось тут, Лілія Міхайлаўна, вам трэ адчуць на шчацэ дотык анёлава крыла... цёплы павеў анёльскай ласкі. "Я гатовы была расплакацца, — прызналася Ліля, — ад гэтай чароўнай эрынскай падказкі!" У мяне не было падстаў не верыць ёй. Мы ведалі, што і ў шасцідзесятыя гады рэжысёр часцей падказваў акцёру: не забудзь, маўляў, у яго (героя) партбілет...

На сцэне і ў паўсядзённасці Лілія Міхайлаўна чула ўспрымала найтанчэйшыя імпульсы, адкрыта або падсвядома адрасаваныя ёй, яе гонару. Чалавек незаплямленай рэпутацыі, Давідовіч аберагала добрае імя актрысы Купалаўскага тэатра, бо лічыла за вялікі гонар служыць яму. Як горача запляскала яна аднойчы ў ладкі, пачуўшы ад паэта з почату яе паклоннікаў: "Сэрца ваша, Ліля, — гэта прытулак заўзятай прагі навізны"! І помню Лілін вокліч: "Заўзятай? — Брава!"

...І вось сэрца яе не адгукнецца больш на голас наш, на погляд нашых удзячных ёй вачэй, на прыхаваную недзе ў падкорцы нашай беспатольную думку... Ці ж забуду я калі ейны позірк з тым даверам, які апякае цябе сваёй шчырасцю! То набяжыць на гэты позірк цень невычэрпнай журбы, такой самотнай тугі, што і табе робіцца маркотна, бы штось непапраўна крыўднае зараз здарылася. А гэты бязлітасна-патрабавальны яе позірк, калі абурана яна нечым і, ледзь стрымліваючы сябе, выслухоўвае цябе, і ты адчуваеш, як усё ў ёй кіпіць. А што казаць пра ласкавую спагадлівасць з успышкамі гарэзлівых агеньчыкаў у яе зрэнках?! Бязмежнай літасцю і спачуваннем поўніўся яе позірк...

Сорак дзён як назаўсёды згас той агеньчык. Змоўк голас назаўсёды. больш ані на які покліч не адзавецца сэрца яе ні радасным, ні гаротным стукам. А нашы думы і развагі пра гэты непаўторнае красы талент бы тыя хмары мкнуць і мкнуць туды, дзе больш няма яе, — у будынак на былой Петрапаўлаўскай (Энгельса) вуліцы, дзе яе Дом — Тэатр імя Янкі Купалы, у яе кватэру на вуліцы Івана Мележа на рагу Усходняй... А мо і ў Вечнасць — хто яго ведае...

Так закрываецца перад актрысай тэатральная заслона — назаўжды і канчаткова. І апускаюцца нашы рукі, што прызвычаіліся апладзіраваць ёй... Галіна Макарава, Таццяна Аляксеева, Стэфанія Станюта, Алена Рынковіч, Лілія Давідовіч — адна за адной гаснуць зоркі, што напрыканцы мінулага веку такім дзівосным сузор'ем ззялі на жаночым небасхіле Купалаўскага тэатра. І не можа ўкласціся ў галаве, што тое назаўсёды збядняе наогул палітру беларускага акцёрства. Не верыцца, што адкрыцці і здабыткі Лілі Давідовіч згубяцца і забудуцца ў хвалях Часу, такога бязлітаснага ў сваім імкненні непазнавальна скажаць і мяняць імёны, і вонкавы выгляд, і характар, і звычаі, і лёс нашых улюбёнцаў.

Апошняя Ліліна роля ў тэатры — каралева Бона Сфорца ў драме "Чорная панна Нясвіжа" Аляксея Дударава. Каралеўскім крокам пакідала яна сцэну. Каралевай купалаўскай і застанецца яна ва ўдзячнай памяці беларускага тэатра.

Барыс БУР'ЯН

Фота У. КРУКА

ГАСЦЁЎНЯ

Стэп ад "Джэслава"

Адзіны на беларускай эстрадзе стэп-дуэт "Джэслаў" мае прыхільнікаў сярод усіх узроставых груп гледачоў — гэта і гадаванцы дзіцячых садоў, і школьнікі, і моладзь, і сталыя людзі. Танцавальныя нумары "Джэслава" захапляюць сваімі цікавымі сюжэтнымі лініямі, яркай эмацыянальнасцю і энергіяй.

Чаму назва гучыць гэтак загадкава? Усё проста: у яго складзе — салісты сталічнай філармоніі Джэнета Дзмітрэнка ды Вячаслаў Ушакоў, ад спалучэння імёнаў якіх і ўтварылася назва дуэта. "Джэславу" толькі шэсць гадоў, а ён паспеў пазнаёміць са сваёй творчасцю не толькі беларусаў, але і ўкраінскую і расійскую публіку. У яго рэпертуары больш за 20 танцавальных мініяцюр, пераважна пастаўленых самім Вячаславам Ушаковым, які, дарэчы, сёлета адзначае 35-годдзе сваёй творчай дзейнасці.

Танцоўшчыкі стэп-дуэта "Джэслаў" — нашы госці.

— Вячаслаў Клаўдзіевіч, як вы зрабіліся танцорам?

Вячаслаў Ушакоў. Мае бацькі перадалі мне любоў да своеасаблівых хатніх спектакляў: на святы тата браў гармонік, іграў і танцаваў, а маці пераапраналася ў цыганку. Яна любіла выконваць дробныя рухі ("драбіць") — можа, гэта і адыграла сваю ролю ў тым, што потым я палюбіў стэп. Займаўся ў танцавальным гуртку. Калі ўжо вучыўся на пятым курсе харэаграфічнага вучылішча ў Кішынёве, быў запрошаны ў Дзяржаўны ансамбль танца Малдовы "Жок", з якім праехаў Малдову, Урал, Сярэднюю Азію, Прыбалтыку, Балгарыю...

— Ансамбль "Жок" браў удзел у здымках фільма "Вяселле ў Малінаўцы"...

В. У. Так, вярнуўшыся з Балгарыі, мы трапілі на здымкі гэтага цудоўнага фільма, дзе танцавалі, а таксама здымаліся ў якасці вершнікаў. Было прыемна разам са знакамітымі акцёрамі: Зояй Фёдаравай, Мікалаем Слічэнкам, Міхаілам Вадзяным, Міхаілам Пугаўкіным святкаваць там жа 25-годдзе ансамбля "Жок". Потым я служыў у арміі — у Ансамблі песні і танца Адэскай ваеннай акругі. Працаваў у Адэскай філармоніі, а скончыўшы Маскоўскі інстытут культуры, працаваў у Калінінградскай філармоніі. Пакуль мяне не запрасілі ў Мінск працаваць выкладчыкам у харэаграфічным вучылішчы і ў інстытуце культуры.

— А як стварыўся дуэт "Джэслаў"?

В. У. Нягледзячы на тое, што я некалькі гадоў працаваў выкладчыкам, мяне цягнула на сцэну: у сне чуў апладысменты і бачыў удзячныя твары гледачоў. І любоў да сцэны перамагла. Я знайшоў сабе "выкарыстанне" ў адным з эстрадных калектываў Аб'яднання музычных ансамбляў. А калі стварыўся тэатр-вар'етэ "Серж", быў запрошаны туды салістам — танцаваць стэп. Неўзабаве я выхаваў вучаніцу, з якой цяпер і працую, — Джэнету.

— Джэнета, у вас такое цікавае імя...

Д. Д. Маці назвала мяне ў гонар гераіні рамана Шарлоты Брантэ "Джэйн Эйр". У сям'і мяне завуць проста Джэні. Маці мая родам з Польшчы. А тата нарадзіўся ў Беларусі ў сям'і палякаў. Такім чынам, я фактычна полька, а нарадзілася ў Літве. Калі тата паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут, дык на час вучобы прывёз і сям'ю ў Мінск. Але няма нічога больш пастаяннага за тое самае часовае. Тут мы і засталіся...

— А калі вы пачалі танцаваць?

Д. Д. З пялёнак я марыла пра танец, стаптала дома ўсе тапачкі, выкарыстоўваючы іх у якасці балетных. Тры гады танцавала ў ансамблі "Зорачка". Са слязьмі прасіла маці дазволу паступаць у харэаграфічнае вучылішча, але яна мяне не пусціла, бо я не вылучалася здароўем. Стаўшы інжынерам, я танцы не кінула. Любіла іграць на гітары і акардэоне, таму ўдзельнічала ў самадзейнасці: у ВІА і танцавальным ансамблі.

— Як вы пазнаёміліся з Вячаславам Клаўдзіевічам?

Д. Д. Мне трапілася аб'ява ў газеце — пра набор у групы па навучанні стэпу. Я аказалася сярод вучняў і праз некаторы час з радасцю прыняла прапанову стварыць стэп-дуэт.

— Хто шые касцюмы для вашага дуэта?

Д.Д. У мяне за плячыма шмат курсаў, у тым ліку два — па пашыве адзення. Гэта вельмі дапамагае ў працы, бо часта касцюмы даводзіцца спачатку прыдумваць, а потым і шыць самім. І гэта таксама творчасць. Дарэчы, спецыяльны абутак для стэп-танцаў вырабляе мой тата.

— Чым танцор стэпа адрозніваецца ад іншых?

В. У. Ён павінен мець усе якасці, якія ёсць у іншых танцоўшчыкаў, але да таго ж у яго мае быць вострае пачуццё рытму. Яму неабходна ўменне працаваць у якасці саліста, а гэта дадаткова ўключае акцёрскае майстэрства, выразнасць і дакладнасць у кожным руху, уменне выйсці з неспадзяванага становішча так, каб гэтага не заўважыў глядач.

— Што вас аб'ядноўвае як партнёраў па дуэце?

В. У. Наша, так скажам, аб'яднанне адбылося дзякуючы таму, што чаканні і пажаданні Джэнеты супадаюць з маімі. Аказалася, што мы марылі пра аднолькавыя танцы, праўда, я раней, а яна — пазней. Калі мае бацькі вадзілі мяне на канцэрты ў 4—5-гадовым узросце, я любіў глядзець выступленні флоцкіх, а таксама цыганскіх калектываў. Я літаральна заразіўся цыганскім тэмпераментам і матроскім пачуццём рытму. І наколькі я люблю цыганскія танцы, настолькі ж іх любіць і Джэні. Я гэту любоў нясу праз усё творчае жыццё. Дарэчы, быў такі выпадак: мы, студэнты-трэцякурснікі, выступалі ў Калоннай зале Дома саюзаў перад XXIV з'ездам КПСС — і нягледзячы на "ціхую забарону" цыганскай тэмы, наш танец прапусцілі нават на тэлебачанне. І вось цяпер, сёе-тое змяніўшы, мы яго танцуем з Джэні.

Д. Д. Мы з Вячаславам Клаўдзіевічам нават працавалі ў цыганскім калектыве "Гіля рамэн", які, на жаль, ужо распаўся. У цыганоў свая манера выканання, мы многа ўзялі адтуль.

— Артыст працуе, каб самавыявіцца ці для таго, каб даць радасць гледачам?

В. У. І для таго, і для другога. Я ў першую чаргу працую для людзей, мне гэта вельмі падабаецца. Хаця калі рэпеціруем, напрыклад, нас жа ніхто не бачыць — але гэта таксама важны працэс, гэта праверка сябе: на што ты здольны, чаго табе не хапае.

Д. Д. Я раней думала, што гледачы прыходзяць на канцэрты, падрыхтаваныя да ўспрымання таго, што будзе на сцэне. Аказалася, што публіка бывае настроеная па-рознаму, і калі яна ўсіх прымае абыякава, у артыста з'яўляецца незадаволенасць. Здаецца, ён усё робіць добра, а авацый няма. І наадварот, калі гледачы ўсё прымаюць цёпла, на душы ў артыста робіцца хораша.

— У чым вы бачыце звышзадачу артыста?

В. У. Я думаю, што гэта не ў апошнюю чаргу — выхоўванне маральнасці, ненадакучлівая выпрацоўка ў гледачоў этычных і эстэтычных нормаў. Амаль у кожным нашым танцы мы вучым павазе да жанчыны, паказваем прыгожае каханне... А вось у нумары "Жылі-былі", наадварот, высмейваецца зусім не ідэальная сям'я. У кожным выпадку мы "выпраменьваем" толькі станоўчыя флюіды.

Д. Д. Нават калі героі нашых танцаў не жанчына і мужчына, а двое мужчын, усё адно паміж імі існуе сапраўднае сяброўства, а калі і ўзнікае саперніцтва, то толькі жартоўнае.

— Ці ёсць у вас мара?

В. У. У нас ёсць творчая мара: як мага долей знаходзіцца на публіцы, не шкадуючы ні сіл, ні часу, каб падарыць гледачам паболей добрых эмоцый. Гэтым мы жывём, бо мы атрымліваем ад гледачоў удзячнасць у выглядзе апладысментаў, а яны атрымліваюць ад нас тое, што павінна дапамагаць ім зрабіцца больш высакароднымі. Мы адчуваем аддачу па сіле апладысментаў, па колькасці поціскаў рук і прыходаў па аўтографы. Чым гэтага больш, значыць, тым больш сваёй любові ўклалі мы ў працу.

Гутарыла Вольга НАВАЖЫЛАВА

Фота аўтара

Суфлёр

ПАДКАЗКІ—АНОНСЫ—ПАРАДЫ АД "ЛіМа"

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі
Аб'яўляе прыём на 2002 год

у магістратуру з адрывам і без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасцях:

Кампазіцыя

Інструментальнае выканальніцтва

Дырыжыраванне (харавое, аркестравае)

Спевы

У магістратуру Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю, акадэмічную ступень бакалаўра і пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, а таксама грамадзяне Беларусі і беларусы, якія пражываюць за яе межамі, грамадзяне Расійскай Федэрацыі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана.

Асобы, якія паступаюць у магістратуру падаюць заяву на імя рэктара акадэміі. Да заявы дадаюцца наступныя дакументы:

- асабісты лісток па ўліку кадраў, аўтабіяграфію і дзве фотакарткі 3х4;
- выпіску з пратакола пасяджэння савета факультэта для асоб, якія рэкамендаваны для паступлення ў магістратуру непасрэдна пасля заканчэння ВНУ;
- копію дыплома аб вышэйшай адукацыі;
- копію дыплома бакалаўра (для грамадзян Беларусі, якія атрымалі вышэйшую адукацыю пасля 1995 года);
- выпіску з працоўнай кніжкі;
- рэферат па выбранай спецыяльнасці з рэцэнзіяй;
- пашпарт, дыплом аб вышэйшай адукацыі, дыплом бакалаўра прад'яўляюцца асабіста.

Абітурыенты здаюць уступныя экзамены па спецыяльнасці, калёквіуму і замежнай мове ў аб'ёме дзеючай праграмы для ВНУ. Уступны экзамен па спецыяльнасці папярэднічае экзаменам па іншых дысцыплінах. Асобы, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе, а таксама грамадзяне іншых дзяржаў могуць быць залічаны ў магістратуру па кантракце на ўмовах поўнай кампенсацыі выдаткаў на навучанне.

Прыём дакументаў праводзіцца з 3 па 18 чэрвеня 2002 г.

Уступныя экзамены — з 20 па 28 чэрвеня.

Даведкі па адрасе: г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30. Каб. № 122, тэл.: 226-11-76.

Наступны нумар штотыднёвіка "ЛіМ" выйдзе 28 чэрвеня 2002 г.

Аддаю належнае дасціпнасці спадароў з "Нашай Нівы" і шчыра дзякую яшчэ за адну бясплатную "рэкляму".

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ



Вартавы

Фота Ляксандры ВАШЧАНКІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЛіМ ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЗАСНАВАЛЬНІК

Саюз беларускіх пісьменнікаў

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

У 1982 годзе ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

Галоўны рэдактар

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА,
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Алесь ГАЎРОН — *адказны сакратар,*
Уладзімір МАРУК — *намеснік галоўнага рэдактара,*
Яўген РАГІН,
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ,
Віктар ШНІП — *першы намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:

220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:

прыёмная рэдакцыі — 284-8461
намеснікі галоўнага рэдактара — 284-8525, 284-7985

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-8204
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-7985
літаратурнага жыцця — 284-8462
крытыкі і бібліяграфіі — 284-7985
паэзіі і прозы — 284-7985
музыкі — 284-8153
тэатра, кіно — 284-8153
выяўленчага мастацтва — 284-8462
фота-карэспандэнт — 284-8462
бухгалтэрыя — 284-8462
Тэл./факс — 284-7965

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"

(г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79)

Індэкс 63856 Наклад 2226
Нумар падпісаны ў друк 13.06.2002 г. у 17.30

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715

Заказ 1353

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12